Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

8 чэрвеня 1979 г.
№ 23 (2966)

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

Чайка.

Фота В. ЦІШКОЎСКАЙ.

ДЭСАНТ МАЙСТРОЎ МАСТАЦТВАЎ

Мелодыя «Святочнай уверцюры» Д. Шастаковіча прагучала 4 чэрвеня над сялом Вялікія Бортнікі — цэнтрам калгаса «Гігант» Бабруйскага раёна. Яна асабліва сугучная настрою земляробаў, якія паспяхова справіліся з веснавымі палявымі работамі, добра падрыхтаваліся да чарговых этапаў сельскагаспадарчых работ і цяпер шырока расчынілі дзверы дэкадзе «Майстры мастацтваў — працаўнікам вёскі», якая пачалася ў рэспубліцы.

— Сёлета гэта свята музыкі і тэатра прысвячаецца 35-годдзю вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — сказаў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра культуры БССР М. П. Шаўчук. — Дэвіз дэкады — «Лікуй, родная Беларусь!» Вядучыя мастацкія калектывы і салісты рэспублікі выехалі з канцэртамі да хлебаробаў, жывёлаводаў, меліяратараў. У дэкадзе прымаюць удзел майстры мастацтваў Масквы і Ленінграда, саюзных і аўтаномных рэспублік краіны — усяго звыш тысячы творчых работнікаў.

У праграму свята ўключаны творчыя сустрэчы з кампазітарамі, мастакамі, кінематаграфістамі, арганізацыя выставак і тэматычных кінапаказаў.

Як правіла, канцэрт майстроў мастацтваў — толькі частка масавых народных святкаванняў дэкады. У іх праграме — віншаванне ветэранаў партыі, вайны і працы, перадавікоў веснавой сяўбы, творчыя справаздачы сельскай мастацкай самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы, гульні, вясёлыя кірмашы.

МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У канцы мая ў Кіеве адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя пад эгідай ЮНЕСКА на тэму «Сучасныя славянскія культуры: развіццё, узаемадзеянне, міжнародны кантэкст», у якой удзельнічалі вучоныя васемнаццаці краін Еўропы і Амерыкі. Беларусь была на канферэнцыі прадстаўлена дакладамі дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР І. Навуменкі «Янка Купала ў кантэксце славянскай паэзіі», дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР С. Марцалева «Мастацкая культура Беларусі на сучасным этапе», паведамленнямі супрацоўнікаў АН БССР В. Караткевіч «Метадалагічныя асновы падрыхтоўкі «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», У. Сакалоўскага «Успрыняцце сучаснай беларускай літаратуры ў ГДР і ФРГ», выкладчыцы Гродзенскага універсітэта С. Спас «Да праблемы ўзаемадзеяння і ўзаемапранікнення літаратурна-мастацкіх і музычных форм». У дыскусіі за «круглым сталом» на тэму «Роля традыцый і развіццё сучаснай мастацкай культуры» ад Беларусі выступілі С. Марцалеў і А. Мальдзіс. Апрача таго, у матэрыялах канферэнцыі надрукаваны тэзісы даклада А. Адамовіча «Гуманістычны пафас сучаснай беларускай літаратуры».

Да беларускага матэрыялу (паэзія Я. Купалы, проза І. Мележа, В. Быкава, Я. Брыля, жывапіс М. Савіцкага, народная песня) звярталіся таксама многія рускія, украінскія і зарубежныя даследчыкі (Д. Маркаў, Г. Недашывін, Л. Навічэнка, Г. Вервес, С. Шэрлаімава, А. Стойкаў, А. Праўдзюк і інш.).

У час работы канферэнцыі адбылося пасяджэнне бюро Міжнароднай асацыяцыі па вывучэнні і пашырэнні славянскіх культур (МАІРСК), на якім намечана багатая праграма наступных мерапрыемстваў.

А. ГУДАС.

ПЛЕНУМ КНІГАЛЮБАЎ

Днямі адбыўся II пленум праўлення Мінскага гарадскога аддзялення таварыства аматараў кнігі. Яго адкрыў старшыня праўлення Мінскага гарадскога аддзялення таварыства аматараў кнігі пісьменнік Алесь Асіпенка. Пленум разгледзеў пытанне «Задачы кнігалюбаў на паляпшэнні прапаганды грамадска-палітычнай літаратуры і далейшым удасканаленні работы пярвічных арганізацый у святле пастановы VI пленума Рэспубліканскага праўлення добраахвотнага таварыства аматараў кнігі». З дакладам выступіў адказны сакратар аддзялення І. Шчарбіна.

А. ПЯТРОВІЧ.

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА ТЮГа

Дзяцінства — час вялікіх магчымасцей чалавека. Ад таго, як ён пройдзе, гэты перыяд жыцця, залежыць многае і ў далейшым развіцці. І тут павінна сказаць сваё важкае слова мастацтва, якое валодае магутным дарам уздзейнічаць на свядомасць гледачоў, умешвацца ў працэс духоўнага развіцця чалавека, карацей кажучы, яно нясе ў сабе патэнцыяльную сілу педагогікі. Асабліва гэта тычыцца дзейнасці тэатраў юных гледачоў, якія адну з галоўных сваіх задач бачаць у раскрыцці духоўных каштоўнасцей чалавека і грамадства і дапамозе сваім юным гледачам спасцігнуць гэтыя каштоўнасці і такім чынам уплываць на фарміраванне іх свядомасці.

Пра гэта гаварылася на вечары—творчай справаздачы артыстаў ТЮГа, які адбыўся ў Доме работнікаў мастацтваў.

Вечар адкрыла і вяла заслужаная артыстка рэспублікі Р. Маленчанка. Яна расказала пра сваіх калег па тэатры, пра творчыя дасягненні калектыву, ахарактарызавала некаторыя спектаклі тэатра, засяродзіла ўвагу на іх выхаваўчым значэнні для падлеткаў. Артыст тэатра М. Пятроў пазнаёміў прысутных з апошнімі работамі калектыву.

На вечары ў выкананні артыстаў ТЮГа былі паказаны ўрыўкі са спектакляў «Эдзіт Піаф», «Экзамен на восень», «Барабаншчыца», «Царэўна-жаба».

Як паведамлялася, у Гомелі пачаў гастрольныя выступленні вядомы на ўсю краіну Харкаўскі дзяржаўны акадэмічны ўкраінскі драматычны тэатр імя Т. Шаўчэнкі. Гамяльчане цёпла сустракаюць гасцей, у рэпертуары якіх, зразумела, ганаровае месца займае нацыянальная класіка. Зноў і зноў выходзіць у святло рампы славуты і папулярны «Шальменка-дзяншчык» Р. Квіткі-Аснаўяненкі, на гэты раз у рэжысуры народнага артыста СССР В. Васілька з удзелам народнага артыста СССР Л. Тарабарынава і народнай артысткі УССР Р. Коласавай.

На здымку: у ролях Кірылы Пятровіча Шпака і Фены Сцяпанаўны заслужаны артыст УССР В. Шастапалаў і народная артыстка УССР Р. Коласава.

НАБЛІЖЭННЕ ДА ЧАЛАВЕКА

Кажуць, што «круглыя сталы» сталі такой жа модай, як і вясельныя картэжы з лялькамі на капотах «Волгаў». Аднак жа гэта не так. Нам не хапае сацыялагічных даследаванняў, каб з поўнай мерай дакладнасці можна было б меркаваць пра нейкія з'явы, што пачалі раптам турбаваць. «Круглыя сталы», у якіх найчасцей прымаюць удзел людзі рознага жыццёвага вопыту, палярных поглядаў на адну і тую ж з'яву, часам і розных прафесій, у нейкай ступені — а часта і вельмі дакладна — даюць адказ на пастаўленыя пытанні.

«Круглы стол» на тэму «Праблемы савецкай вёскі і іх адлюстраванне ў мастацтве», праведзены на мінулым тыдні часопісам «Театр» у калгасе імя Урыцкага, што на Гомельшчыне, якраз і меў на мэце выявіць пэўныя тэндэнцыі ў развіцці сённяшняй калгаснай вёскі, супаставіць іх з накірункамі і тэндэнцыямі ў мастацкай творчасці.

Абмеркаванне праблемы пачалося са знаёмства ўдзельнікаў дыскусіі з калгаснай вытворчасцю, з людзьмі, якія стварылі славу калгасу імя Урыцкага. Старшыня калгаса Аркадзь Аляксеевіч Паташкін, расказваючы пра поспехі калгаса і пра людзей, што самааддана працуюць на палях і фермах, увесь час праводзіў думку аб неабходнасці для творчых работнікаў глыбока ведаць жыццё, набліжацца да чалавека сяла.

Знаёмства з калгаснай вытворчасцю і людзьмі калгаса было надзвычай карысна, бо, як сказаў пазней, у заключэнне дыскусіі, сакратар Гомельскага абкома партыі Сяргей Паўлавіч Бабыр, некаторыя творчыя работнікі даволі павярхоўна інфармаваны аб стане спраў у сельскай гаспадарцы, карыстаюцца найбольш даўнімі, устарэлымі ўяўленнямі аб ёй.

Для ўдзелу ў дыскусіі часопіс «Театр» запрасіў вялікую групу дзеячаў мастацтва, пісьменнікаў, тэатральных крытыкаў і кінакрытыкаў, журналістаў. У рабоце «круглага стала» прынялі ўдзел калгаснікі, сельская інтэлігенцыя, партыйныя і савецкія работнікі.

Разважаючы над праблемамі сённяшняй калгаснай вёскі і іх адлюстраваннем у мастацтве, удзельнікі дыскусіі найперш за ўсё адзначалі, што аблічча вёскі карэнным чынам змянілася, а мастацтва не заўсёды чуйна заўважае гэтыя перамены.

Спачатку—знаёмства з калгасам...

...а пасля—абмен думкамі.

Фота Ул. КРУКА.

Народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, які вёў «круглы стол», гаварыў аб адставанні літаратуры ад жыцця, аб тым, што тэатры рэспублікі мала ставяць п'ес аб працаўніках сяла. Ён прааналізаваў прычыны такой несуцяшальнай з'явы і паставіў шэраг задач, якія належыць рашаць пісьменніцкай арганізацыі.

З глыбокім аналізам дзейнасці тэатраў на сяле, аб рэпертуарнай палітыцы ў дачыненні да сельскага гледача выступіў намеснік міністра культуры рэспублікі М. П. Шаўчук.

Удзельнікі дыскусіі — Ефрасіння Бондарава, Ігнат Дуброўскі, Ніл Гілевіч, Анатоль Сабалеўскі, Вячаслаў Кручкоў і іншыя — гаварылі пра поспехі беларускай драматургіі і яе месца ў драматургіі саюзнай, пра тое, што апошнім часам праблема сяла знікла з драматургіі, і, па сутнасці, на сцэнах тэатраў ідуць адна-дзве п'есы пра сучаснае сяло.

На «круглым стале» было закранута вялікае кола пытанняў, што сведчыць аб надзённасці праблемы сяла і яе адлюстраванні ў мастацтве.

ВЫСТАЎКА ФАТАГРАФІІ

У выставачнай зале Гомельскага абласнога краязнаўчага музея адкрылася пятая традыцыйная міжабласная выстаўка дакументальнай і мастацкай фатаграфіі. На ёй прадстаўлены 94 работы фотажурналістаў і фотааматараў Бранскай, Чарнігаўскай і Гомельскай абласцей.

Прамысловасць, сельская гаспадарка, будаўніцтва, культура прырода, партрэты перадавікоў культуры і мастацтва — такая тэматыка экспазіцыі.

Выстаўка прысвечана 35-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 325-годдзю ўз'яднання Украіны з Расіяй. Яна была арганізавана абласнымі журналісцкімі арганізацыямі трох спаборнічаючых абласцей.

Выстаўка будзе экспанавацца ў Бранску і Чарнігаве.

Л. ЗОЛЬМАН.

ПРА СЯБРОЎ-ТАВАРЫШАЎ

Выстаўка работ члена Саюза мастакоў СССР Сяргея Бакаева адкрылася ў Слуцкім краязнаўчым музеі. На ёй прадстаўлена 60 карцін жывапісу і графікі.

Зараз Сяргей Іванавіч Бакаеў жыве ў Ялце. Але былы партызан брыгады імя Суворава не забыў сваіх баявых сяброў. Таму побач з непаўторнымі па сваёй прыгажосці пейзажамі поўдня на выстаўцы значнае месца займаюць партрэты людзей, з якімі давялося разам ваяваць і памяць аб якіх ніколі не сціраецца.

Выстаўка прысвечана 35-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

А. РАМАНОВІЧ.

КАРАЛЕВА САПАТЭАДА

Канцэрты славутай мексіканскай танцоўшчыцы Пілар Рыохі заўсёды выклікаюць цікавасць у мінскіх гледачоў. Прырода надзяліла маладую артыстку акцёрскай выразнасцю, цудоўнай рытмічнасцю, талентам пераўвасаблення. Яе мастацтва універсальнае — своеасаблівая жывая анталогія танца, пачынаючы ад традыцыйных XVI стагоддзя і да народных танцаў нашых дзён.

У праграме Пілар Рыохі танцы на музыку італьянскіх кампазітараў XVIII стагоддзя, харэаграфія іх у стылі балеро зроблена самой танцоўшчыцай. Рэпертуар умоўна падзяляецца на 4 часткі. Першая — рэлігійна-традыцыйная, другая аб'ядноўвае андалузскія і цыганскія танцы ў стылі фламенка (рытуальныя і сімвалічна-драматычныя, у аснове якіх — свяшчэнныя і свецкія танцы Старажытнага Усходу). Трэцяя частка — гэта класічныя танцы, якія выконваюцца абавязкова з кастаньетамі, у стылі балеро. І, нарэшце, — сучасныя іспанскія танцы на музыку іспанскіх кампазітараў эпохі Барока.

Пілар Рыоха — папулярная выканаўца танцаў у стылі фламенка. Яна знаёміць нас са старадаўнімі цыганскімі паданнямі, з цыганскім фальклорам, багатым пластом культурнай скарбніцы Андалузіі — напевамі стылю «кантэ хандо». Уражанне ад яе танцаў падкрэслівае своеасаблівы лад гітары, распаўсюджаны ў народзе спосаб ігры акордамі — «расгеада» (так званыя «варварскія акорды»). Талент танцоўшчыцы прынёс ёй поспех не толькі ў Мексіцы, але ва ўсім свеце; ёй апладзіравалі ў ЗША, Аргенціне, Англіі, у Еўропе і асабліва ў Іспаніі. Прадстаўнікі прэсы, спецыялісты і проста аматары танца і музыкі выказвалі сваё захапленне майстэрствам Рыохі.

Разнастайнымі фарбамі перадае артыстка змену кантрастных эмоцый у душы гераіні. Кожны танец — узор вытанчанага густу, адчування формы, стараннасці апрацоўкі, здольнасці сціплымі сродкамі дамагчыся максімуму выразнасці. Дастаткова згадаць, з якім уменнем прымушае яна ззяць усё новымі гранямі каштоўнага дыяменту славуты танец «Сапатэада» і тэмпераментную «Хоту». Маляўнічыя касцюмы (асобны для кожнага танца) падкрэсліваюць змест танца, ствараюць асаблівы настрой гледача. Пілар Рыоха выступае пад акампанемент гітарыста з Мексікі Уга Элісонда і папулярнага спевака з Іспаніі Луіса Альгаба. Гітарнае суправаджэнне тут не толькі традыцыйнае. Роля яго выходзіць далёка за рамкі акампанементу — яно раўнапраўнае з сольнай партыяй танцоўшчыцы.

Выступленне Пілар Рыохі — гэта цэласны, сапраўдны спектакль, які ператварае канцэртны вечар у цудоўнае свята-карнавал.

Мікола КОШАЛЕЎ.

ПАЭЗІЯ—ЧАСУ НЕПАДУЛАДНАЯ

Правільна кажуць: песня — душа народа. У дачыненні ж да Адама Русака вызначэнне гэта набывае асаблівы сэнс. Сын беднага селяніна з вёскі Пясочнае, што на Капыльшчыне, ён усю душу сваю аддаў песні. Больш як 200 вершаў паэта пакладзена на музыку. Многія песні А. Русака народ палічыў «сваімі» яшчэ перад вайной (асабліва «Бывайце здаровы!»), аўтарства «Лясной песні» па-ранейшаму аспрэчваюць многія былыя партызаны сёння, бо здаецца ім, што спявалі яны яе яшчэ ля кастроў...

Гучалі песні А. Русака і ў гэты вечар, што сабраў прыхільнікаў таленту паэта ў актавай зале Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Студэнты, пісьменнікі, рабочыя прыйшлі, каб павіншаваць Адама Герасімавіча з 75-годдзем, пажадаць яму новых творчых поспехаў, новых песень.

І доктар філалагічных навук А. Семяновіч, які адкрыў вечар, і У. Юрэвіч, што расказаў пра жыццёвы і творчы шлях юбіляра, і М. Гамолка, які зачытаў віншавальны адрас праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі, і прарэктар інстытута Л. Падгайскі, што павіншаваў Адама Герасімавіча ад імя студэнтаў і выкладчыкаў — сыходзіліся ў адным: паэзія А. Русака па-сапраўднаму хвалюе сэрцы ўсіх, хто шануе і любіць роднае беларускае слова, захапляецца народнымі песнямі. Землякі пісьменніка прывезлі юбіляру з ураджайнай Капыльшчыны хлеб-соль, а разам з ім — радасць усмешак, цеплыню сэрца, шчодрасць душы. Згадкамі пра сяброўства з паэтам падзяліліся С. Грахоўскі, І. Грамовіч, народны артыст СССР Г. Цітовіч.

Вершы юбіляра чыталі артысты, песні выконваў Дзяржаўны народны хор БССР.

На здымку: юбіляра віншуе народны артыст СССР Г. Цітовіч. Фота Л. КАМОЦКАЙ.

Літаратурная студыя

У кастрычніку мінулага года адбыліся першыя заняткі ў літаратурнай студыі пры часопісе «Неман». Намеснік галоўнага рэдактара часопіса Э. Ялугін, пачынаючы іх, падкрэсліў, што задача аб'яднання ў тым, каб наладзіць больш цесныя кантакты рэдакцыі з маладымі празаікамі.

Студыя прынесла немалую карысць як часопісу, дазволіўшы яму выявіць найбольш перспектыўных літаратараў, так і студыйцам, якія могуць больш дакладна скаардынаваць сваю творчасць з накірункам часопіса.

У пачатку мая адбыліся чарговыя, ужо сёмыя заняткі студыі. За мінулае паўгоддзе студыйцы добра пазнаёміліся з творчасцю адзін аднаго. Абмеркаваны аповесць медсястры Марыі Філіповіч, апавяданні інжынера трактарнага завода Анатоля Вашуркіна, журналіста Раланда Букенгольца, работніка бюро падарожжаў і экскурсій Анатоля Жалязоўскага.

Цікавым было абмеркаванне аповесці «Насенне» Уладзіміра Глушакова, апублікаванай у першых двух нумарах «Нёмана» за гэты год.

Паўгода — не вялікі тэрмін для літаратурнай студыі, але ўжо цяпер можна гаварыць аб тым, што рэгулярныя сувязі маладых празаікаў між сабой стымулююць развіццё іх творчасці, дапамагаюць у пошуках найбольш прыдатных мастацкіх прыёмаў для перадачы асаблівасцей і каларыту жыцця рэспублікі, у вызначэнні тэм і найбольш актуальных праблем, якія належыць узняць у творах.

Варта падкрэсліць, што студыйцы не замыкаюцца ў «чыста» мастацкай прозе. Яны захвочваюцца выступаць у жанрах нарыса, публіцыстыкі, літаратурнай крытыкі.

Мікалай КАНЯЕЎ,
член бюро літаратурнай студыі пры часопісе «Неман».

ПРЫЗНАННЕ МАСКВІЧОЎ

Творчай справаздачай перад маскоўскімі аматарамі оперы стаў сольны вечар артысткі Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР С. Данілюк, які адбыўся ў цэнтральным Доме работнікаў мастацтваў.

Масквічы далі высокую ацэнку выканаўчаму майстэрству мінчанкі, якое яна прадэманстравала і ў арыях з опер айчыннай і замежнай класікі, і ў рамансах, і ў песнях савецкіх кампазітараў.

А. КАСЯНКОЎ.

У КЛУБЕ ШКЛОЗАВОДА

У памяшканні клуба шклозавода г. Варысава адбыўся творчы вечар пісьменніка Мікалая Чаргінца. Агляд яго творчасці зрабіла крытык Галіна Егарэнкава. На вечары выступілі сакратар камітэта камсамола завода Тамара Кандзідава, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Беларусь» Георгій Тарасевіч, сакратар партбюро завода Аляксандр Дзярабін. Народная артыстка БССР Марыя Захарэвіч прачытала ўрыўкі з аповесцей пісьменніка. На вечары выступіў Мікалай Чаргінец.

Вёў вечар сакратар праўлення СП БССР лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Іван Чыгрынаў.

ЗА ТРЫЦЦАЦЬ ПЯЦЬ ГАДОЎ — 1000

Трыццаць пяць гадоў назад, знаходзячыся ў далёкім Томску, тагачасны БДТ-1 (Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы) паказаў прэм'еру «Паўлінкі» ў рэжысуры заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Л. Літвінава са сцэнаграфіяй мастака Б. Малкіна. З таго часу спектакль з бессмяротным словам Купалавым, па-народнаму мудры і дасціпны, багаты на унікальныя камедыйныя характары, — на афішы калектыву. Бліскучыя акцёрскія работы народных артыстаў СССР У. Дзядзюшкі, Б. Платонава, Л. Ржэцкай, Г. Глебава, З. Стомы, народных артыстаў БССР Р. Кашэльнікавай, Г. Макаравай, В. Пола, Г. Аўсянікава, І. Шацілы і іх калег з наступных пакаленняў упісаны ў летапіс найяскравейшых дасягненняў рэалістычнай школы і адметнага майстэрства. Масква і Ленінград, Кіеў і Львоў, Адэса і Калінінград, Харкаў і Гродна апладзіравалі выдатнаму ансамблю выканаўцаў «Паўлінкі». Грамадскасць на пачатку будучага сезона адзначыць тысячны паказ гэтага сапраўды класічнага твора нашай драматургіі і сцэнічнага мастацтва.

Л. ГУРА.

«ТЭАТРАЛЬНЫ МІНСК» № 4

Як і папярэдні выпуск, чацвёрты нумар цалкам прысвечаны аднаму творчаму калектыву — на гэты раз Акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы. З гістарычных аглядаў, даследаванняў цяперашніх дасягненняў трупы і фотадакументаў складаецца даволі глыбокі і падрабязны нарыс аб складаным і плённым шляху купалаўцаў да ідэйна-мастацкіх вяршынь. Беларускі рэпертуар, тэма ваенна-патрыятычнага подзвігу савецкіх людзей, драматургія братніх народаў, руская класіка, зарубежная п'еса — вось тэматыка аглядных артыкулаў. Даецца матэрыял пра выступленні купалаўцаў на кінаэкране. У раздзеле «Аб акцёрах і іх героях» перадрукоўваюцца партрэтныя эскізы з розных газет і часопісаў краіны, якія пісалі пра Л. Рахленку, З. Стому, З. Браварскую, Л. Давідовіч, М. Яроменку, М. Захарэвіч, Р. Кашэльнікаву, Г. Макараву, Г. Аўсянікава, С. Станюту, В. Тарасава. У канцы нумара «Тэатральны Мінск» прыводзіць рэпертуар усіх драматычных тэатраў рэспублікі ў сезоне 1978-79 г. Спецыяльная старонка прысвечана 60-годдзю савецкага цырка.

СВЯТА ПЕРШАЙ СУСТРЭЧЫ

Мінчане і госці беларускай сталіцы, якія прыйшлі 1 чэрвеня на першую сустрэчу з Маскоўскім тэатрам на Таганцы, яшчэ да пачатку спектакля адчулі сябе як бы саўдзельнікамі тых гістарычных дзён, якія скаланулі свет. На плошчы перад Домам афіцэраў грымелі маршы, артысты выконвалі частушкі, што спявала моладзь у 1917-ым. Замест прывычных білецёраў гледачоў сустракалі рэвалюцыйныя салдаты і матросы. На сцэнах і калонах фае — плакаты «Вокнаў РОСТА». Чырвоныя палотнішчы заклікалі: «Няхай жыве рэвалюцыя рабочых, салдат і сялян!», «Уся ўлада Саветам», «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Кудысьці спяшаліся дзяўчаты ў скураных куртках і чырвоных касынках. І кожнаму перадаваўся нейкі асаблівы настрой...

Спектаклем па кнізе Джона Рыда «Дзесяць дзён, якія скаланулі свет» у Мінску адкрыліся гастролі сталічнага тэатра.

Спектакль пачынаўся на вуліцы...

...працягваўся ў фае тэатра...

...і на сцэне.

Усесаюзны семінар

Нядаўна ў Маскве, у канферэнц-зале ВДНГ СССР, адбыўся Усесаюзны семінар на тэму: «Пытанні ўдасканалення навучання і выхавання творчай моладзі ў музычных вучылішчах БССР». Перад выкладчыкамі навучальных устаноў Масквы і Маскоўскай вобласці, работнікамі шэрагу міністэрстваў, ведамстваў саюзных і аўтаномных рэспублік выступілі выкладчыкі і дырэктары музычных вучылішчаў БССР, якія абмяняліся вопытам работы па паляпшэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-музыкантаў.

Адкрываючы семінар, начальнік Упраўлення навучальных і навуковых устаноў і кадраў Міністэрства культуры БССР В. Скараходаў расказаў аб развіцці сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў Беларусі за 60 гадоў і ролі навучальных устаноў у станаўленні музычнай культуры, у эстэтычным выхаванні шырокіх народных мас.

У дакладах узнімаліся актуальныя пытанні ўдасканалення арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу: «Формы і метады планавання вучэбна-выхаваўчай работы ў музычных вучылішчах БССР» (дакладчык — дырэктар Мінскага музычнага вучылішча імя М. І. Глінкі В. Рылатка); «Аналіз нядзельнага бюджэту часу навучэнцаў і яго роля ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу» (дакладчык — дырэктар Брэсцкага музвучылішча А. Мартыненка); «Практычнае навучанне ў музычных вучылішчах, як сродак падрыхтоўкі навучэнцаў да самастойнай творчай работы» (дакладчык — выкладчык Мінскага музвучылішча імя М. І Глінкі Л. Школьнікаў).

Удзельнікі семінара азнаёміліся з арганізаванай у павільёне «Народная адукацыя» ВДНГ тэматычнай выстаўкай «Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі — 60-годдзю ўтварэння рэспублікі».

У заключэнне семінара ў Доме культуры ВДНГ СССР з вялікім поспехам прайшоў канцэрт выкладчыкаў і навучэнцаў.

В. УКОЛАЎ.

НА ЗЯМЛІ, ШТО СПЯВАЕ САМА

На здымку: пісьменнікі гутараць з сястрой паэта Верай Адамаўнай. Фота Ул. КРУКА.

Нізок... Для кожнага, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, яго сённяшнім днём, культурай — гэта тыя глыбінныя вытокі, адкуль бруяцца народныя таленты. Тут нарадзіўся патрыярх беларускай савецкай літаратуры, народны пісьменнік рэспублікі К. Крапіва, адсюль пачалася жыццёвая сцяжына вядомай беларускай пісьменніцы Л. Арабей, тут рабілі свае першыя крокі акадэмік АН БССР А. Махнач і народны артыст Беларусі А. Трус...

На гэтай жа зямлі ўпершыню прагучалі і радкі многіх вершаў, якім лёсам наканавана вечнае жыццё.

Здаецца, пройдзе хвіліна-другая і непрыкметна сярод людзей з'явіцца ён сам — хлопец у вышыванай беларускай кашулі, з доўгімі, густымі валасамі, з цёплымі, праніклівымі вачамі. Інакшым Паўлюка Труса і ўявіць сабе немагчыма.

А час бяжыць няўмольна. Споўнілася ўжо 75 гадоў з той вясны, як з'явіўся ён на свет. Пра П. Труса ўспамінаюць яго сястра Вера Адамаўна, колішні сакратар камсамольскай арганізацыі, членам якой быў і паэт, яго сябра Вікцтар Канстанцінавіч Махнач. Выступаюць таксама сакратар Уздзенскага райкома партыі З. К. Ломаць, беларускія пісьменнікі, артысты, якія прыехалі сюды, у Нізок, каб пакланіцца зямлі, што нарадзіла П. Труса. Вучні, настаўнікі мясцовай васьмігодкі, калгаснікі з хваляваннем ловяць кожнае слова...

Надвячоркам жа прыхільнікі яркага таленту паэта сабраліся ў памяшканні ўздзенскага кінатэатра. Урачыстасці, прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння П. Труса, адкрывае сакратар райкома партыі З. К. Ломаць. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі А. Вярцінскі, які вядзе вечар, адзін за адным запрашае да мікрафона літаратараў. Пра творчасць П. Труса, песняра вясновага рання, Кастрычніка падрабязна расказвае доктар філалагічных навук, даследчык літаратуры С. Александровіч.

Паэзія П. Труса — найцікавейшая з'ява ў гісторыі беларускай літаратуры. Глыбокі лірык па прыродзе свайго таленту, ён за нядоўгае сваё жыццё паспеў зрабіць вельмі шмат, і лепшыя творы яго назаўсёды ўвайшлі ў скарбонку нацыянальнай культуры. М. Арочка і Л. Арабей, Н. Гілевіч і А. Вольскі, А. Махнач і А. Гардзіцкі з сапраўднай улюбёнасцю гавораць аб тым, што паэзія П. Труса не падуладна часу, а сам паэт — адна з самых прыгожых і абаяльных постацей у гісторыі ўсёй беларускай савецкай паэзіі.

І зноў успаміны... Яны, як усплёск душы, што ніколі не ведае спачыну, як туга сэрца, якое пастаянна рвецца да незабыўных гадоў юнацтва. Тое, што назаўсёды запала ў памяць, згадваюць сястра П. Труса Вера Адамаўна, адзін з яго сяброў В. Мазурчык, заслужаны дзеяч культур БССР, самадзейны кампазітар П. Шыдлоўскі.

У гэты ж дзень у Мінску на магілу П. Труса на вайсковых могілках пісьменнікі ўсклалі кветкі.

Выгнанне пачвар

ПАГРОЗУ СУТЫКНЕННЯ з фашызмам мы адчувалі яшчэ задоўга да Вялікай Айчыннай вайны. З кожным годам яна ўсё бліжэй падступала да нашых граніц. І мы рыхтаваліся да бою. Аднак ніхто дакладна не ведаў, калі, пры якіх акалічнасцях пачнецца гэты бой за нашу сацыялістычную Радзіму, за свабоду і незалежнасць нашага народа. Фашысцкая Германія напала раптоўна, нечакана. Гэта быў бандыцкі напад з-за вугла.

Найбольш цяжкія выпрабаванні ў гэтай вайне выпалі на долю беларускага народа, бо шлях на Маскву ляжаў праз нашу рэспубліку. Гарэлі гарады і сёлы, на дарогах ляжалі забітыя і параненыя, знішчалася ўсё жывое. Як дзікія пачвары, уварваліся фашысты на нашу зямлю. Народ адказаў ворагу ўсенароднай партызанскай барацьбой.

Партызаны і падпольшчыкі ведалі, што ідуць на смерць і пакуты, што не ўсе яны астануцца жывымі. Яны ведалі, як добра адладжана фашысцкая ваенная машына, які вялікі вопыт маюць фашысцкія карныя органы ў падаўленні супраціўлення. Тут СД і гестапа, абвер і палявая жандармерыя, войскі аховы парадку і добра замаскіраваная агентура. Ведалі, але ўзніміліся на барацьбу.

Усім вядома, колькі ахвяр панесла Мінскае падполле, але яно ўзнікала, адраджалася зноў і зноў, і барацьба не спынялася ні на адзін дзень аж да поўнага выгнання фашысцкіх пачвар. Аб гэтым пераканаўча напісана ў дакументальных кнігах Івана Новікава, у кнізе нарысаў, апавяданняў, успамінаў непасрэднага ўдзельніка Мінскага падполля Уладзіміра Карпава «Прызнанне ў нянавісці і любові». Думаецца, што гэта не апошнія кнігі аб гераічнай барацьбе нашых мінчан. Менш пашанцавала другім нашым гарадам. Мала напісана пра падполле Гомеля, Віцебска, Магілёва, Брэста, Гродна, Полацка, Барысава, Пінска. Не было такога горада ці буйнога населенага пункта Беларусі, дзе б не дзейнічалі падпольныя арганізацыі і групы патрыётаў. Сумесна са шматлікай арміяй партызан яны наносілі значныя страты ворагу і крок за крокам набліжалі дзень Перамогі. Успомнім толькі асобныя, найбольш буйныя аперацыі партызан: узрывы паравозаў у Оршы, аперацыя «Рэха на Палессі» — падрыў чыгуначнага моста цераз Пціч, рэйкавая вайна, забойства гаўляйтэра Кубэ ў самім Мінску нашымі гераічнымі жанчынамі Марыяй Осіпавай і Аленай Мазанік, цяжкія баі партызанскай арміі супраць фашысцкіх рэгулярных войск у Бягомльска-Барысаўскай і Лепельска-Полацкай зонах, вядомая дыверсія камсамольца Хведара Крыловіча на Асіповіцкім чыгуначным вузле ў самы разгар Курскай бітвы. Іх было шмат ва ўсіх кутках рэспублікі. Усё гэта было вялікай дапамогай франтавым часцям у разгроме ворага.

Партызанскі паэт Анатоль Астрэйка ў той час пісаў у зборніку «Слуцкі пояс»:

Спее шчасця і волі прыход.
Што расце на франтах
і палянках.
Не зламаць, не сагнуць мой
народ.
Бо уся Беларусь партызанка!

І яно сапраўды так. За зброю ўзяліся ўсе, у каго было сумленне, у каго балела сэрца па сваёй зямлі, хто любіў свой народ і верыў у перамогу.

У часе бітвы пад Сталінградам беларускія партызаны выступілі з заклікам: «Забі немца ў Беларусі, каб не быў ён пад Сталінградам!» На бітву на Курскай дузе беларускія партызаны адказалі масавай рэйкавай вайной ад Брэста да Оршы, Гомеля, Унечы.

Набліжаўся дзень вызвалення Беларусі. Восенню 1943 года былі вызвалены Гомель і многія ўсходнія раёны рэспублікі.

Для мяне і нашага ўкраінскага партызанскага злучэння вызваленне Беларусі пачалося крыху раней. Абставіны склаліся так, што нашы атрады, якія знаходзіліся на Чарнігаўшчыне за Дняпром, вымушаны былі прыйсці на дапамогу беларусам. Многія мясцовыя атрады ўліліся ў злучэнні Каўпака, Фёдарава, Навумава, Сабурава і пайшлі на захад. Фашысцкія гарнізоны з Брагіна, Хойнікаў пачалі знішчаць беларускія сёлы, расстрэльваць людзей. Тут Ю. А. Збанацкі і даў загад пераправіцца цераз Дняпро і як след правучыць карнікаў. Пераправіліся ў вёсцы Ніжнія Жары і ў гарачым баі разграмілі гарнізон былога раённага цэнтра Камарына. Пасля гэтага Камарын і астаўся ў савецкай партызанскай зоне. Такім мы і перадалі яго часцям Савецкай Арміі.

Як вядома, наступальная аперацыя Савецкай Арміі «Баграціён» была адной з магутнейшых аперацый у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яна рыхтавалася ў вялікай тайне, дасканала і была накіравана не толькі на поўнае вызваленне Беларусі, але і часткі Польшчы, Усходняй Прусіі, закладвала асновы разгрому Берліна. Іменна тры Беларускія франты і Першы Прыбалтыйскі пад камандаваннем такіх выдатных савецкіх палкаводцаў, як Жукаў, Ракасоўскі, Чарняхоўскі, Баграмян, пайшлі далей на захад — у Польшчу, Прыбалтыку, Усходнюю Прусію, атрымліваючы новыя перамогі.

Не забывайцеся, сябры, што іменна франтам, якія насілі назву нашай рэспублікі, ды яшчэ Першаму Украінскаму, выпала вялікая місія дабіць фашыстаў у іх сталіцы, пераможна закончыць вайну аж да безагаворачнай капітуляцыі гітлераўскай Германіі.

Вечным помнікам гэтаму подзвігу з'яўляецца Курган Славы, што ўзвышаецца непадалёк ад Мінска.

Гаворачы аб вызваленні Беларусі, не магу не ўспомніць сваіх баявых сяброў, што ляглі навечна на полі бою. Вядома, усіх не ўспомніш. Але ёсць такія людзі, месца якіх на старонках вечнасці. У Цэнтральным скверы Слоніма каля братняй магілы ёсць невялікі помнік. На ім адзначана, што тут пахаваны Герой Савецкага Саюза маёр КІМ (Кузьма Савіч Гнедаш) і радыстка Клара Давідзюк — маскоўская камсамолка. Маёр КІМ доўгі час працаваў камандзірам аператыўнай групы на Украіне. Мне давялося працаваць пад яго кіраўніцтвам, выконваць самыя адказныя заданні. Гэта быў вельмі смелы разведчык і чулы чалавек. Перад пачаткам аперацыі «Баграціён» ён са сваёй групай быў перакінуты на Першы Беларускі фронт у раён Слоніма, Баранавіч, Брэста, Ваўкавыска. Загінулі КІМ і радыстка Клара Давідзюк за некалькі дзён да вызвалення, летам 1944 года. Акружаныя карнікамі, яны падарваліся ў зямлянцы гранатамі.

Хай будзе вядомы чытачу адзін з прыкладаў самаахвярнасці і гераізму нашых воінаў-вызваліцеляў. Тысячы і тысячы такіх слаўных патрыётаў аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, каб квітнела і красавала яна навекі. Ніхто не забыты і нішто не забыта. Гэтыя словы сталі крылатымі. У дні святкавання 35-й гадавіны вызвалення Беларусі яны прагучаць з новай сілай. Па ўсёй рэспубліцы. Хай жа ўпрыгожацца братнія магілы вянкамі і кветкамі. Хай успомняць ветэраны былыя баі і паходы, а слаўная моладзь ганарыцца сваімі бацькамі і братамі, хай паклоніцца магіле невядомага салдата, бо іх яшчэ шмат асталося на нашай зямлі.

Рыгор НЯХАЙ.

ПАЭЗІЯ

З кнігі „Зона супраціўлення"

Мар'ян ДУКСА

МАЛАДЗЕЧНА

Такія вакол камяніцы,
Калдобы асфальтам загаціў.
А ранг абласной сталіцы
Аднойчы усё ж такі страціў.
Хаця вышыня табе люба,
Калі ўжо такая гаворка:
Балконы, фабрычныя трубы
Даўно шыбанулі на ўзгоркі.
Твой пошчак індустрыяльны
Грымотна плыве у нябёсы!
Заўсёды настрой прывітальны —
Ніякіх прэтэнзій да лёсу.
Дружбацкі загадвае нораў:
З суседзямі — па-таварыску...
Будаўнікоў і шафёраў
Штодзённа падкідваеш Мінску.
Чыгуначнік светларусы
Стаіць на пероне зноўку,
Благаслаўляючы грузы
У замежную камандзіроўку.
Сады, беласнежныя ўранні,
Адданы пчалінаму гуду.
Вясёлае скрыжаванне
Машын і вясковага люду.
Цяперашняй былі і казкі,
Падзей і далёкіх, і блізкіх,
Павеваў сваіх, нарачанскіх,
І мокрых вятроў прыбалтыйскіх.
Ты — стрэча цэменту і лесу,
Малечы і ластавак порсткіх,
Спатканне глыбокага сэнсу
Слоў рускіх, тутэйшых і польскіх.
Паслухай прызнанне скупое,
Мой горад—і юны, і сталы.
Высока звініць над табою
Зямляцкая песня Купалы.

МАЙСТЭРНЯ СОНЦА

Зялёнай фарбы самавіты пах
Запаланіў увесь абсяг ля рэчкі,
Дзе кут малечы,
Дзе брыдуць авечкі,
Дзе доўгі жораў лазіць па кустах,
Дзе салаўі
На фестывальны форум
Злятаюцца, шалеючы ўначы,
Дзе толькі сонца можа памагчы
Зялёным фарбам выліцца у формы.
І з той пары,
Як промні пашчырэлі,
Навокала на некалькі ладоў
Раскручваліся эліпсы лістоў
У стылі вельмі мяккай акварэлі.
Не адкладзеш работу на пасля —
Травой у сонца галава занята:
Дзе быць шырокай,
Дзе прадаўгаватай,
Дзе лезці ўверх
У форме бадылля.
Увесь сакрэт тут у парыве скрытым.
Напэўна, сонцу хочацца любіць
З такім разлікам,
Каб і шчодрым быць,
І кожны раз такім таленавітым.

●

Мой лес,
Мой сфінкс,
Мой невядомы бог!
Ці я ў адчаі,
Ці ў панылай скрусе—
Затрубіць радасць у зіхоткі рог,
Калі ў твае я нетры акунуся.
Мой лес,
Мой друг,
З тваёй жывой крыніцы
Дазволь глытнуць
Сцюдзёнасці ледзь-ледзь,
У дом зялёны твой
Працерабіцца,
Вільготныя сцяжынкі развярцець.
Здарожанаму, мне
Прыйсці на веча
Бяроз і сосен,
Сцішыцца ўбаку,
Каб нешта ўведаць дзіўнае
Пра вечнасць
І дрэвам стаць
На баравым грудку.
Быць не ў сваім —
У іншым вымярэнні,
Адчуць,
Зірнуўшы мройна з-пад сука,
Уласнай скурай
тайну апярэння.
Уласным нюхам
хітрыкі ваўка.
Мой лесе верны,
Страхам не суроч,
Застанься шчодрым
на былую ласку,
Каб аж да скону
ў чэрвеньскую ноч
Дрыготка слухаць
Папараці казку.
Нясу на твары
любасці пячаць
Дрымотным борам.
І здаецца часам,
Што мае крокі лёгкія
Гучаць
Такім
Непажаданым дысанансам.

МАЛАДЫ ЛЕС

Тчэ незабудкі пеністая просінь,
Вільготным мохам пахне наваколле.
Паверх магіл былых пявучых сосен
Трымціць пяшчотна маладое голле.

Варушыцца разлапіста ўгару
Бліжэй, бліжэй да высі жаўруковай,
Мацуючы карэнне і кару
Пад пільнаю увагай лесніковай.

Няма чаго і думаць аб бядзе.
Шчаслівы ўзлёт, упэўнены і порсткі,
Старая хвоя сонца не крадзе,
Яшчэ не дражняць зверху пераросткі.
Ніякага спаборніцтва няма —
Ніякай барацьбы за існаванне.
Калышацца зялёная гурма —
То вецер,
А не дух размежавання.

Ці снілася такое гадабенства
Хоць раз
Майму сірочаму маленству?

●

Чакаць — дачакацца, убачыць бусліху,
Спыніцца — здзівіцца, душой
страпянуцца...
А мары ужо адлятаюць паціху
Не ў вырай —
Назад ім ніяк не вярнуцца.

Віліся навокал і клікалі ў высі,
Штодзённа туманілі розум дзяціны,
Якія збыліся,
Якія зракліся,
Калі я не быў да іх надта гасцінны.

О мары — о птушкі жыцця маладога!
Гайдалі спакой, як усплёскі рачныя.
Я знаю,
Ёсць мары надоўга-надоўга —
Яны не ручныя.

Іх хопіць на ўсю маю долю-нядолю,
На ўсе развітанні,
На ўсе скрыжаванні.
Яны існуюць, як магнітнае поле
Высокага ззяння.

●

Ці радасці голас,
Ці голас маркоты,
Вяселле ці гора —
Паэзія, хто ты?

Лятунак найпекны,
Крушэнне палёту,
Ты рай мой ці пекла —
Паэзія, хто ты?

Пагодлівы подых,
Ці гул ураганаў?
Прыстанішча кволых,
Ці мужных тытанаў?

КНІГАПІС

В. ЧАМЯРЫЦКІ, Г. ГАЛЕНЧАНКА, В. ШМАТАЎ. Францыск Скарына. На французскай мове. Парыж. ЮНЕСКА, 1979.

Гэтая праца, выдадзеная Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) у межах рэалізацыі праекта па вывучэнні славянскіх культур, прысвечана выдатнаму прадстаўніку беларускай культуры эпохі Адраджэння, вучонаму-асветніку, перакладчыку, заснавальніку ўсходнеславянскага кнігадрукавання Францішку Скарыне. Яе аўтары — беларускія даследчыкі, супрацоўнікі Акадэміі навук БССР — мелі на мэце пазнаёміць зарубежнага чытача з жыццём і творчай дзейнасцю нашага славутага земляка, паказаць яго ролю ў развіцці культуры і гуманістычнай думкі ў славянскім свеце.

Кніга складаецца з шасці раздзелаў: «Беларусь на рубяжы XV — XVI стагоддзяў» (аўтар В. Чамярыцкі), «Ф. Скарына — сын слаўнага горада Полацка» (Г. Галенчанка), «Друкар кніг перад тым нязнаных» (Г. Галенчанка), «Дзеля развіцця навукі, мудрасці і добрых звычаяў» (В. Чамярыцкі), «І ўнёс ён у тыя кнігі аздобы», «Па слядах Скарыны» (В. Шматаў). Прадмова і пасляслоўе падрыхтаваны В. Чамярыцкім.

Жыццёпіс першадрукара, разгляд яго выдавецкай і асветніцкай дзейнасці прыводзяць аўтараў да слушнага выводу, што ягоная творчасць нясе на сабе яскравы адбітак высокіх гуманістычных ідэй Рэнесансу. Традыцыі Адраджэння знайшлі адлюстраванне і ў афарміцельскай працы беларускага першадрукара. Гравюры, малюнкі, застаўкі ў скарынінскіх выданнях — гэта, па сутнасці, ілюстрацыя думкі аб імкненні чалавека да розуму і святла, аб пераадоленні ім духоўнай прыгнечанасці.

Добрых слоў заслугоўвае праца перакладчыка Жыля Гаша, які ўдала справіўся з перадачай зместу арыгінала на французскую мову.

Л. КАЗЫРА.

АДХІНУЎШЫ ЗАСЛОНУ ЧАСУ... Успаміны пра У. Галубка. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1979.

Здаецца, гэта першы ў нас калектыўны зборнік успамінаў пра дзеяча сцэнічнага мастацтва. Партрэт мастака ствараецца з артыкулаў, успамінаў і эсэ, напісаных рознымі аўтарамі. Мастацкі кіраўнік і акцёр вандроўнага тэатра, драматург і рэжысёр, мастак і педагог — такі ён на старонках складзенай Г. Марнуком кнігі «Адхінуўшы заслону часу...» Сярод тых, хто робіць гэта — адхінае заслону часу! — пісьменнікі А. Звонак, Я. Рамановіч, Я. Семяжон, мастакі З. Азгур, А. Марыкс і Я. Ціхановіч, акцёры колішняй славутай «трупы Галубка» — С. Бірыла, Т. Шашалевіч, Л. Шынко, дочкі Галубка Вільгельміна і Багуслава...

Л. ВАЛІГУРА.

Найбольш поўны

Да выхаду 14-томнага Збору твораў Якуба Коласа

Новае акадэмічнае выданне збору твораў Я. Коласа ў чатырнаццаці тамах, якое завершана летась, найбольш поўнае і найбольш дасканалае ў навуковых адносінах. Выхад яго, несумненна, вялікая падзея ў культурным жыцці рэспублікі. Новы збор твораў — плён далейшых намаганняў даследчыкаў, тэкстолагаў, узброеных сучаснай навуковай метадалогіяй, якія выкарысталі папярэдні вопыт падрыхтоўкі і ажыццяўлення падобных выданняў. З'яўленне яго засведчыла і далейшыя поспехі нашага коласазнаўства.

За савецкі час творы народнага песняра выходзілі 181 раз агульным тыражом 3 мільёны экземпляраў, у тым ліку на беларускай мове — 159 разоў, тыражом 2 мільёны 310 тысяч экземпляраў. За гэты ж час 13 разоў кнігі Коласа выдаваліся ў перакладах на балгарскую, польскую, чэшскую, венгерскую, фінскую, французскую, кітайскую і іншыя мовы свету. Што ж датычыць збору твораў, то яшчэ ў першае пасляраэвалюцыйнае дзесяцігоддзе ўрад рэспублікі прымаў пастанову аб такім выданні. Але толькі ў пяцідзесятыя гады з'явіўся першы 7-томны збор, а затым у шасцідзесятыя гады выйшла, слушна кваліфікаванае даследчыкамі як першае навуковае, 12-томнае выданне спадчыны песняра.

Ад невялікіх вершаў да манументальных паэм «Новая зямля», «Сымон-музыка», «Рыбакова хата», ад алегарычных апавяданняў «Казкі жыцця» да шырокай эпічнай панарамы паказу гістарычных лёсаў беларускага народа ў трылогіі «На ростанях», ад публіцыстычных артыкулаў і выступленняў як нацыянальнага трыбуна да перакладаў на мову свайго народа славутых узораў літаратуры — «Палтавы» А. Пушкіна, «Дэмана» М. Лермантава, «Кабзара» Т. Шаўчэнкі, ад лістоў-пасланняў да глыбока чалавечай эпісталярнай спадчыны паэта — усё створанае Коласам стала цяпер у адзіны рад, яно бачыцца сёння панарамна, як неабсяжны мастацкі свет, створаны Коласам ва ўсёй яго шырыні, паўнаце, мастацкай яркасці і непаўторнасці.

Творчасць Коласа — бясцэнны нацыянальны духоўны скарб. У новы збор, дзякуючы далейшым пошукам даследчыкаў і карпатлівай працы тэкстолагаў, дабавілася каля 100 новых твораў, у тым ліку звыш 70 вершаў, шэраг публіцыстычных артыкулаў, некалькі апавяданняў, сцэнічны абразок, кніга «Методыка роднае мовы», больш палавіны апублікаваных тут пісем.

Асабліва шмат увайшло новых вершаў, якія дапамагаюць паўней і рознабакова раскрыць шматгранны талент паэта, яго грамадска - палітычную актыўнасць, настроі і адчуванні. Гэта такія творы, як «Адзінота», «Год за годам неўзаметкі», «Дай зірну ў сваё ваконца», «Да выбараў», «Роднай краіне», «Вышыня Безыменная», «Я — баец Чырвоны», «Клятва», «Помсці!», «Да Германіі», «Невядомы хлопчык», «Жыве між нас геній», «Шлях славы», «Выглядаеш ты яснай вясной», «Зорка», «Да трыццацігоддзя Кастрычніка», «Ленінскаму камсамолу», «Петрусям» і іншыя.

Прынцыпова важнае значэнне для далейшага вывучэння спадчыны Коласа, для больш паглыбленага разумення характару яго светапогляду, філасофска - эстэтычных канцэпцый часу мае публікацыя такіх публіцыстычных артыкулаў, як «Пісоўныя работы курсантаў слуцкіх настаўніцкіх курсаў», «З поваду майго юбілею», «Маё першае спатканне з Я. Купалам», «Над чым мы працуем». Глыбінёй асэнсавання і фундаментальнасцю сваіх тэарэтычных палажэнняў напоўнены артыкулы «Вучоба пісьменнікаў — важнейшая задача», «На подъеме». Поўнае гераічнага пафасу яркае выступленне паэта — «Беларусы ніколі не аддадуць нямецкім захопнікам сваёй волі, сваёй зямлі, сваёй незалежнасці». Вылучаюцца і новыя аглядныя артыкулы пісьменніка на рускай мове: «Писатель - гражданин», «Пути белорусской литературы».

Упершыню ўключана кніга «Методыка роднае мовы», створаная пісьменнікам пад час працы выкладчыкам Беларускага педагагічнага тэхнікума, а таксама на кафедры беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта. У гэты час ён часта чытаў лекцыі па методыцы выкладання беларускай мовы і на настаўніцкіх курсах. Спецыяльная праца ні разу не перадрукоўвалася і стала сапраўднай бібліяграфічнай рэдкасцю. У «Дадатках» дадзены малавядомы сцэнічны абразок «На дарозе жыцця», таксама ўпершыню пасля першадруку.

Намнога паўней прадстаўлены і апавяданні Я. Коласа савецкага часу: упершыню ўключаны з іх «Хаім Рыбс», «Рыбакі», якія поруч з іншымі дапаўняюць агульную карціну развіцця ранняга беларускага савецкага апавядання. Усё гэта дасць магчымасць выразней уявіць кола праблем, якія хвалявалі мастака на парозе новага жыцця, раскрыць асаблівасці асваення ім новай рэчаіснасці, убачыць на агульным фоне нібы сацыяльны «зрэз» тагачаснага грамадства, свет шматнаселены, шматаблічны, вельмі супярэчлівы.

Праблема выхавання маладых літаратурных кадраў разглядалася Коласам заўсёды як адна з галоўных. Народны паэт аддаваў шмат сіл і энергіі, каб дапамагчы маладым зразумець як след многія пытанні пісьменніцкай працы, асабліва звязаныя з майстэрствам, навучаючы іх крытычна ацэньваць зробленае, засцерагаючы ад захвальвання адзін аднаго, заклікаючы пазбягаць слоўнага штукарства. Колас падпраўляў маладых, часам высмейваў, парадзіраваў іх творы, паказваў іх недахопы. У гэтай сувязі ўключэнне ў акадэмічнае выданне ўпершыню такіх рэчаў, як, скажам, «Ліст да маладнякоўцаў», азначае нямала. Гэта — цікавы і характэрны дакумент свайго часу, адно з яркіх публіцыстычных выступленняў песняра. Колас вітаў «армію маладых ваяк на фронце змагання за культуру і савецкую грамадскасць». Рабіў ён гэта без ніякай пампезнасці, дзелавіта, звяртаючы ўвагу маладых на нявырашаныя праблемы. «Бічуйце і шальмуйце гніль і балячкі нашага быту, як перажыткі яшчэ нязжытых форм ад спадчыны мінулага. Вітайце ўсё новае, маладое, здаровае, што ідзе на змену старому». Пафас выступлення пісьменніка будзе больш зразумелым, калі ўспомніць, што ўсяго за месяц да гэтага, у верасні 1928 года, ЦК камсамола аб'явіў культурны паход камсамола пад лозунгам: усе на барацьбу з непісьменнасцю, п'янствам, гразлю і неахайнасцю ў асабістым і грамадскім жыцці. У «Лісце», такім чынам, знайшлі адлюстраванне важнейшыя палітычныя задачы дня.

Хвалюючы дакумент — пісьмы мастака. Яны напоўнены глыбокай чалавечнасцю — яркае сведчанне багацця і шчодрасці душы, паўнаты жыццёвых інтарэсаў пісьменніка. Зараз гэтых пісем стала 755, большасць з іх уключана ў Збор твораў упершыню, бо адшуканы параўнальна нядаўна. Пісьмы цяпер займаюць амаль два тамы. Усе пранумараваны, маюць дакладныя даты напісання, суправаджаюцца змястоўным каментарыем.

У 14-томным Зборы твораў многае зроблена нанава. Набылі большую навуковую каштоўнасць і дакладнасць літаратурна-тэксталагічныя, літаратурна-крытычныя і гістарычныя каментарыі, шырэй прадстаўлена гісторыя стварэння многіх твораў, удакладнены спіс імёнаў і іншае. Выданне ў многім пазбавілася ад напластавання рознага роду памылак, фактычных і стылявых недакладнасцей, якія мелі месца раней.

У падрыхтоўцы тэкстаў і каментарыяў прыняў удзел вялікі калектыў вучоных, тэкстолагаў пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР В. Барысенкі і доктара філалагічных навук Ю. Пшыркова. Літаратурна-тэксталагічны кантроль ажыццяўляла К. Піліповіч. Падрыхтоўку тэкстаў і каментарыяў — А. Атаева, Р. Гульман, В. Дэконская, С. Забродская, Э. Золава, І. Крэнь, У. Ларчанка, К. Піліповіч, А. Харкевіч, Л. Чыгрынава. М. Мушынскім складзены «Летапіс жыцця і творчасці».

Каментарый значна паглыбіўся і стаў больш дакладным, лаканічным. Яго змястоўнасць, навуковая абгрунтаванасць у многім узнялі каштоўнасць усяго выдання. Каментарый павялічыўся ў параўнанні з папярэднім выданнем больш чым на 200 старонак і зараз складае амаль 700 старонак. Найбольш пашыраны і змястоўны каментарый да тома апавяданняў савецкага часу (І. Крэнь, К. Піліповіч); да апавяданняў дакастрычніцкай пары, паэмы «На шляхах волі», перакладаў, публіцыстычных і крытычных артыкулаў (У. Ларчанка).

У новым выданні пабольшала прадстаўніцтва варыянтаў твораў. Гэта добра. Шмат працы ўкладзена ў складанне паказчыка імён. Расшыфраваны ініцыялы, устаноўлены многія сапраўдныя прозвішчы.

Шматгранную і актыўную дзейнасць паэта, яго цесную сувязь з народам дапамагаюць у многім шырэй уявіць ілюстрацыі, якія з густам падабраны работнікамі музея Якуба Коласа. Нямала зроблена па далейшым удакладненні часу напісання твораў, ліквідаваны недакладнасці ў гэтых адносінах, якія сустракаліся раней. І ўсё ж датаваны яшчэ не ўсе творы: шматлікія вершы, якія ўпершыню надрукаваны («Петрусям» — «Гляджу на вас я, Петрукі», «Ёсць у нас гаспадары» і іншыя), паасобныя апавяданні («Драматург і лірычны паэт», «Адзін» і іншыя).

На наш погляд, варта было б вытлумачыць у каментарыях трансфармацыю назвы аповесці, бо ў першапублікацыях 1926, 1928, 1930 гадоў яна мела агульную назву «На прасторы жыцця», што, думаецца, у большай адпаведнасці з задумай аўтара, выразней раскрывала мэтаімкнёнасць моладзі першых гадоў новага будаўніцтва. Пазней «прыжылася» ўжо другая назва. Чаму гэта здарылася, трэба было б растлумачыць. Увогуле, думаецца, час змяшчаць поўны тэкст аповесці «На прасторы жыцця», а не адаптаваны для школьных падручнікаў - варыянт. Бо што атрымліваецца? Значная частка аповесці, звязаная з распрацоўкай такіх далёка не другарадных персанажаў, як вобраз сакратара фабкома Марціна Шулевіча, пачынаючага паэта Сымона Галызы, рабфакаўкі Ніны Ральніцкай трапляе ў канец тома, падаецца як варыянт часопіса («Полымя», 1926, № 5), сярод іншых каментарыяў. А гэта ж — асноўны тэкст аповесці. Дарэчы, ён поўнасцю змяшчаўся ў асобных кнігах «На прасторы жыцця» — 1926, 1928, 1930 гадоў. Апускаюцца праблемныя старонкі, якія далі б магчымасць сучаснаму чытачу паўней і глыбей зразумець час, калі ставралася рэч.

У каментарыях не паказаны чамусьці пэўныя варыянты ці канкрэтныя праўкі (стар. 23, радок 26). Слова «сакрамант» на стар. 20 вытлумачана як «прычасце», але тут трэба было б удакладніць, у якім кантэксце яно ўжыта, калі аўтар піша пра верш Алёнкі, што яна «хавае яго, як нейкі сакрамант». Поруч са словам «Іспаса» варта было б вытлумачыць і слова «фэст»—для сённяшняй моладзі мала зразумелае. Слова «гула» на стар. 47 вытлумачана, як «фіга», у той час, калі кантэкставае «гула асмаленая» больш расшыфроўваецца, як «галавешка», «асмалак».

Увогуле, каментарый да аповесці мог быць больш шырокім і змястоўным. У каментарыях паасобных апавяданняў («Стары канакрад», «Валька Кудлаты», «Трыумф», «Балаховец»), алегарычнага твора «Над прасторамі зямлі» заўважаецца, што гэтыя творы «ў зборнікі твораў не ўключаліся». Застаецца невядомым, ці яны не ўключаліся самім аўтарам, ці толькі не ўключаліся ў прыжыццёвыя зборнікі, бо ў апошнім 12-томным зборы твораў яны ёсць.

Даўно мы прывычна называем першы зборнік вершаў паэта «Песні жальбы́», у той час, калі ў арыгінале: «Песні-жа́льбы». Думаецца, трэба было звярнуць увагу на гэтую акалічнасць, пра што не ўпамінаецца.

«Летапіс жыцця і творчасці» падрабязны. Ён складзены так, што амаль не дубліруе каментарыяў, але, думаецца, добра было б зрабіць яго больш канкрэтным, дакументальным. Бо што даюць такія звесткі: «Красавік. Збіраецца паехаць у Крычаў для збору матэрыялаў аб крычаўскім паўстанні Васіля Вашчылы 1740—1744 гг.» Няясна, ездзіў Колас у Крычаў ці не?

Нельга абысціся без заўваг па знешнім афармленні выдання. Тут назіраецца сапраўдны разнабой: вокладкі розных тамоў адрозніваюцца па колеры, сустракаюцца «сляпыя» наборы на пераплётах, матэрыял таксама размеркаваны па тэмах непрапарцыянальна.

У 1982 годзе спаўняецца 100 год з дня нараджэння народнага песняра Беларусі. Выданне найбольш поўнага, найбольш дасканалага ў навуковых адносінах Збору твораў Коласа ў 14-ці тамах — адзін з добрых падарункаў да слаўнага юбілею.

Уладзімір НАВУМОВІЧ.

МАСТАЦКАЕ СЛОВА СЁННЯ І ЗАЎТРА

Рэдакцыя штотыднёвіка папрасіла шэраг пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў адказаць на пытанні анкеты ў прыдатнай для іх форме.

Змяшчаючы сёння пытанні анкеты і першыя адказы на іх, рэдакцыя заклікае на ўдзел у пачатай гаворцы пісьменнікаў і чытачоў.

1. Што, на Вашу думку, найбольш характэрна для сённяшняга літаратурнага працэсу ў рэспубліцы (ідэйна-тэматычныя пошукі, развіццё жанравых форм, стылявыя плыні і г. д.)? З чым звязаны заўважаныя Вамі змены і тэндэнцыі?

2. Апавяданне — аператыўны жанр літаратуры. Ці задавальняе Вас стан сучаснай навелістыкі? Якія, на Ваш погляд, тэндэнцыі ў развіцці гэтага жанру — плённыя, а якія — негатыўныя?

3. Узровень сучаснага рамана і аповесці? Якія, на Вашу думку, іх моцныя і слабыя бакі?

4. Як Вы ацэньваеце здабыткі нашай паэзіі апошніх гадоў? Ці не знізілася яе грамадзянскае гучанне? Ёсць падставы гаварыць пра гэта?

5. Якія жыццёвыя рысы вызначаюць сённяшняга героя нашай літаратуры (паэзія, проза, драматургія)? Чаго яму нестае? У якім кірунку могуць ісці пошукі новага героя?

6. Які рэальны ўплыў беларускага літаратуразнаўства і крытыкі на бягучы літаратурны працэс? Чым вызначаюцца ўзаемаадносіны паміж крытыкай і літаратурнай практыкай? Якая роля суб'ектыўнага і аб'ектыўнага момантаў? Што пераважае і што мае вызначальнае значэнне?

З УСВЕДАМЛЕННЕМ МЭТЫ

ЛІТАРАТУРА ПАСПЯХОВА развіваецца і перадольвае свае ўнутраныя цяжкасці тады, калі яна цесна звязана з шырокімі пластамі рэчаіснасці, узаемадзейнічае з рознымі формамі грамадскай свядомасці.

Асэнсаванне ўрокаў Вялікай Айчыннай вайны і перамогі панавому раскрыла магчымасці савецкага чалавека ў справе гістарычнай творчасці, вылучыла новыя крытэрыі яго ацэнкі. Філасофская паэзія зрабіла грамадскім набыткам перакананне ў тым, што не толькі гістарычны час вызначае аблічча чалавека, але і чалавек можа і павінен свядома надаць патрэбнае аблічча гістарычнаму часу, зрабіць яго чалавечным. На гэтым рубяжы, у канцы 60-ых — пачатку 70-ых гадоў, асабліва вострай стала ў літаратуры патрэба ўдакладнення крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі. Філасофская напоўненасць не страціла свайго значэння, але «чыста» філасофскія жанры, «чыста» духоўнае, ідэальнае самасцвярджэнне сёння ўжо не можа задаволіць грамадскую патрэбу. Прага духоўнасці, не падмацаваная практычным грамадскім дзеяннем, таксама мае схільнасць да перарастання ў прагу інтэлектуальнага камфорту.

Для твораў 60-ых гадоў, насычаных глыбокім і інтэнсіўным чалавечым перажываннем, характэрным з'яўляецца энергічны фінал, энергічнае самасцвярджэнне грамадскага чалавека. Менавіта ў гэты час намецілася тэндэнцыя да драматызацыі зместу лірычнай паэмы і лірычнай аповесці, а камедыя стала трагікамедыяй. У эпасе таксама назіраецца «сцягванне» ўсіх супярэчнасцей на вырашальныя рубяжы практычнага дзеяння, у якім рэалізуюцца грамадскія патэнцыі асобы. Контуры такой паэтыкі складваліся яшчэ ў даваенны час. Пераадолеўшы дагматызм тэорыі ідэальнага героя, літаратура на рубяжы 60-ых — 70-ых гадоў узбагацілася новымі формамі абагульнення, пашырыліся жанравыя межы творчасці. У апавяданнях і аповесцях (Я. Брыль, В. Быкаў і інш.) створаны манументальныя тыпы, вартыя раманнага мыслення.

У сваю чаргу малыя формы надзейна ўвайшлі ў структуру вялікага эпасу. Патрэба паўнацэннага рэальнага самасцвярджэння вымагае неадкладных закончаных ацэнак. «Палеская хроніка» І. Мележа заснавана на гарманічным спалучэнні асобных кругоў жыцця. Жыццё кожнага з яе герояў — самацэнная аповесць, памайстэрску ўведзеная ў поліфанічнае шматгалоссе жыцця. Пашыраючыся ў прасторы, узаемаўзмацняючы адзін аднаго па сіле, кожны з кругоў жыцця, няхай сабе да канца не пройдзеных, нясе ў свет свой чалавечы знак, пафас, чалавечы голас. Закончанасць эстэтычнай ацэнкі выражаецца ў тым, што пісьменнік добра ведаў, на якім рубяжы павінна зліцца ў адно праўда галасоў Васіля, Ганны, Гайліса, Алеся Маёвага, Апейкі, Белага, Чарвякова. Неабходнасць выпрацоўкі новых форм актыўнасці, новых форм узаемаразумення і яднання добра адчуваецца ў рамане «Завеі, снежань» і ў матэрыялах незакончаных раманаў цыкла.

Лепшыя здабыткі эпасу мінулых год сталі сродкам паглыбленага эстэтычнага пазнання і кандэнсацыі духоўнай энергіі. У рамане-хронікі намецілася выразная тэндэнцыя перарастання яго ў раман палітычны.

Праўда, у апошні час тут назіраюцца не толькі набыткі, але і пэўныя страты. З'явілася нямала вялікіх па лістажу твораў на такія адказныя тэмы, як тэма рэвалюцыі і Айчыннай вайны. Прэтэндуючы на эпас, яны ў лепшым выпадку і сапраўды застаюцца толькі абяцаннем эпапеі. Здае сёння свае пазіцыі і апавяданне. Цяжка адшукаць такую яго разнавіднасць, як навела з яе вострай канфліктнасцю і маштабнасцю абагульнення. Несумненнай вартасцю сучаснага апавядання з'яўляецца ўвага да характараў-антыподаў, аднак яго фіналы расслабленыя, заканчваюцца таннымі сентэнцыямі, маралізатарствам, неабавязковымі паводле ўнутранай логікі ўчынкамі герояў. І наогул, уводзячы персанажаў, што выйшлі з хат у вялікі свет, аўтар часам не ведае, якую даць ім работу ў сваім творы, чым заняць. Складваецца ўражанне, што пісьменнік не заўсёды пасапраўднаму зацікаўлены аналізам вядомых яму жыццёвых з'яў, часта застаецца на ўзроўні бытавога мыслення і на такім узроўні стараецца трымаць і чытача.

Перад новымі задачамі эстэтычнага пазнання некаторыя пісьменнікі нібы разгубіліся. Думаецца, што адна з прычын невыразнасці эстэтычных ацэнак хаваецца ў недастатковым асэнсаванні спадчыны, тых шляхоў, ліній, перспектыўных напрамкаў, па якіх ідзе на працягу дзесяцігоддзяў мастацкае асваенне рэчаіснасці, патрэб гістарычнага самаруху народа. У паэзіі гэтыя хібы асабліва адчувальныя. Было б памылкай спадзявацца, што творчая змена сёння будзе ўзнаўляцца стыхійна. Сам уклад народнага жыцця змяніўся, і стыхійнасць у эстэтычным выхаванні, як і ва ўсялякім іншым, можа саслужыць кепскую службу. Неяк занадта лёгка ў нас прывыклі глядзець на тое, што з гарадской моладзі вельмі мала хто сёння ідзе ў літаратурную творчасць. Ды і станам выкладання літаратуры ў школе пісьменніцкая арганізацыя цікавіцца ад выпадку да выпадку. А ўсё ж творчыя рэзервы ідуць са школы.

Думаецца, што наша крытыка завышае ўзровень культуры верша ў маладой паэзіі. Культура мастацкага слова пачынаецца не з эквілібрыстыкі, а з культуры эмоцый, культуры мыслення, гуманістычнай мэтанакіраванасці духу.

Чытаючы многія вершы, не заўсёды скажаш, дзеля чаго яны напісаны. Часам той або іншы аўтар нібы існуе па-за часам, па-за патрэбамі духоўнага развіцця народа і ў лепшым выпадку падобен да таго светлячка, які, гаварыў Я. Колас, свеціць хіба толькі самому сабе. З абыякавасці да чытача пачынаецца абыякавасць і да слова, ствараюцца асацыяцыі праз меру суб'ектыўныя, у ход пускаюцца штучныя неалагізмы. Такі суб'ектывізм асабліва небяспечны ў творчасці маладых. Цяжка назваць паэзіяй радкі, у якіх традыцыйная вобразнасць не ўзбагачаецца, а разбураецца:

> Без каліва збожжа, калі ў ім
> гарыць
> Агонь Праметэевы
> (?— **А. Р.**), — не абысціся
> Спрадвечнаму полю.
> І нават вятры
> Спяваюць аб гэтым у высі.

Аўтар гэтых радкоў Яўген Хвалей пры жаданні і сам мог бы пераканацца, што іх наватарства вельмі блізкае да «наватарства» па-свойму славутай паэмы «Гвалт над формай». Цяжка зразумець паэта, які хоча ўславіць агонь у збожжы.

Тэма (а тым больш гераічная) абавязвае да строгасці і адказнасці за кожнае слова. Некаторыя ж маладыя паэты са словам абыходзяцца занадта вольна. Уладзімір Мазго піша:

> Тут войны даўно ўтравелі
> Пад збуслянелы клёкат...

У чытача часам складваецца ўражанне, што некаторыя творцы спаборнічаюць у прыдумванні неалагізмаў, галаваломных асацыяцый. Але на справе за гэтым стаіць усяго толькі жаданне прыкрыць адсутнасць таго, што прыйшлося самому перажыць, адсутнасць духоўнасці. Дарэчы, асацыяцыі плённымі будуць тады, калі яны адлюстроўваюць аб'ектыўныя ўзаемасувязі. Асацыятыўная вобразнасць — гэта вынік паглыбленага пранікнення ў сутнасць шматграннай і стракатай рэчаіснасці. Дзе няма напружанага духоўнага вопыту, там няма і асацыятыўнага вобраза.

Для крытыкі тут адкрываецца шырокае поле дзейнасці. Хацелася б, каб было больш артыкулаў і рэцэнзій, у якіх глыбока і дакладна раскрываўся мастацкі змест твораў, як гэта, напрыклад, зроблена ў артыкулах У. Калесніка «Нaабапал перавалу» і Р. Бярозкіна «Лірыка салдата і сейбіта». Але, на жаль, часта прыходзіцца мець справу з крытыкай, якая вызваляе сябе ад абавязку рабіць аналіз. І таму многія паэты таксама шукаюць наватарства на шляху поўнага вызвалення ад «ланцугоў» распрацаванага стылю. Крытыка павінна паказаць, што такое «вызваленне» ставіць мастака за межамі памяці, сэнсу, слова. А гэта ўжо занадта дарагія на сённяшні дзень эксперыменты. Плённа ўплываць на літаратурны працэс крытыка будзе тады, калі яна сама будзе выразна бачыць гістарычнае развіццё тых ці іншых стылявых напрамкаў — ліній мастацкага пазнання, калі добра авалодае гістарычнай паэтыкай. Гэтага якраз ёй часам бракуе. У крытыцы можна сустрэць нямала выпадкаў неапраўданага супастаўлення далёкіх эстэтычных з'яў (сучаснага рамана і «Слова аб палку Ігаравым»). Вульгарная тыпалогія ўжываецца побач са сцвярджэннем, што нібыта кожны пісьменнік існуе сам па сабе. У такім выпадку няцяжка апраўдаць «зменлівасць» стылю пісьменніка, адсутнасць мэтанакіраванага напрамку, уласнага аблічча, а ўстойлівасць стылявога напрамку можна выдаць за «самапаўтарэнне» мастака, які смела пракладвае «рэчышча ўласнай ракі».

Л. Лявонаў зазначаў: «Значэнне кнігі вымяраецца колькасцю работы, якую яна можа зрабіць у галовах чалавецтва для яго далейшага прагрэсу». К. Чорны лічыў добрай кнігу, якая «ўзбівае» чытача на сталыя думкі. Ад гэтых дзейсных крытэрыяў адмаўляцца сёння нельга, як нельга пісаць па інерцыі, без выразна ўсвядомленай мэты.

Аляксей РАГУЛЯ.

НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЕ...

1. Думаю, у апошнія гады больш плённымі былі пошукі стылявыя, жанравыя. Адкрыццяў характараў, якія б увасаблялі новыя жыццёвыя тэндэнцыі, менш. Відаць, завяршаецца пэўны віток у духоўным жыцці, развіцці літаратуры, і яна, літаратура, не можа гэтага не адчуць.

2. Не задавальняе. Яркіх апавяданняў мала. Шмат дробных па тэме, якія не нясуць у сабе прыкмет сучаснага пульсу жыцця, яго новых павеваў.

3. Раман і аповесць таксама як бы завяршаюць распрацоўку раней адкрытых жыццёвых пластоў. Хоць мастацкі ўзровень шэрагу раманаў, аповесцей даволі высокі.

4. Думаю, працэсы, характэрныя для прозы, уласцівы ў пэўнай меры і паэзіі. Няўхільна расце дасканаласць формы, артыстызм, але вершаў, паэм, якія б сталі падзеямі ў літаратурным жыцці, не так шмат.

5. Бракуе шырокіх эпічных палотнаў, прысвечаных сучаснасці, мала твораў, у цэнтры якіх актыўна-дзейсны герой, сённяшні «дзелавы» чалавек.

6. Крытыка за апошнія гады ў пэўнай меры актывізавалася. Але яшчэ недастаткова крытыкі адважваюцца на абагульненні, прагнозы, аддаючы перавагу аналізу паасобных твораў і творчасці таго ці іншага пісьменніка.

Іван НАВУМЕНКА.

НАМ ПІШУЦЬ

Слоўнік псеўданімаў беларускіх пісьменнікаў

Такога выдання яшчэ няма, але яно вельмі патрэбна. Даследчыкі - літаратуразнаўцы і бібліёграфы добра ведаюць, колькі часу і намаганняў каштуе выяўленне і раскрыццё псеўданімаў і колькі ў сувязі з гэтым трапляецца памылак, якія прыносяць шкоду літаратуразнаўству.

Даследчык рускай літаратуры не ўяўляе сабе літаратурнага пошуку без выкарыстання слоўніка псеўданімаў, складзенага І. Масанавым. Аналагічнага беларускага выдання мы не маем.

Складанне слоўніка псеўданімаў — справа складаная, яна патрабуе велізарнага цярпення, працы і энтузіязму. За гэтую справу яшчэ 17 год назад узяўся даследчык, кандыдат філалагічных навук Іван Саламевіч. Ён знайшоў многа невядомых псеўданімаў, раскрыў раней не расшыфраваныя. Праароблена велізарная навукова-даследчая работа. Складальнік выкарыстаў архівы Мінска, Масквы, Вільнюса, асабістую перапіску з пісьменнікамі.

Зараз картатэка «Слоўніка псеўданімаў беларускіх пісьменнікаў» налічвае больш за 4000 псеўданімаў, пачынаючы з XVI стагоддзя і да нашых дзён. Хто, напрыклад, ведаў, што Цішка Гартны падпісваўся больш чым 150 псеўданімамі?! Не ведаючы ж усіх псеўданімаў, нельга сабраць усіх твораў пісьменніка.

Выданне «Слоўніка» патрэбна як з навуковага пункту гледжання, так і эканамічнага. Наяўнасць слоўніка псеўданімаў у бібліятэках знізіць вялікія выдаткі на пошук звестак у кожным асобным выпадку і засцеражэ даследчыкаў ад памылак.

Неабходнасць слоўніка відавочная. І ён ёсць, падрыхтаваны. Але выдаць яго, аказваецца, няпроста. Справа ў тым, што выдавецтва «Навука і тэхніка» выдае толькі планавыя безганарарныя працы, для выдавецтва ж «Мастацкая літаратура» слоўнік — «няпрофільнае» выданне, а «Вышэйшая школа» выдае толькі «сваіх» аўтараў. Вось і атрымліваецца, што патрэбны слоўнік няма каму выдаць.

У выданні «Слоўніка псеўданімаў беларускіх пісьменнікаў» зацікаўлены і навуковыя ўстановы, і бібліятэкі. Ён будзе карысным і для саміх выдавецтваў пры падрыхтоўцы поўных збораў твораў беларускіх пісьменнікаў. Таму вельмі неабходна вырашыць пытанне аб выданні гэтага слоўніка.

Н. ВАТАЦЫ,
В. ДЫШЫНЕВІЧ,
галоўныя бібліёграфы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

6 чэрвеня — 180 гадоў з дня нараджэння А. С. Пушкіна

ПАЭТА ГЕНІЙ НЕЎМІРУЧЫ

У Маскве на Баўманскай вуліцы, 10, узвышаецца будынак 353-яй сярэдняй школы. Калісьці на гэтым месцы, на былой Нямецкай вуліцы, стаяў невялічкі драўляны дом, у якім нарадзіўся Аляксандр Сяргеевіч. Імем яго і названа гэтая школа.

Жывучы ў Пецярбургу, знаходзячыся ў ссылках, вандруючы па Расіі, Пушкін ніколі не забываў родны горад. Звычайна, прыязджаючы ў «матухну-Маскву», паэт спыняўся ў гасцініцы «Англія». Гэты двухпавярховы прадаўгаваты дом з чатырма калонамі ў цэнтры захаваўся і зараз. На ім мемарыяльная дошка з профілямі Пушкіна і Міцкевіча. Тут два вялікія паэты ўпершыню сустрэліся і пасябравалі.

Непадалёк, тут жа, на Цвярской вуліцы, знаходзіцца яшчэ адзін памятны будынак. У ім Пушкін перадаў праз жонку дзекабрыста Н. Мураўёва А. Мураўёву сваё «Пасланне ў Сібір».

Некалькімі кварталамі вышэй, ля самых Нікіцкіх варот стаяла царква, у якой Аляксандр і Наталля Ганчарова вянчаліся. А ў невялікім двухпавярховым доме на Арбаце яны пасяліліся пасля вяселля.

Таму не выпадкова менавіта ў Маскве быў адкрыты Дзяржаўны музей А. С. Пушкіна.

Разам са шматлікімі наведвальнікамі ўваходзім у старасвецкі асабняк на Крапоткінскай вуліцы. Найбольшую цікавасць уяўляюць, мабыць, першыя восем залаў музея. Першая з іх прысвечана дзяцінству паэта, якое ён правёў у Маскве разам са сваімі бацькамі. У экспазіцыі знаходзяцца творы Вальтэра і Русо, Расіна і Мальера. Поруч Гарацый, Парні, Петрарка. Ніжэй — байкі Лафантэна з забаўнымі сцэнкамі ў гравюрах. Да іх прымыкаюць фаліянты энцыклапедый Дзідро. На другой паліцы — вершы Дзяржавіна, «Душачка» І. Багдановіча, рускія часопісы «Вестник Европы» і камплект «Приятного и полезного препровождения времени».

Ліпеньскім ранкам 1811 года брычка, запрэжаная тройкай коней, праехаўшы Цвярскую заставу, пакацілася ў бок Пецярбурга. У брычцы — дванаццацігадовы А. Пушкін у суправаджэнні свайго дзядзькі ехаў паступаць у царскасельскі ліцэй.

Час вучобы Пушкіна ў ліцэі супаў з Айчыннай вайной 1812 года. Экспанаты музея перадаюць абстаноўку і каларыт гэтай гераічнай эпохі рускай гісторыі, якая адбілася ў свядомасці Пушкіна і яго таварышаў па ліцэю. «Сярод ліцэйскіх вершаў, — гаварыў Бялінскі,— ёсць вершы, у якіх Пушкін з'яўляецца сапраўдным мастаком, творцам новай паэзіі на Русі».

У пачатку чэрвеня 1817 года адбыўся выпуск ліцэістаў. Па-чынаецца пецярбургскі перыяд у жыцці і творчасці паэта (1817—1820). Вясной 1819 года ў Пецярбургу арганізуецца нелегальны літаратурны гурток «Зялёная лямпа», у якім удзельнічае і Пушкін. На сходах абмяркоўваліся не толькі літаратурныя пытанні, але і палітычныя, чыталіся вершы, накіраваныя супроць урада.

Наступны раздзел экспазіцыі пераносіць нас у мясціны першай ссылкі паэта. У маі ён прыбыў у Екацярынаслаў (зараз Днепрапятроўск), служыў у канцылярыі генерала Інзава, які даў Пушкіну поўную свабоду. Сам паэт вельмі добра адносіўся да Інзава і зрабіў яго партрэт, які экспануецца ў музеі.

Хутка пасля прыезду Пушкін захварэў. У гэты час з Пецярбурга на Каўказ праз Екацярынаслаў праязджала сям'я генерала Раеўскага, з сынам якога, Мікалаем, паэт пазнаёміўся ў Пецярбургу. Раеўскія запрасілі Пушкіна суправаджаць іх на Каўказ і адтуль у Крым.

Прадстаўлены малюнкі Пушкіна, звязаныя з яго знаходжаннем на Каўказе і ў Крыме. Тут і партрэты Н. Раеўскага і М. Раеўскага, зробленыя яго рукой, яны змешчаны на рукапісе «Каўказскага палонніка».

У пачатку ліпеня 1823 г. Пушкін прыехаў у Адэсу, дзе напісаў тры першыя раздзелы «Яўгенія Анегіна». У паэта склаліся непрыязныя адносіны с графам Варанцовым, кар'ерыстам і ганарыстым арыстакратам, «прыдворным хамам» і «вандалам», як называў яго Пушкін.

Намаганнем Варанцова Аляксандр І адпраўляе Пушкіна ў новую ссылку ў маёнтак яго бацькоў, у Пскоўскую губерню, у глухую вёску Міхайлаўскае. У музеі гэты перыяд жыццёвай і творчай біяграфіі паэта паказаны малюнкамі В. Шуко «Домік няні Пушкіна»», Г. Аляксандрава «Сяло Міхайлаўскае» і партрэтам таварыша паэта па ліцэю І. Пушчына, які наведаў у Міхайлаўскім ссыльнага сябра.

14 снежня 1825 года ў Пецярбургу адбылося паўстанне дзекабрыстаў. За некалькі дзён да гэтага ў Міхайлаўскае да Пушкіна дайшла вестка аб смерці цара. Сам паэт рашыў пад выглядам слугі паехаць у Пецярбург. Але да таго часу паўстанне дзекабрыстаў было падаўлена. Пушкін цяжка перажываў трагічны лёс сваіх сяброў-дзекабрыстаў — Пушчына, Кюхельбекера, Бястужава. Побач з іх партрэтамі — акварэль К. Кольпана «Паўстанне на Сенацкай плошчы — 14 снежня 1825 года».

Халодным ранкам 8 верасня 1826 года па Пецярбургскім тракце імчалася ў напрамку Масквы фельд'егерская тройка: Пушкіну дазволілі вярнуцца з ссылкі. У Маскве паэт часта наведваў салон княгіні Валконскай, якая супроць волі бацькі збіралася ў Сібір да мужа-дзекабрыста. Акварэль П. Сакалова «М. Н. Валконская з сынам Мікалаем» змешчана ў зале, экспазіцыя якой прысвечана сувязям Пушкіна з дзекабрыстамі.

Малюнак М. Кузьміна «Пушкін у Болдзіне» адкрывае новы раздзел экспазіцыі, прысвечаны наведванню паэтам старога рускага сяла, якое належала Пушкіным. Прыехаў ён у Болдзіна восенню 1830 года. Стаялі цудоўныя асеннія дні. «Восень... любімая мая пара... Пара маіх літаратурных прац», — гаварыў Пушкін. «Ах, мой мілы, што за хараство тутэйшая вёска, — пісаў ён свайму другу і выдаўцу П. Плятнёву з Болдзіна. — Уяві: стэп ды стэп, суседзяў ні душы, ездзі верхам, колькі хочаш, пішы дома, колькі надумаешся — ніхто не перашкодзіць!» У час болдзінскай восені ён стварыў многія свае шэдэўры, у тым ліку — вершы «Бесы», «Элегія», «Румяны крытык мой», аповесці «Стрэл», «Станцыйны наглядчык», 8-ы і 9-ы раздзелы «Яўгенія Анегіна», «Моцарт і Сальеры», «Каменны госць», «Пір у час чумы», аповесці «Паненка-сялянка», «Завіруха» і інш.

Вельмі цікавы раздзел музея, прысвечаны творчай гісторыі рамана «Яўгеній Анегін». Як вядома, першыя строфы яго ўзніклі яшчэ у Кішынёве, у маі 1823 года, работа працягвалася ў Адэсе, Міхайлаўскім і ў Болдзіне. Напісаўшы дзевяты раздзел, паэт не лічыў раман закончаным. Тут, у Болдзіне, ён пачаў пісаць дзесяты раздзел. Як лічаць даследчыкі, у ім Пушкін хацеў паказаць некаторыя падзеі 1805 — 1825 гадоў, а, магчыма, і паўстанне дзекабрыстаў. Ёсць таксама меркаванне, што ў «Рамане ў пісьмах» і рамане «Рускі Пелам» (урыўкі і планы якіх захаваліся ў чарнавых паперах) Пушкін збіраўся апісаць рускае жыццё пасля паўстання дзекабрыстаў.

Па цэнзурных меркаваннях дзесяты раздзел «Яўгенія Анегіна» не мог быць у той час надрукаваны, захоўваць яго таксама было рызыкоўна. Таму Пушкін у дзень ліцэйскай гадавіны, 19 кастрычніка 1830 года, спаліў напісанае, захаваўшы частку раздзела ў зашыфраваным запісе, які толькі ў пачатку нашага стагоддзя ўдалося расшыфраваць.

У музеі буйным шрыфтам прыведзена пачатковая страфа дзесятага раздзела «Яўгенія Анегіна». Вось яна:

Властитель слабый и лукавый,
Плешивый щеголь, враг труда,
Нечаянно пригретый славой,
Над нами царствовал тогда...

Змястоўны раздзел музея, прысвечаны паэме «Палтава». Сярод экспанатаў — аўтографы другой і трэцяй песень з датамі іх заканчэння, а таксама прыжыццёвыя выданні твора. Побач партрэт аднаго з персанажаў — В. Качубея.

Выклікаюць цікавасць экспанаты, што расказваюць пра жаніцьбу Пушкіна з Ганчаровай. Пушкін двойчы пабываў у маёнтку Ганчаровых — Палатняным заводзе. Мэбля і рэчы яго знаходзяцца зараз у музеі. Тут жа вісіць акварэль Кольпана 1839 года «Палатняны завод». Побач паказаны дом Ганчаровых на Нікіцкай вуліцы, дзе бываў паэт. У гэтым жа раздзеле змешчана старонка з метрычнай кнігі царквы Вялікага Узнясення з запісам аб шлюбе А. Пушкіна і Н. Ганчаровай 18 лютага 1831 года.

У наступным раздзеле — партрэт М. Гогаля. З аўтарам «Мёртвых душ» Пушкін пазнаёміўся ў Царскім Сяле. Паміж імі завязаліся сяброўскія адносіны. Пушкін цёпла і клапатліва адносіўся да маладога яшчэ Гогаля. Аўтар «Рэвізора» (сюжэт гэтай камедыі, як вядома, падказаў Гогалю Пушкін) плаціў яму любоўю і павагай.

У самым канцы экспазіцыі размешчана зала, у якой знаходзяцца матэрыялы, звязаныя з апошнім перыядам жыцця Пушкіна, са стварэннем «Капітанскай дачкі», «Гісторыі Пугачоўскага бунту», матэрыялы, што расказваюць пра апошнія тыдні і дні жыцця паэта, пра акалічнасці яго дуэлі з Дантэсам. А вось і апошняя кватэра Пушкіна на Мойцы, 12, дзе ён і памёр 29-га студзеня 1837 года ў 2 гадзіны 45 мінут дня. Над усімі экспанатамі — словы А. Герцэна: «Ён паў у росквіце сіл, не дапеўшы сваіх песень і недасказаўшы таго, што мог бы сказаць».

У зале «Сусветная слава Пушкіна» сабраны выданні яго твораў у многіх краінах свету. Толькі з 1823 па 1836 год, яшчэ пры жыцці Пушкіна, з'явіліся пераклады на 12-ці еўрапейскіх мовах. Пасля смерці паэта і да нашых дзён апублікавана вялізная колькасць перакладаў яго твораў амаль на ўсіх мовах планеты.

Заключная частка экспазіцыі —«Пушкін і наш час». Яе можна выказаць словамі А. Твардоўскага: «Спадчына Пушкіна заўсёды разам з намі і ў нас саміх». Тут дублікаты Пушкініяны ў рабочым кабінеце У. І. Леніна, шматлікія выданні твораў паэта на рускай і на мовах іншых народаў СССР, у тым ліку і на беларускай мове, працы савецкіх мастакоў на пушкінскія тэмы, матэрыялы, якія сведчаць аб патрыятычнай ролі паэзіі Пушкіна ў гады вайны.

У трох верхніх залах часта наладжваюцца выстаўкі — «З фондаў музея», «Пушкініяна ў карцінах савецкіх мастакоў», «Па пушкінскіх месцах», «Архітэктура пушкінскай эпохі» і іншыя.

У лекцыйна-канцэртнай зале музея сістэматычна праводзяцца адкрытыя навуковыя пасяджэнні, літаратурныя і музычныя вечары, дэманструюцца мастацкія і навукова-папулярныя фільмы на пушкінскія сюжэты.

Пакідаючы музей А. С. Пушкіна ў Маскве на Крапоткінскай вуліцы, у думках пераносішся ў іншае пушкінскае месца — да магілы вялікага рускага паэта каля сцяны Святагорскага манастыра. Яна знаходзіцца на ўзгорку. Навокал яе, куды ні глянеш, лясы і палі. На магіле стаіць просты мармуровы абеліск — сімвал бяссмерця і вечнага жыцця Пушкіна ў сэрцах яго ўдзячных нашчадкаў.

Навум ЛАПІДУС,
кандыдат філалагічных навук.

ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ДВА РАДКІ ПУШКІНА

Уявім сабе Оршу ў адзін са спякотлівых ліпеньскіх дзён 1833 года.

Жыхары горада, нядаўна адноўленага пасля напалеонаўскага нашэсця, у тую раніцу, відаць, нямала былі ўсхваляваны. Яны перадавалі адзін аднаму трывожную навіну — у доме, дзе жыў настаўнік Аляксандр Лубкін, зроблены вобыск. У настаўніка забралі нейкія недазволеныя паперы, а самога жандары павезлі па Пацярбургска-Кіеўскім тракце.

Усё гэта не было выдумкай. Спецыяльная следчая камісія ў Віцебску ўжо каторы час займалася справай нелегальнага рэвалюцыйнага таварыства, якое жандарам удалося раскрыць.

Гэтую рэвалюцыйную арганізацыю, амаль праз 150 гадоў, «адкрыў» для нас, працуючы над невядомымі дакументамі ў Дзяржаўным гістарычным архіве БССР, выкладчык Мінскага інстытута культуры, кандыдат гістарычных навук У. Пасэ. У яе, як відаць з папер, уваходзілі ў асноўным жыхары Віцебскай губерні і выхадцы з Беларусі, якія займаліся ў Маскоўскім імператарскім універсітэце. Тоўстыя тамы следчых матэрыялаў далі даследчыку магчымасць даведацца пра невядомую раней вялікую групу рэвалюцыйна настроеных актыўных працаўнікаў самадзяржаўя, якія адначасова дзейнічалі на Віцебшчыне і ў Маскве, былі звязаны паміж сабою.

Але тут гутарка пойдзе не пра членаў гэтага тайнага таварыства, а толькі пра аднаго чалавека — Аляксандра Лубкіна, які цікавы зусім з іншага боку. У. Пасэ, не без падставы, лічыць да гэтага невядомага ні гісторыкам, ні літаратуразнаўцам настаўніка адным з першых у Беларусі распаўсюджвальнікаў нелегальнага спісу аднаго з вершаў вялікага рускага паэта Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Безумоўна, ён рабіў гэта не толькі з любві да незвычайнага таленту паэта, але і па сваіх рэвалюцыйных перакананнях.

Хто ж ён, Аляксандр Лубкін? Вядома толькі, што ён выкладаў матэматыку ў Аршанскім павятовым вучылішчы. Тады іх у горадзе існавала два: аднагадовае пачатковае і пяцікласнае дваранскае. Можна меркаваць, што Лубкін працаваў менавіта ў другім, дзе дзецям дваран давалі больш шырокія веды. Педагог, безумоўна, закончыў Маскоўскі універсітэт і быў малады, як і ўсе астатнія прыцягнутыя да следства арыштаваныя. З архіўных матэрыялаў беларускі гісторык устанавіў, што настаўнік з'яўляўся сувязным, кур'ерам паміж тайным літаратурным таварыствам у Маскоўскім універсітэце і членамі гэтай арганізацыі ў Беларусі. Ён перавозіў пісьмы і матэрыялы, якія з-за іх рэвалюцыйнага зместу нельга было адпраўляць па пошце. У час паездак у Маскву малады аршанец сустракаўся з віднымі ўдзельнікамі тайных таварыстваў ва універсітэце, многіх з якіх ён, мабыць, ведаў асабіста і перавозіў, па іх просьбах, розную нелегальшчыну на родную Віцебшчыну, хаця часам і ад яго яе тэкст быў утоены ў запячатаных канвертах.

У адным са знойдзеных жандарамі рэкамендацыйных пісем Лубкіну даюць вельмі пахвальную характарыстыку: «Уручальнік гэтага Аляксандр Лубкін... цудоўны хлопец, вельмі добрага складу думак, высакародны, і ты (г. зн. атрымальнік.—С.Р.) можаш з ім свабодна гаварыць аб усім. За свой незалежны характар даволі шмат пацярпеў ад начальства, і таму можаш яму верыць гэтак жа, як мне самому».

Гэтае пісьмо ўцалела выпадкова і трапіла ў следчую справу толькі таму, што чалавек, якому яно было адрасавана, наперакор указанню, якое ў ім змяшчалася, не спаліў яго пры атрыманні.

Але што ж яшчэ, акрамя ролі сувязнога, інкрымінавалася настаўніку павятовага вучылішча? Ахоўнікі парадку ў час вобыску ў аршанскім доме Лубкіна знайшлі адзін з рукапісных спісаў верша А. С. Пушкіна «Деревня», распаўсюджаных у Расіі. Гэта вядомы цяпер кожнаму школьніку і ўсім прыхільнікам таленту вялікага паэта адзін з ранніх твораў.

Прыгадаю яго шырока папулярныя, цудоўныя радкі:

Приветствую тебя, пустынный уголок,
Приют спокойствия, трудов и вдохновенья,
Где льется дней моих невидимый поток
На лоне счастья и забвенья...

(Працяг на стар. 10).

МАСТАЦКІ СУСВЕТ ЯЗЭПА ДРАЗДОВІЧА

ЯШЧЭ ЗУСІМ НЯДАЎНА творчасць Язэпа Драздовіча была вядома толькі адзінкам. Як ні дзіўна, але да гэтага часу не вызначана месца мастака ў гісторыі нашага мастацтва, зусім неацэнены той значны даробак, які ён унёс у яго развіццё. Гэтую задачу дапамагае вырашыць персанальная выстаўка твораў Драздовіча, якая экспануецца ў мінскім Палацы мастацтваў. Яна па сутнасці ўпершыню адкрывае шырокаму гледачу незвычайна таленавітага мастака-самародка, які адыграў у гісторыі нацыянальнай культуры важную ролю.

Язэп Нарцызавіч Драздовіч (1888—1954) — адзін з самых яркіх прадстаўнікоў заходнебеларускага мастацтва. Разам з тым ён з'яўляецца фактычным пачынальнікам беларускай мастацкай школы новага часу. Калі ў 1910 г. пасля заканчэння Віленскай рысавальнай школы пачалася яго самастойная творчая дзейнасць, беларускае мастацкае «поле» ўяўляла сабой сумны, запусцелы дзірван. Праўда, у другой палове XIX ст. у Беларусі працавала нямала мастакоў (Рушчыц, Дземель, Заранка, Ваньковіч, Сільвановіч і інш.), але амаль усе яны ў лепшым выпадку лічылі сябе «краёвымі», «тутэйшымі» мастакамі. Беларускія мастакі XIX ст. не прычыніліся і ў той час, відаць, яшчэ не маглі прычыніцца да свядомай працы на ніве роднай культуры, не ўяўлялі, а часам і зусім не верылі ў будучыню народа, не маглі прадбачыць той шырокай дарогі, па якой неўзабаве пойдзе развіццё нашага мастацтва. Каб дарога беларускай мастацкай школы стала явай, трэба было некаму пракласці першую сцежку. Яе пракладаў Драздовіч. Ён першы ўсвядоміў свой абавязак перад народам, услаўляючы ў мастацтве ягоны геній. У фарміраванні нацыянальнай мастацкай школы Драздовіч, думаецца, адыграў тую ролю, якая ў літаратуры належыць Ф. Багушэвічу (не выпадкова, між іншым, што Драздовіч неаднойчы маляваў свайго літаратурнага пабраціма). «Рысуй народ,—гаварыў Драздовіч сваім малодшым таварышам па мастацтве. — Падай чалавека ў працы. Рысуй яго хату і дзяцей, раскажы пра яго мару і долю. Падымі некранутыя пласты гісторыі».

Мастацкая канцэпцыя Драздовіча фарміравалася ў асяроддзі Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, К. Каганца і іншых дзеячаў нацыянальнай культуры. З ліста К. Буйло вядома, што менавіта Я. Купала яшчэ ў 1914 г. параіў паэтэсе Драздовіча для аздобы яе зборніка вершаў «Курганная кветка». У 20-ыя гады Драздовіч падтрымлівае трывалыя сувязі з Савецкай Беларуссю. Ніхто яшчэ не адзначыў цікавы факт удзелу мастака ў першай Усебеларускай выстаўцы ў Мінску (1925 г.), на якую Драздовіч даслаў алегарычную кампазіцыю «Рэвалюцыя». Гэта вельмі важна, бо ў той час тэма рэвалюцыі яшчэ толькі пачынала асвойвацца нашымі мастакамі. Вядомы сувязі Драздовіча з Інбелкультам і Акадэміяй навук БССР.

Пасля разгрому ў Заходняй Беларусі беларускіх рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый для мастака наступілі надоўга цяжкія гады. Будучы чалавекам рознабаковых здольнасцей ён, вядома, мог бы, як некаторыя іншыя, лёгка прыстасавацца да ўмоў, размяняць свой талент на звонкую манету. Але духоўная чысціня, чэснасць і бескампраміснасць, шчырая адданасць ідэі служэння свайму народу асудзілі яго на жыццё, поўнае нягод і нястач. Калі надзеі знайсці сталую работу па сэрцу не спраўдзіліся, Драздовіч назаўсёды вярнуўся ў сваю родную лясную і азёрную Дзісеншчыну і, надзеўшы на сябе торбу з фарбамі, стаў вясковым «вольным мастаком» — вольным перш за ўсё ад кавалка хлеба, як дасціпна заўважыў адзін з першых даследчыкаў яго творчасці А. Ліс. Амаль да канца жыцця ён зарабляў сабе на жыццё маляваннем дываноў для вяскоўцаў, але і гэтую працу мастак рабіў з душой і поўнай самааддачай, аб чым сведчаць запісы ў ягоным «Дзённіку».

Зараз на выстаўцы экспануецца аўтапартрэт, на якім ён адлюстраваў сябе адразу ж у трох паваротах. З невялічкага палатна прама на нас глядзіць чалавек у акулярах, з сур'ёзным заклапочаным тварам. У роце, як на вядомых аўтапартрэтах Ван Гога, рашуча зацінута люлька. Ды і ў характары мастака — у вострым, пранікнёным позірку і ўнутранай засяроджанасці адчуваецца тая апантанасць і няўрымслівасць, якія былі ўласцівы славутаму галандцу.

Злева ад асноўнай выявы Драздовіч у профіль намаляваў сябе як даследчыка космасу, справа — як краязнаўца.

З гэтага аўтапартрэта (ён, дарэчы, напісаны ў 1943 г., калі мастаку споўнілася 55 гадоў) відаць, што аўтар лічыў сябе мастаком, даследчыкам роднага краю і касмічнага сусвету. Разам з тым аўтапартрэт не адлюстроўвае ўсю незвычайную, шматгранную дзейнасць Драздовіча — жывапісца, графіка, скульптара, разьбяра па дрэве, пісьменніка, паэта, археолага, фалькларыста, лінгвіста, астранома, педагога, падарожніка. Па рознабаковасці, шматграннасці, а таксама па незвычайным творчым тэмпераменце Драздовіч у нашым мастацтве не мае сабе роўных — не выпадкова П. Сергіевіч называў яго «беларускім Леанарда да Вінчы».

Багатая творчасць Драздовіча патрабуе ўсебаковага манаграфічнага даследавання, тут мы можам толькі падзяліцца першымі ўражаннямі ад выстаўкі, адзначыць некаторыя асаблівасці яго прац.

Самае моцнае ўражанне робіць на выстаўцы графіка. Пешшу абышоўшы ўсю Заходнюю Беларусь, мастак стварыў сотні выдатных замалёвак беларускіх замкаў, якія ўвайшлі ў вялікія альбомы «Мір», «Ліда», «Крэва» і «Навагрудак». І калі першыя работы маюць яшчэ характар грунтоўна намаляваных, добрасумленных штудый, выкананых у традыцыях моцнага жыццёвага рэалізму, то ў альбомах «Ліда» і асабліва «Крэва» (абодва 1929 г.) — ужо не проста «натуральныя замалёўкі», а паэтычныя вобразы-сімвалы, вобразы - абагульненні. Любоў мастака да сваёй зямлі, глыбокае і арганічнае пачуццё гістарызму, якое Драздовіч дзіўным чынам здолеў удыхнуць у выявы помнікаў, уздымае іх над будзённасцю; у асобных малюнках Драздовіч знарок гратэскна «началавечвае» рэшткі старажытных вежаў, ператвараючы іх у загадкавыя міфічныя істоты, якія, узняўшы галовы над бяскрайнімі палеткамі, руінамі сцен і шэрымі сялянскімі хатамі, здаецца, хочуць загаварыць, паведаць людзям праўду аб нашым сярэднявеччы («Руіны крэўскага замка»).

Сапраўднымі шэдэўрамі на выстаўцы з'яўляюцца малюнкі Гальшанскіх гарадзішчаў, якія па майстэрстве выканання і чысціні асаблівага «драздовічаўскага» стылю, думаецца, не саступаюць творам старых майстроў. Гэта — класіка нашай графікі. Якое магутнае пачуццё кампазіцыі, сілуэта, архітэктонікі, якая дакладнасць лініі, штрыха, пераканаўчасць малюнка! На асобных графічных лістах Драздовіча намалявана ледзьве не кожная цаглінка, травінка, каласочак, пясчынка, але—дзіўная рэч! — малюнак скрозь захоўвае цэльнасць і нідзе не дробіцца на фатаграфічны «пералік» дэталей. Пры гэтым уражвае рэдкі лаканізм — пакладзена роўна столькі штрыхоў, колькі трэба, — ніводнага лішняга. Уражвае так-

ПРОЗА

Алесь ЖУК

ВЕЧНАЕ ПОЛЕ

АПАВЯДАННЕ

ГЭТЫЯ СНЫ СНЯЦЦА часта, вельмі падобныя, пра адно і тое, што, здаецца, было з табою богведама калі. Прачнуўшыся, дзівішся, што ўсё гэтак асталося ў памяці: людзі — нібыта толькі стаяў ля цябе чалавек і гаварыў, і ў паветры засталіся пах мокрага ад дажджу корту яго старое фуфайкі, і яго словы: і дарогі ў полі, з прыпыленым трыпутнікам узбоч, якія цякуць у тры неразлучныя сцяжынкі — сляды колаў і конскіх капытоў... І ў ногі цёпла ад тае шурпатае зямлі... Самае дзіўнае — у снах ярчэй, чым нават ва ўспамінах.

З гэтымі снамі прыходзіць і нейкая забытая, далёкая ўжо, але ж вельмі глыбокая і вечная ў сэрцы, туга. Нешта муляе, трывожыць, як першыя снягі і познія прымаразкі трывожаць свойскіх, ацяжэлых, як камякі, гусей. Яны тады пачынаюць крычаць непрывычна высокімі галасамі, станавіцца на крыло — і гамашна падаць непадалёку за вёскаю на аселіцу.

Гэта не тая вострая маладая туга, якая была спачатку, як перабраўся ў горад і чужаўся і баяўся яго, а таму хацелася дадому. Пасля таго сплыло нямала часу і жыцця сышло з ім, прывычнага, спакойнага. Параслі ў горадзе дзеці, а там, дзе дом быў, не засталося ні родных мясцін, ні блізкае радні.

Як адыходзіў з родных мясцін у новае неспазнанае жыццё, ведаў, што пражывеш не гэтак, як бацькі тваіх бацькоў, што зжывалі век за векам, пакаленнем змяняючы пакаленне, не ведаючы ні таго прастору, ні вялікага свету, што адкрыўся табе. У маладосці заўсёды шчасліва думаецца і верыцца, што будучае тваё жыццё — адно толькі свята.

А цяпер, калі радасць і слодыч перажытага ляжыць на тваіх руках цяжкім мазалём, прасвечваецца беллю сівізны на скронях, часам можа падумацца і пра такое: там, дома, можа, лепш бы і патрэбней пражылося тваё жыццё... Можа, і з-за гэтага пачынаюць сніцца яны, вострыя, як успаміны, радасныя, светлыя, прасоленыя журбою сны?

У мяне гэтая пара сноў і позняга вяртання назад, дадому, пачынаецца якраз у жніўні, калі ўжо ёсць, бы скрозь затуманеныя слязою вочы, жураўліная туга ў прасторных і сонечных далягладах, калі асмужацца рабінавыя гронкі і з прыдарожных лазовых кустоў, як пер'е з падбітае стракатае птушкі, ападзе долу першае свежае лісце.

Такога вось прыжуранага, сонечна-цёплага, нават душнаватага дня хадзіў я слуцкімі палеткамі і пералескамі, адпачываў у бярозавых маленькіх гайках сярод поля, душнавата прапахлы бярозавым веццем, піў ваду з дрэнажа на меліярацыйнай канаве, якую прарэзалі на месцы добрае і мілае рэчкі. Ад рэчкі ўжо нават не засталося следу і тых завоін-старыц, у якіх яшчэ доўга рос аер, цвілі жоўтыя збаночкі, цёмна-рудавата стаяла густая вада.

Непрывычная пустэльнасць і цішыня валадарылі ў палях, ужо прыбраных, перааваных, над якімі трапятліва ляталі чароды ўстурбавана-палахлівых кнігавак, да якіх падсебрываліся і шэрыя сяўцы.

Пры лясках у сухой раллі купаліся, вышалоптваліся вывадкі курапатак. Знячэўку спалоханыя, яны вялікімі пыльнымі клубкамі ўскочваліся з зямлі.

За дзень ад непрывычкі многа хадзіць і нават ад таго, што самому невядома, чаго ходзіш-нудзіш, зарадуешся, што скора выйдзеш да цягніка і паедзеш...

Натомлены, расчараваны ў сваёй выдумцы прыехаць сюды, падбіты адчуваннем свае счужэласці тут, бо і зямля быццам не тая — паніжэлі ўзгоркі, перамяніліся і не стала многіх палявых дарог,— я прыпыніўся на апошні адпачынак. Расклаў вогнішча пад старою сасною ў невялічкім бары, пёк на ражэнчыку сала. Але ці то не галадзён быў, ці не той смак у сала, вылежанага ў халадзільніку, вялікае ўцехі з гэтага не выйшла. Аднак і хадзьба, і страва схілілі на сон.

Прачнуўся я ад таго, што нехта халаднаватаю рукою лёгка, амаль нячутна, правёў па твары. Прахаліўся. Сонца ўжо садзілася за лесам, і паклала мне на твар цень ад маладое хвойкі. Трэба было спяшаць.

Выбраўшыся з ляска, я пакіраваў да былога балота, каб цераз яго выйсці адразу на паўстанак.

Чым бліжэй падыходзіў я да балота, апускаўся ў лагчыну, рабілася свяжэй, аднекуль наплываў туман. Спачатку лёгкі, ён неяк вельмі ж скора гусцеў — ці гэта здавалася таму, што села сонца і пачыналі апускацца прыцемкі?

Змярканне мяне вельмі палохала: былое балота я памятаў яшчэ сапраўдным балотам, ведаў яго ўжо і асушаным, дзе таўкліся чароды калгасных кароў і бушавалі ў вялікіх, як стагі, лазовых кустах.

За невялічкім узгоркам я зноў сышоў у лагчыну, і адразу ж як апусціўся ў густы, што пазнявосеньскі, туман, які быццам стаяў тут увесь дзень, а не ўстаў цяпер, пасля заходу сонца. Нават здалося, што запахла вадою, балотам.

Скора і сапраўды пад нагамі пачалася вільготная зямля, з глыбокімі слядамі каровіных ног. Потым неўспадзеўкі з туману выглянула і вада — гэтакая ж шэрая, як туман, у дробненькую хвалю, якая пляскала аб гладзенькі ілісты бераг, па якім ля самае вады, як нешта шукаючы згубленае, бегаў невялічкі даўганосы кулік. Ён спалохана свіснуў, убачыўшы блізка чалавека, адляцеў уздоўж берага і зноў забегаў туды-сюды.

Глей ліпка браўся за падэшвы, і я ступаў цяжка і мякка, як конь з абвязанымі капытамі.

Вада не кончылася ні праз пятнаццаць хвілін, ні праз паўгадзіны. І ў душы ў мяне нешта абарвалася, як бывае, калі заблудзішся ў незнаёмым вялікім лесе і нават не ведаеш, дзе ты і куды можаш выйсці. І цяпер як найхутчэй хацелася толькі аднаго — дайсці да канца вады. Непрыемным халадком даймала разуменне, што я ўжо не ведаю мясцін, і пачынала здавацца, што, ідучы паўз ваду, заварочваю ў зусім другі ад чыгункі бок. Самахоць пачаў спяшаць. А бераг быў усё гэтакі ж голы, і кулічок, нібыта ўсё той, адзін, пералятаў уперад, бегаў, пасвіставў.

Разоў колькі я падыходзіў да вады, прыглядаўся — ці не відаць другога берага, прыслухоўваўся. Вада сыходзілася з туманам у шэрую непраглядную цэласць. І ні гуку. Ні далёкага, ні блізкага. Быццам у гэтым тумане я перайшоў неўпрыкмет на нейкую іншую планету.

Амаль зусім сцямнела, пакуль я датупаў да вузкае балоцістае ручаіны, мусіў разуцца, каб пераправіцца на другі бераг.

Ад свае пераправы пабрыў берагам назад, бо ведаў ужо, што тая лагчына, цераз якую я меркаваў нацянькі сігануць да чыгункі, затоплена вадою. Цяпер невядома толькі было, як далёка зайшоў я і колькі часу трэба ісці назад.

Пасля таго як збольшага разабраўся, дзе я, крыху паспакайнела на душы. Ішоў ходка, аж узмакрэў увесь, прыслухоўваючыся толькі да лёгкага плюскатання хваль. І з разгону з туману амаль наляцеў на невялічкае вогнішча пад вялікім лазовым кустом. Пры вогнішчы, на жмаку саломы, выцягнуўшы праўцом нагу бліжэй да цяпла, абапёршыся на локаць, ляжаў чалавек у ватніках, у армейскім бушлаце і маленькай кепачцы. Густа пахла свежа аранаю зямлёю, дымам. У водсветах вогнішча быў слаба відзён «Беларусь» у баразне.



«Гусляр».

сама непаўторная святочнасць, урачыстасць прац, іх рэдкая шчырасць і чалавечая цеплыня. Такім яркім, пераканаўчым малюнкам мог валодаць толькі чалавек з фенаменальнымі прыроднымі здольнасцямі, незвычайным тэмпераментам і фантазіяй, беспамылковым вокам і моцнай бездакорнай рукой.

Жывапіс, якім Драздовіч асабліва інтэнсіўна займаўся ў 30—40-ыя гады, пасля пагоршання зроку, прадстаўлены карцінамі на гістарычныя тэмы, сімволіка-алегарычнымі і касмічнымі кампазіцыямі, партрэтамі, дыванамі.

Вельмі цікавая серыя сімволіка - алегарычных палотнаў («Дух цемры», «Дух помсты», «У няволі», «Алегорыя мінуўшчыны»). Беларусь, яе мінулае, сённяшняе і будучыня — асноўная тэма гэтых палотнаў. Заходнебеларуская рэчаіснасць з яе ўдушлівай атмасферай буржуазна-польскага шавінізму не давала мастаку матэрыялу для ўзнёслых аптымістычных вобразаў. І тады на палотнах сярод руін старажытных замкаў з'яўляюцца вобразы кажаноў, соў, страшыдлаў - начніц — увасабленне варожых сіл, што перашкаджалі развіццю культуры.

Будучыню народа Драздовіч уяўляе ў выглядзе асветленага сонцам горада-замка, да якога скіраваны мары мастака.

Слаўным падзеям нацыянальнай гісторыі прысвечаны кампазіцыі «Гусляр», «Князь Усяслаў Чарадзей пад Гародняй» (1944), цікавы цыкл карцін «Францыск Скарына» (1940 — 1943).

Цудоўныя партрэты і асабліва краявіды мастака, дзе ў непаўторным харастве ажывае родная Дзісеншчына, Галубіцкая пушча, рэчкі Аута, Мнюта, Гінь-возера.

Калі ў ранніх, цікава задуманых і выдатных па кампазіцыі палотнах ёсць яшчэ некаторая жорсткасць мазка («Гарадольская пушча», 1926), то больш познія вабяць тонкім каларытам, настраёвасцю, паэтычным абагульненнем. «Хутар на ўскрайку Галубіцкай пушчы»— лепшая пейзажная праца мастака. Колькі тут настрою, мяккай паветранасці, дасягнутай тонкімі адценнямі лёгкіх блакітна-зялёных фарбаў, што пераліваюцца ў шырокай стужцы лесу ля далягляду, адценнях сялянскай хаты, вуллях у агародзе пад стромкімі хвоямі!

Праз усё жыццё Драздовіча прайшло захапленне сусветам. Яшчэ ў 1931 г. у Вільні выйшла ягоная кніжка «Нябесныя бегі» з уласнымі лінарытнымі ілюстрацыямі, выкананымі лаканічна і выразна. У прысвячэнні Драздовіч піша, што цікавасць да пазнання сусвету абудзілі ў ім бацькі, перш за ўсё маці, ад каторай не раз даводзілася чуць «вучыся і пазнай нябесныя бегі». Пазней Драздовіч напісаў кнігу «Тэорыя рухаў» (ёсць меркаванне, што яе рукапіс быў дасланы Я. Коласу). Пра вялікае захапленне мастака сусветам, рухам планет сведчаць шматлікія творы на гэту тэму (алейныя і графічныя цыклы «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Месяцы»). «Касмічныя» творы Драздовіча некаторыя аўтары, ў тым ліку літоўскія, параўноўвалі з працамі Чурлёніса. Але ў адрозненне ад Чурлёніса з яго некалькі абстрагаванай сімволікай і абвостранай «музычнай» пачуццёвасцю працы беларускага мастака больш зямныя, матэрыяльныя, канкрэтныя; Драздовіч «насяляе» далёкія планеты рэаліямі канкрэтнага жыцця, а часам і цэлымі фрагментамі са сваіх беларускіх краязнаўчых замалёвак. Вось некалькі прыкладаў: ляснoе мора вакол палаца ў карціне «Артаполіс» нагадвае Гарадапольскую пушчу, якую неаднойчы пісаў Драздовіч; ганчарныя вырабы ў лісце «Арыяполіс» — аўтэнтычныя творы беларускай керамікі; чырвоная сцяна ў карціне «Касмаполіс» (1931) нагадвае сцены Лідскага замка, узнятыя з руін. Гэтая «пераклічка» розных твораў Драздовіча абумовіла выключную цэласнасць ягоных прац, дзе мастацкі «космас» усюды зямны, а «зямныя» кампазіцыі ў сваёй абагульненасці — «касмічныя».

Прадстаўленыя на выстаўцы маляваныя дываны мастака па сваёй высакароднай «некрыклівай» каларыстычнай гаме блізкія да беларускіх габеленаў XVI—XVIII ст ст., а драўляная пластыка выканана ў стылі традыцыйнай разьбы па дрэве.

Чым толькі ні займаўся гэты

«Хутар на ўскрайку Галубіцкай пушчы».

загадкавы мастак-феномен і няўрымслівы летуценнік! На выстаўцы экспануюцца ягоныя кіі, аздобленыя разьбой, статуэткамі, ажурным рэльефам.

У цэлым выстаўка Драздовіча робіць самае моцнае ўражанне. Па багацці і значнасці тэматыкі, жанравай разнастайнасці твораў і іх самабытнасці, нацыянальнай адметнасці — гэта ці не самая цікавая персанальная выстаўка беларускага мастака за ўвесь пасляваенны перыяд. Таму неабходна аддаць належнае членам камісіі народнага мастацтва СМ БССР (А. Марачкіну, Я. Куліку, В. Маркаўцу), а таксама мастакам У. Круцкоўскаму і М. Купаве, якія прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі выстаўкі, пошуках і рэстаўрацыі твораў, стварэнні экспазіцыі.

Як ужо зазначана, уклад Драздовіча ў развіццё беларускай мастацкай школы вялікі і непаўторны. Высокую ацэнку яго творам давалі Я. Купала, Я. Колас, П. Сергіевіч М. Сяўрук, К. Буйло, З. Бядуля, М. Гарэцкі. М. Танк у «Лістках календара» яшчэ ў 1936 г. пісаў, што працам Драздовіча «некалі і цаны не будзе».

Таму трэба зрабіць усё магчымае, каб пасля закрыцця выстаўкі творы мастака не вярнуліся назад у запаснікі музеяў, дзе яны, нікому невядомыя, пыліліся дзесяткі гадоў. Як вядома, у Каўнасе існуе музей Чурлёніса, які наведваюць тысячы гледачоў. Незвычайная папулярнасць выстаўкі Драздовіча, высокая ацэнка ягоных прац, тая вялікая роля, якую адыграў мастак у гісторыі нашай культуры, усхваляваныя запісы ў кнізе водгукаў — усё гэта пераконвае ў тым, што музейная экспазіцыя твораў Драздовіча таксама мае права на існаванне. Мы павінны аддаць даніну павагі і ўдзячнасці мастаку-патрыёту, які здзейсніў грамадзянскі подзвіг у імя росквіту роднай культуры.

Віктар ШМАТ.

Чалавек не пачуў мяне, глядзеў на агонь, кінуў у яго недакурак, сеў, асцярожна, як чужую, пасунуў рукамі нагу яшчэ бліжэй да агню, акуратна загарнуў у газету астаткі вячэры і паклаў у старую, богведама якога веку, зашмальцаваную палявую кірзавую сумку.

Я пазнаў не чалавека, а пазнаў гэтую сумку і тады адразу ж успомніў і яе гаспадара, неяк міжволі адступіў назад. Нібы нешта зрабілася з маёй галавою — я ўсё роўна, як апынуўся далёка, у дваццаці гадах назад. Бо там менавіта была гэтая брызентавая, даношаная ўшчэнт, сумка, там быў гэты ў ватніках, у кепачцы трактарыст Нясевіч. Там ён позняю восенню прыцягваў да калгаснага гумна вялікую, як хата, драўляную малатарню, а пасля прымяркоўваўся, ставіў трактар, нацягваў доўгі і шырокі пас, які цяжка правісаў і тлуста шлёпаў, калі ішла малатарня, і пад якім, улучыўшы зручны момант, нельга было не праскочыць.

Далей ад паса малых ганяў Нясевіч. Ён быў адзеты ў ватнікі, у кажушок, туга падпяразаны старою папругаю, у шытых валёнках з чырвонымі гумамі і сам чырвоны з твару, як рыж, пахаджваў вакол малатарні. Ён малаціў збажыну. І гэта разумелі і адчувалі ўсе. Ён тут быў галоўны, гаспадар.

Пасля, як пайшло больш машын у калгасы, як не стала тых трактароў з вялікімі, у белыя шыпы коламі, неяк знік з вока Нясевіч. Хлапчукі ўжо самі сталі капніцельшчыкамі на камбайнах, садзіліся за рулі аўтамашын — шафёры пакрысе вучылі іх...

Але нічога нерэальнага не было ў тым, што зараз ля вогнішча сядзеў Нясевіч. Ён яшчэ, значыць, рабіў на трактары.

Ці то я неасцярожна паварушыўся, ці то залішне пільна прыглядаўся да чалавека і ён адчуў на сабе чужы позірк. Нясевіч насцярожана павярнуўся і прыгледзеўся да мяне, потым сказаў неяк з палёгкаю:

— А-а! Ахвотнік! А я думаў...

Я ступіў да агню.

— Вечар добры,— адказаў ён на маё прывітанне. — Што ж нічога не застрэлілі? Качкі чародамі лётаюць... Але ж яно цяпер і качка хітраю стала. Чорта да берага падплыве!

— Чыстая вада тут,— як апраўдваючыся, адказаў я. І ледзь стрымаўся, каб не назваць яго імя,— заўважыў, што Нясевіч не пазнае мяне. Ды і я, мабыць, не пазнаў бы яго, каб сустрэў так дзе, не ў гэтай адзежы і не пры трактары. Са мною гаварыў ссутулены ад старасці чалавек, у якім ужо не адчувалася ні вялікае сілы, ні вялікага здароўя.

— Рыбу тут добра лавіць. Карпы як жарабцы павырасталі.

— Якая тут рыбалка!

— Ого! Хлапчукі ходзяць, носяць. Я ўчора тут араў удзень.

Нясевіч не дагаварыў, паправіўся лепш сесці, асцярожна пасунуў нагу, перахапіўшы мой позірк, ахвотна, як апраўдваючыся, растлумачыў:

— У мяне гэта яшчэ пасля партызанкі. Пад старасць раны адкрыліся. Я спужаўся, як угледзеў вас, думаў аграном наш ці механік. Яны мне трактар не давалі. Кажуць, стары, хворы... А што мне берагчы? Старая порхаўка, я сваё ўжо аджыў. Ці троха пазней, ці троха раней, а пара туды. Толькі трактар новы, харошы, шкода. І не пусцілі б мяне на трактар, але трактарыстаў малавата. Маладыя цяпер не вельмі дома асядаюць. Падняліся, як птушыная чарада. Аднаму неяк і аставацца не з рукі, каб хто і хацеў...

Нясевіч не пазнаў мяне. Я зусім зразумеў гэта па тым, як спакойна расказваў ён мне, і ад гэтага чамусьці адчуў палёгку, мог спакойна глядзець на яго, распытваць.

— А вы, мабыць, не саўсім гарадскі?— раптам запытаўся Нясевіч.

— Чаму?

— Чорцяга саўсім гарадскі чалавек будзе гэтаю парою хадзіць па полі ці па лесе. Гэта дзеравенскаму, як выйдзеш, глянеш на поле ці на лес, нешта на сэрца ляжа. Але ж цяпер усё перамяшалася. Я трох хлопцаў выгадаваў. Адзін у Карагандзе. Толькі раз і прыехаў на тыдзень. Другі пад Масквою. Вучоны. Марскіх свінак там рэжа, вывучае. І жонка кандыдатка. Прыехаў да мяне і з калодзежа кубка вады не выпіў. Толькі кіпячоную піў. Гэта той мой Ванька смаркаты, што вечна пад носам вісела!..—Нясевіч усміхнуўся цёплаю і сумнаю ўсмешкаю, быццам ўгледзеў перад сабою таго малога свайго Ваньку, цяперашняга кандыдата.

Я не памятаў яго Ваньку смаркатым. На маёй памяці ён быў ужо кавалерам, і такіх, як я, хто шыўся на вечарынку, любіў шумнуць, выхапіўшы са штаноў папружку і даняўшы ёй каго-небудзь. Маім аднагодкам быў малодшы Нясевічаў, Толік. Старэйшыя Нясевічавы вучыліся добра і паступілі ў інстытуты — тады сама мода пачалася паступаць. Толік рос чалавекам ужо другое, пазнейшае фармацыі. Ён раней за нас, аднагодкаў, прыстаў да кавалераў, праводзіў дзяўчат, насіў модныя па тым часе штаны-«дудкі», кароценькую канадку, выпіваў, курыў, не тоячыся ні ад настаўнікаў, ні ад бацькоў.

— А Толік дзе ваш?

— О-о! Гэты, халера, разумнейшы за ўсіх маіх вучоных аказаўся. І вады кіпячонае не п'е, і грошы мае. Жыве раскошна...

Нясевіч ажывіўся, усміхнуўся.

— Чорцяга думаў, што з яго толк будзе. Басяк-басяком рос. А цяпер, браце ты мой, морда тая чырвоная, сам мужчынішча, што камель дубовы. Хлопцаў дваіх гадуе. І не п'яніца. Брыгадзірам тут, у Салігорску. Заслужаны чалавек. Але і шалапут, як і быў! Тут быў прыехаў з Мінска суседаў хлопец, прашчалыга гарадскі. Толік яго частаваў і сам начаставаўся. Пачаў хваліцца, што машыну купляць хоча, але не абы-якую, давай сама мала «Чайку». А той і кажа, што ў Мінску ў яго шафёр знаёмы, галоўнага бацюшку возіць. Кажа, будзе бацюшка стары «ЗІМ» збываць, на «Чайку» садзіцца. І ты думаеш? Пайшлі ў аўтобус садзіцца, ехаць машыну таргаваць. От абармоты!

Пакуль я смяяўся з купцоў, Нясевіч ківаў галавою, задаволены, што насмяшыў мяне, але вока яго коратка-насцярожана касіла на мяне. І я здагадаўся, што ён знарок пацяшае.

Нясевіч пераняў мой позірк і запытаўся:

— А вы не з раёна часам?

— Інжынер з Ланскага ўпраўлення, хадзіў правяраў, як канавы.

— А-а! Я ж бачу, што чалавек з горада.

Нясевіч з палёгкаю ўздыхнуў, паварушыў нагою, паморшчыўся.

— Мяне з-за нагі і на трактар не хацелі пускаць. Таму і баюся, каб не наскочыў хто. Пасяджу, паняньчу яе — і зноў нічога. Я з год дома сядзеў на пенсіі. Са сну выбіўся. Заплюшчу вочы — на трактары па полі баразну вяду, гэтакую роўную, як, можа, яшчэ ні разу і не прааряў. Сніцца мне зямля і поле. Змарнеў я. У Мінск мяне вазілі, у Слуцак — да ўсякіх дактароў. Здаровы, кажуць, на свае гады. Нервеннае гэта, гавораць... Бачу, канец мне будзе. Пайшоў да старшыні і кажу: давай мне трактар. Ён малады мужчына, з інстытута. Праўда, сівы ўжо, як голуб. І паняў ён мяне. Далі мне трактар. Трэці год ужо ару, сею, і хваробы тае як і не было. От толькі нага... Да самай смерці вайна ўсё даганяе. Па аднаму кладзе і кладзе. А жыць хочацца, колькі ні жыві. Ару цяпер поле — і гэтак на яго хочацца вясною глянуць, як урунее яно, што аж сэрца заныe. Усё б, здаецца, аддаў, каб хоць раз глянуць на гэтае поле вясною!

Нясевіч асцярожна ўстаў, ступіў туды-сюды, як мацуючы нагу.

Да мяне ў яго не стала ніякага інтарэсу. Ён ступіў да трактара і толькі тады азірнуўся.

— Дык мо пад'едзеце са мною ў канец поля? Вам на аўтобус?

Я не ведаў, які тут ходзіць аўтобус.

— А, не. На паўстанак вам сюды, — ён махнуў рукою, убок, і я не зразумеў куды, але распытвацца не стаў. Чамусьці хацелася хутчэй пайсці, каб так і не пазнаў ён мяне.

— Ну што ж, як гавораць, бог вам у помач,—сказаў я тое далёкае вясковае, што гаварылі адзін аднаму пры рабоце.

— Дзякуй!

Я ступіў у цемру ад дагарэлага вогнішча і пачуў, як Нясевіч гукнуў:

— Пачакайце! А адкуль вы Толіка майго ведаеце?

Я не азірнуўся, бы не пачуў. Калі адышоўся, каб не відно было мяне з туману, спыніўся.

Нясевіч пастаяў, мабыць, нешта гаварыў сам сабе, бо развёў рукамі ў бакі, потым падышоў да трактара і палез у кабіну.

Лёгка, спраўна завёўся нагрэты матор, леглі два ўперад і адзін назад промні ад фар.

Нясевіч падаў трактар назад, апусціў плугі—і чырвоныя вугольчыкі вогнішча прапалі пад наваротам зямлі.

Я пастаяў яшчэ, паглядзеў услед трактару, як аддалялася, адплывала белае святло ў тумане, пакуль не стала адным лёгкім воблачкам і не прапала зусім. І толькі тады спахапіўся; што чую стук колаў недалёкага цягніка. У тым баку ўставала над туманам лёгкае пасвятленне — вёска. З палёгкаю ўздыхнуў і скора выйшаў на дарогу. Азірнуўся назад, у поле.

Там ужо нічога было не чуваць і не відаць. І на імгненне нейкай зайздрасцю і здзіўленнем Нясевічу, шкадаваннем самога сябе падцяла сэрца — што Нясевіч тут, у полі, прапахлым здароваю вільготнасцю і свежаю раллёю, усім такім знаёмым, чаму дарагую цану і радасць дадзена ведаць і табе.

ГЛЯДЗІМ, РАЗВАЖАЕМ, СПРАЧАЕМСЯ

«Жорсткія гульні» А. Арбузава ў Гомельскім абласным драматычным тэатры

АДРАЗУ ХАЧУ НАЗВАЦЬ сябе асобай прыхільнай. Па-першае, даўно і назаўжды прыхільная да тэатра; па-другое, прыхільная да Арбузава. Можа здацца недарэчным прызнанне ў любві да драматурга сярод радкоў рэцэнзіі на спектакль па яго п'есе, але, што зробіш, — прыхільная... Мне асабліва дарагая найтанчэйшая «атмасфернасць» яго п'ес, якая ўтвараецца не знешнімі аксесуарамі, а нібы зыходзіць непасрэдна з руху душы арбузаўскіх герояў. Дарагая і прывабная арбузаўская тэатральнасць, якая вызначае стыль аўтара, якая «будуе» твор і праглядваецца ў падзеях, у словах, ва ўчынках герояў. І галоўнае, што ўражвае, што ўбіраеш у сябе проста з яго п'ес, гэта інтэлект душы.

Тонкая аўтарская духоўнасць амаль што матэрыяльна адчуваецца ва ўсіх яго творах. Яе цяжка «вынішчыць» нават дрэннай рэжысурай. І таму адкрыцці на арбузаўскіх спектаклях, думаецца, перш за ўсё — адкрыцці духоўныя...

Хаця б таму, што новая п'еса А. Арбузава «Жорсткія гульні» ўпершыню ўбачыла сцэну няпоўны год назад, яе надзённасць — рэч бясспрэчная. Галоўныя героі — нашы дваццацігадовыя сучаснікі. Але п'еса, безумоўна, у сваёй накіраванасці не падпарадкоўваецца ніякім узроставым градацыям, тым больш, што адно з яе «балючых» пытанняў — пытанне духоўнай раз'яднанасці, нават несумяшчальнасці бацькоў і дзяцей. Ідэйная ж плынь п'есы —у пранізлівай патрэбе і пошуках арэчаўлёнага дабра. І таму, зразумела, канфлікт не можа мець лакальны характар, ён выходзіць са сцен маскоўскай кватэры і вымагае адпаведнага дзейснага ўвасаблення.

Аднак глядач заваёўваецца не толькі драматургам, а і рэжысёрам, акцёрамі. Прачытаўшы п'есу «Жорсткія гульні», я ішла на сустрэчу з героямі А. Арбузава ў тэатр. Усё тут, як належыць. (Ледзьве не напісала: расхінулася заслона. Не, заслоны ў гэтым спектаклі не было). Умовы гульні адкрытыя і прапанаваны гледачу адразу: пакой маскоўскай кватэры вокнамі ў двор; вокны ў вокны, як вочы ў вочы, несіметрычныя, жоўтым агнём свецяцца ўпадзіны-вочы суседняга шматпавярховага дома. Тыражаваныя паверхі, памкнёныя ўгору ўсімі сваімі вокнамі. З глыбіні сцэны выходзіць Кай, няспешны, пільны і сабраны... Спектакль пачаўся.

Рэжысёр (В. Бартосік) завастрае праблему несумяшчальнасці бацькоў і дзяцей, і ўсю віну за духоўную беспрытульнасць дзейных асоб ускладае на іх бацькоў. У выніку на гомельскай сцэне мы бачым дом, у якім ніколі не зачыняюцца ўваходныя дзверы; дом, куды прыходзяць людзі і з якога тыя ж людзі ўцякаюць, так сказаць, пад сузіральную бяздзейнасць яго гаспадара. А гаспадар тым часам успамінае, напружана ўспамінае сваё дзяцінства, «лепшае за ўсё на свеце». Героі нібы цешацца сваімі ўласнымі пакутамі. І такая акцёрская «ўстаноўка на пакуты» звужвае, здрабняе канфлікт п'есы, абмяжоўвае яе дзейснасць, ужо не кажучы аб тым, што пакуты самі па сабе не могуць быць прадметам мастацкага разгляду. Толькі ў фінале, зыходзячы з падзейнага раду п'есы, рэжысёр праз герояў даводзіць думку: «Пара быць дарослымі. Кіньце гульні. Кіньце інфантыльнасць. Пара адчуваць сябе аб'ектам гісторыі».

Фінал спектакля пакідае герояў на парозе магчымага духоўнага прасвятлення: зала чакання, дзе ніхто дакладна не ведае, куды павязе яго поезд жыцця.

Вось такой падаецца п'еса ў Гомелі. Чуйная і ўважлівая зала, з яе нечаканымі рэакцыямі (значная частка публікі — моладзь, якая бескампрамісна зазначае любы акцёрскі фальш), дапамагла мне пераканацца, што спектакль, як мастацкая і грамадская з'ява, існуе такім, якім яго ўспрымае глядач. Даверыўшыся калектыўнаму густу гледача, адразу пасля спектакля, «па гарачых слядах», я ўзяла некалькі інтэрв'ю.

Наталля Шыкурова, швачка-матарыстка Гомельскага галантарэйнага аб'яднання:

— Мне, «старой», заўзятай тэатралцы, спектакль спадабаўся. На мой погляд, асноўная думка, якая вельмі аголена, нават жорстка гучыць у спектаклі, — думка аб маральнай і чалавечай адказнасці бацькоў за сваіх дзяцей, за тое, якімі і як яны выпраўляюцца ў жыццё,—вельмі актуальная зараз. Але ў мяне ўзнікае пытанне: чаму так доўга гэтыя «дзетачкі» ва ўсіх сваіх няшчасцях будуць вінаваціць мамачак, татачак, дзядоў і бабуль — пры абсалютнай асабістай бездапаможнасці і непрыстасаванасці? Так яно адбываецца ў спектаклі. А між тым, Арбузаў дае падставы і для іншага тлумачэння душэўнага неспакою яго герояў. Напрыклад, размова паміж Нэляй і Машай. Маша прызнаецца: «Не навучана я каханьню», — і на пытанне Нэлі: «І вас, выходзіць, бацькі не навучылі?» — адказвае: «Дзетдомаўская я». Вось таму мне і здаецца, што ўнутраны духоўны канфлікт герояў неабавязкова павінен зводзіцца да інфантыльнага перабольшвання дзіцячых уражанняў. У спектаклі ж няма дзейснага жадання герояў «прабіць шкарлупіну», вырвацца ў здаровы свет, пад сонейка. Рэжысёр і акцёры паказваюць нам, дастаткова выразна і пераканаўча, вынік: што бывае, калі... І надаюць значна менш увагі маральным пытанням, якія ўзняты Арбузавым. Я прачытала п'есу, і мне здалося так: яна ў аснове сваёй аб тым, як няпроста заўсёды памятаць, што ты чалавек, як няпроста быць добрым, сумленным і справядлівым. На мой погляд, сваёй трактоўкай тэатр некалькі звужвае праблемную аб'ёмнасць твора.

Наталля Глебава, бібліятэкар:

— У п'есах Арбузава мяне больш за ўсё вабяць жаночыя вобразы: і арбузаўская Таня, і Віктоша ў «Казках старога Арбата», і Лідзія Васільеўна ў «Старамоднай камедыі»... Абаянне, розум, прыродная тонкасць, чалавечая бескампраміснасць, якаясь таленавітая жаноцкасць родніць іх (можа, гэта здасца дзіўным, але я менавіта так разумею яго гераінь) з жанчынамі вядомага французскага драматурга Жана Ануя. Я чула меркаванні, быццам Арбузаў у «Жорсткіх гульнях» не тое каб адступіўся ад сябе, але да сябе не падобны. Мне так не здалося. Вось яго Нэля: думаю, на гэтай гераіні засяроджана асноўная сэнсавая нагрузка п'есы. Нэля аднойчы, у непагадзь, трапляе ў маскоўскую кватэру, такая немудрагелістая, такая «не маскоўская», нават некалькі недарэчная побач з Каем, з Мікітам. Але раптам падаецца, што яна ў гэты дом пасланa самім лёсам, каб навесці парадак у душах яго жыхароў. І яна раскрываецца па-чалавечы адметнай, спагадлівай, добрай. Яна ўся ў пошуках дабра, не абстрактнага і адцягненага, а таго, на якім трымаецца наша штодзённае жыццё. Яна спакваля прымушае і Кая, і Мікіту, і Цярэнція, ды і Машу, як кажуць, «вывернуць сябе навыварат», каб смела глянуць на тое, «хто я ёсць». Нібыта вакол Нэлі нейкае магнітнае поле. І ўсе, хто трапляе ў яго, прыцягваюцца чалавечай неўтаймаванасцю гэтай дзяўчыны. Праўда, там-сям я бачыла акцёрскі «перабор», выканаўца (Г. Вевер) не ўсюды арганічна апраўдвае зададзены знешні малюнак ролі, ёсць і непатрэбная мітусня па сцэне. Напэўна, патрэбны больш строгі адбор выразных акцёрскіх сродкаў. Але ў цэлым, у чымсьці галоўным, я прыняла менавіта такую Нэлю.

Між тым, вырашэнне іншых жаночых вобразаў здалося мне спрэчным. Роля Машы ў выкананні Л. Гарбуновай. Актрыса пазбаўляе сваю гераіню абаяння, жаноцкасці. Побач з Мішам, якога вельмі разумна, мякка іграе артыст А. Бычкоў, гэта жанчына выглядае як нешта чужароднае, далёкае ад яго тонкай чалавечай натуры. Здзіўляешся, як ён мог пакахаць гэтую жанчыну? Справа зусім не ў тым, што Маша аддае перавагу не каханню і сям'і, а любімай справе (а потым іншаму мужчыне): хіба гэта значыць, што Маша павінна быць такой адназначнай і халодна-жорсткай? У яе свой боль. У сцэне з Нэляй пасля смерці Мішы яна гаворыць: «Я старая, мне 50 праз дзесяць». І далей: «Не дадало мне жыццё цяпла». Магчыма, тут яе боль, або «комплекс», як цяпер гаворыць, і ад гэтага ўсе яе «гульні»

Нельга не згадзіцца, што гераіні ў Арбузава надзвычай складаныя, супярэчлівыя. Але часам нечаканыя ўчынкі іх заўсёды псіхалагічна апраўданыя, выверанымі драматургам, абумоўленыя жыццём, падзеямі п'есы. У Арбузава заўсёды шмат чаго схавана за тэкстам — можа, і самае галоўнае. У спектаклі ж гамяльчан часта цэлыя сцэны пабудаваны ўлоб, паводле літаральнага разумення тэксту.

Нашу размову працягваюць студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта — філолаг Алена Няменка, эканаміст Аляксандр Аляксееў, геолаг Ігар Левянкоў.

Алена Няменка:

— Мы не зусім звычайныя гледачы. Усе мы ўдзельнікі універсітэцкага студэнцкага тэатра, якім кіруе артыст Аляксей Бычкоў. Наш тэатр таксама ставіць зараз «Жорсткія гульні», таму мы вельмі патрабавальныя суддзі. Ва ўсім хочацца «дайсці да самай сутнасці», усё неяк боязна: раптам чаго не зразумелі, не ўлічылі? Мне спектакль гомельскага тэатра спадабаўся, і ў той жа час здаецца, што яму не хапіла цеплыні, якая прайшла б праз усе падзеі п'есы, стварыла б атмасферу спектакля.

Аляксандр Аляксееў:

— Ведаеце, чым мне спадабалася п'еса? Тым, што ў ёй няма герояў, у якіх усё проста, ясна і лёгка; такіх, якім адразу ва ўсім шанцуе. Дзейных асоб п'есы лёс абмінуў ужо ў тым, што яны зусім не прыстасаваны да жыцця, а значыць, у нейкай меры не прыняты жыццём. І Кай, і Мікіта, і Цярэнцій пакутуюць, але і шукаюць сябе, памыляюцца, але ні на хвіліну не спыняюць барацьбы за сябе.

Ігар Левянкоў:

— Адзіны станоўчы герой у спектаклі — Міша. Ён адзін жыве паўнацэнным, маральна здаровым жыццём — астатнія жывуць, гуляючы. Зусім у спектаклі не раскрыты вобраз Машы. Яна выглядае грубай, і незразумела, за што яе кахае Міша. Спачатку мне спадабаўся Кай (артыст Ю. Фейгін), але ў спектаклі ён не здолеў узняцца над сваёй крыўдай на бацькоў, увесь час раздражнёна выказвае сваю незадаволенасць жыццём і на гэтым спыняецца. У Арбузава ж Кай больш складаны і моцны. А вось артыст В. Беднашэя цікава іграе Мікіту. Яго роля зроблена падрабязна, дакладна і пераканаўча.

(Сапраўды, Мікіта быццам выхаплены акцёрам з натоўпу. Кожная акцёрская «дробязь» агаляе ўсё больш бязлітасна складаны, заблытаны свет героя. У Мікіты — Беднашэі ўсё злоснае, усё кепскае, усё эгаістычнае, як дакор, выстаўлена напаказ. І людзі, натыкаючыся на яго знешнюю грубасць, — цураюцца. А потым другі Мікіта — лепшы, чысцейшы, дабрэйшы, спачатку нясмела, а потым дзёрзка заяўляе аб сабе).

— Наогул, — працягвае размову Ігар, — у спектаклі няма апошняй кропкі. Тэатр прапаноўвае гледачу самому дадумваць «як далей». Можа, гэта і ёсць той штуршок, што ўзбуджае думку? Зараз не прыняты «хэпі энд»...

У спектаклі «Жорсткія гульні» заняты пераважна маладыя акцёры тэатра. Апрача таго, гэта спектакль чатырох дэбютаў: рэжысёра В. Бартосіка, акцёраў Ю. Фейгіна, Г. Вевер, А. Рубцова. Можа, гэта шмат у чым і абумовіла акцёрскую захопленасць і аддачу, якія склалі адзін з дадатных бакоў спектакля. Менавіта маладосць адзначыла яго добры ўнутраны рытм, дынамічнасць развіцця дзеяння, заразлівасць. Разам з гледачамі шчыра скажам тэатру: «У добры час!»

Людміла ГРАМЫКА.

«Жорсткія гульні». Кай (Ю. Фейгін) і Міша Зямцоў (А. Бычкоў).
Фота А. ТРАЦЦЯКОВА.

ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ДВА РАДКІ ПУШКІНА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 7).

Аказваецца, у гэтага верша не просты лёс. Ён напісаны паэтам у Міхайлаўскім у 1819 годзе пасля выхаду з «манастырскіх», як называў ён, ліцэйскіх сцен. Гэты верш, як і ода «Вольность», як мяркуюць пушкіністы, напісаны пад уплывам блізкага знаёмага дзекабрыста М. І. Тургенева, самага гарачага праціўніка прыгонніцкага права. Таму ў ім так моцна, гнеўна, пратэстуюча гучыць антыпрыгонніцкая, свабодалюбівая ідэя:

Здесь барство дикое, без чувства, без закона.
Присвоило себе насильственной лозой
И труд, и собственность, и время земледельца.
Склонясь на чуждый плуг, покорствуя бичам,
Здесь рабство тощее влачится по браздам
Неумолимого владельца.
Здесь тягостный ярем до гроба все влекут...

Калі чутка пра палітычныя рукапісы Пушкіна дайшла да Аляксандра I, ён запатрабаваў іх для прагляду. Не без апаскі, праз Чаадаева, Пушкін паслаў верш у палац. Імператар потым двурушна дзякаваў паэта «за добрые чувства» («и рабство падшее по манию царя»), выказаныя ў ім. Але лёс твора быў надоўга прадвызначаны. Толькі ў 1826 годзе была апублікавана яго першая, лірычная палова пад назвай «Уединение», а другая частка, пачынаючы са слоў «но мысль ужасная здесь душу омрачает», была цалкам апушчана — амаль 30 радкоў. Паэт замяніў іх радкамі шматкроп'я, намякаючы чытачу, што ў рукапісу ёсць працяг.

Вось які верш А. С. Пушкіна знайшлі ў Оршы. Поўны, нецэнзураваны і пад сапраўднай назвай — «Деревня». Па коснай думцы царскіх служак — «крамольны» і «недазволены». У гэтых жа радках паэт гнеўна бічаваў прыгонніцтва, і гэтыя радкі, як лічыць аўтар знаходкі, былі цалкам сугучны настроям маладых членаў віцебскай арганізацыі і, асабліва, тых, хто забяспечыў вершам аршанскага настаўніка. Лубкін на допытах так і не назваў прозвішча асобы, якая перадала яму гэты спіс твора. З запісак царскай следчай камісіі відаць, што генерал-губернатар Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерань загадаў «далучыць да справы і рускія вершы пад назвай «Деревня». Далучыць творчасць паэта, як рэчавы доказ!

Пакуль невядома, колькі чалавек да арышту Лубкіна паспелі ў Оршы прачытаць поўны тэкст «Деревни», але што многія — можна не сумнявацца. Яго чыталі, запаміналі. Трэба меркаваць, што ў настаўніка ў горадзе і, магчыма, у Віцебску былі аднадумцы і сябры, з якімі на час дзяліўся сваім каштоўным спісам.

Доўгі ж час, нават пасля 1833 года, другая палова твора для масавага рускага чытача была недаступная.

Дакументамі Дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР У. Пасэ прыадкрыў нам невядомыя старонкі гісторыі, выявіў адзін з ранніх шляхоў пранікнення ў Беларусь вершаў песняра «вольности святой», сябра дзекабрыстаў.

Застаецца толькі паведаміць, што ўдалося цяпер даведацца пра далейшы лёс Аляксандра Лубкіна, сувязнога тайнай арганізацыі, прыхільніка творчасці Пушкіна, якую ён выкарыстаў для рэвалюцыйнай справы. З архіўнага матэрыялу відаць, што пакольки следчым, нягледзячы на ўсе іх намаганні, не ўдалося ўстанавіць факт прамой прыналежнасці настаўніка да тайнай арганізацыі, Лубкін быў аддадзены «пад тайны нагляд» па месцы жыхарства. Вока аршанскай паліцыі сачыла за ім нястомна. Павятовы паштмайстар атрымаў заданне перлюстраваць усю яго перапіску, усё падазронае забіраць і дастаўляць «куды трэба». Лубкіна неадкладна звольнілі з пасады настаўніка. Больш ніякіх дакументаў пра яго няма.

Вось што прыадкрылася ў гэтай гісторыі з рукапісным спісам верша «Деревня» з 62 радкоў. Такая, хаця і невялікая, старонка Пушкініяны. Накіраваныя супраць самадзяржаўя і прыгоннага права, радкі Пушкіна ўжо больш чым 150 гадоў назад, яшчэ пры яго жыцці, знаходзілі ў Беларусі ўдзячнага чытача.

С. РАТГАУЗ.

ВЯСНА МАСТАЦТВА

З II Усесаюзнага фестывалю творчай моладзі тэатраў оперы і балета

Стосік рэкламных матэрыялаў, фотаздымкі і праграмы, пульхны ад запісаў рэпарцёрскі блакнот — такі напамінак пакінуў на журналісцкім стале фестываль. Тут і апублікаваная ўжо інфармацыя, і накіды будучых размоў з чытачом, і крыніца вось гэтых, цяперашніх радкоў.

Няма, відаць, патрэбы паўтараць сказанае пра фестываль раней. Хіба што згадаць яго кароткую статыстычную характарыстыку: каля паўтараста ўдзельнікаў з 38-мі творчых калектываў (усяго ў краіне 46 тэатраў оперы і балета), больш чым 10 спектакляў, 19 канцэртаў-сустрэч з насельніцтвам Мінска і вобласці. Не трэба, напэўна, і падрабязна аглядаць работу ўдзельнікаў форуму. Няхай наша ўяўнае вяртанне ў сёлетні шчодры на сонца май і падсумуе фестывальныя ўражанні.

ПАДМУРАК — аснова будынка; падмурак усякага свята — гэта яго падрыхтоўка і арганізацыя. Таму, адшукаўшы ў каляндарным плане пачатковы дзень фестывалю, зробім папраўку хаця б на тыдзень. Задумаемся, які складаны і капрызны механізм схаваны за парадным фасадам фестывалю.

Давялося мне прысутнічаць на першым сходзе мінскай групы аргкамітэта. Нават не ўнікаючы ў хітрасці фестывальнай «кухні», можна здагадацца, якая гарачая работа там разгарнулася. Зацвердзіць расклады рэпетыцый і ўрокаў, распрацаваць сцэнарый кожнага дня, забяспечыць усіх прыезджых выканаўцаў дублёрамі з нашага тэатра, дамовіцца са стэнаграфісткамі, запрасіць вядучых на выязныя канцэрты, знайсці дадатковыя рабочыя рукі — адладзіць дакладную работу пастановачнага цэха. Яшчэ — прызначыць службу інфармацыі, агранізаваць спецыяльны транспартны маршрут, паклапаціцца пра гасцініцу, харчаванне, білеты на ад'езд, падрыхтаваць рэкламныя матэрыялы, аформіць пасвяточнаму тэатральны будынак... Карацей кажучы — забяспечыць умовы для творчасці, стварыць атмасферу гасціннасці.

Не нам, гаспадарам, меркаваць, наколькі гэта ўдалося. Але прыемна было, напрыклад, заходзіць па даведку ў штаб—са стомленымі спёкай, мітуснёй, бяссоніцай, але жыццярадаснымі і прыветнымі дзяжурнымі, іх уважлівым і далікатным «камандзірам» — намеснікам дырэктара тэатра В. Мельнікавым. Прыемна было ў час філарманічнага канцэрта-адкрыцця заўважыць за кулісамі падрыхтаваны для артыстаў клапатліваю рукою чайны столік з самаварам...

ДАРЭЧЫ, той канцэрт адметны першымі фестывальнымі знаёмствамі. Зрэшты, так званае афіцыйнае знаёмства дэлегатаў і гаспадароў адбылося ўранні, на агульным сходзе ў канферэнц-зале тэатра. Удзень госці сустрэліся з гарадскім кіраўніцтвам; наведалі святочныя мясціны Мінска: помнік У. І. Леніну, плошчу Перамогі, усклалі кветкі да манументаў. А потым — два ўрачыстыя канцэрты (у філармоніі, у Палацы культуры МАЗа) і оперны спектакль.

У наэлектрызаванай хваляваннем атмасферы філарманічнага закулісся — першыя «вішую», першыя поціскі рук. Першае інтэрв'ю. Праўда, для харкаўчанкі І. Яцэнка гэтае інтэрв'ю было адносна першае. Яна ўжо дзялілася думкамі аб фестывалі... тры гады назад. З часу мінулага прыезду ў Мінск маладая спявачка многае паспела: выступіла з вядучымі мецца-сапранавымі партыямі на тэатральных сцэнах Вільнюса, Ленінграда, Адэсы, Арджанікідзе, Тбілісі, Масквы, часта ўдзельнічала ў канцэртах — вось што значыць заявіла аб сабе на Усесаюзным фестывалі.

— Добра, — гаварыла Ірына, — калі артыст атрымлівае такую магчымасць не сядзець на месцы: тады і сам у належным тонусе, і дае карысць калегам, з якімі працуе, бо, вярнуўшыся ў калектыў, абменьваецца свежым вопытам. Зноў прыехаць у Мінск было цікава і таму, што за беларускай операй я сачу, да гэтага часу пад уражаннем работы С. Данілюк і А. Дзедзіка ў «Лаэнгрыне». А калі артыста памятаеш яшчэ студэнтам (з Аляксандрам мы вучыліся ў Адэскай кансерваторыі), яго поспех асабліва радасны і блізкі.

ЯКРАЗ назаўтра ў гасцінай тэатра абмяркоўвалі новую работу А. Дзедзіка — дон Карлас. Дакладней, абмяркоўвалася работа артыстычнай моладзі Беларусі ў новым спектаклі. Гаспадары фестывалю мелі, як кажуць, фору: прадставіць тут розныя творчыя спецыяльнасці. Акрамя оперных салістаў — рэжысёра-пастаноўшчыка (М. Ізворска-Елізар'ева), хормайстра (Н. Ламановіч).

Для М. Ізворска-Елізар'евай «Дон Карлас» — мінскі дэбют: раней яна асісціравала рэжысёру Б. Шрэтэру ў «Лаэнгрыне», а таксама мела 2 самастойныя пастаноўкі ў тэатрах Бургаса і Плоўдзіва. Праца над сцэнічным увасабленнем музыкі Дж. Вердзі сама па сабе асалода. Для Маргарыты яна спалучалася з радасцю творчых кантактаў. Калі фестываль быў у разгары, прэм'ерныя хваляванні маладой пастаноўшчыцы адступілі перад турботамі за спектаклі «чужыя». Ей было даручана ўвесці ўдзельнікаў фестывалю ў шэраг незнаёмых ім мінскіх спектакляў. Спецыялісты лічаць немагчымым за 2 рэпетыцыі, не парушыўшы пастановачнай задумы, стварыць арганічны ансамбль малазнаёмых партнёраў. Але маладзёжны форум робіць стаўку на неверагоднае, на адкрыццё, на цуд, імкнуцца да якога — трэба!.. Як ні занятая была Маргарыта, хвілінку знайшла, каб згадаць работу над операй Дж. Вердзі.

— Асабліва цікава і не так цяжка працаваць, калі адчуваеш побач падтрымку і ўзаемаразуменне. «Дон Карлас» дарагі для мяне садружнасцю са сталымі майстрамі, такімі, як дырыжор Я. Вашчак, салісты І. Сарокін, А. Саўчанка, С. Данілюк, А. Дзедзік, В. Чарнабаеў, і яшчэ тым, што поруч — таленавітая, спагадлівая моладзь.

МАЛАДОСЦЬ на сцэне — гэта радасна. Сёння колькасць моладзі ў калектывах музычных тэатраў краіны набліжаецца амаль да паловы. Ад таго, як будзе фарміравацца грамадзянскі, маральны і, зразумела, прафесійны воблік сённяшняга маладога акцёра, залежыць ідэйна-эстэтычнае аблічча нашага заўтрашняга мастацтва. Нездарма праводзілася трохдзённая навукова-практычная канферэнцыя «Музычны тэатр і сучаснасць», на працягу якой прамоўцы выказваліся, раіліся, спрачаліся па пытаннях «Музычны тэатр і маральнае выхаванне», «Мастацтва і культура ў грамадстве развітога сацыялізму», «Мастак і час»; вяліся гутаркі за «круглым сталом» пра спецыфіку розных творчых прафесій музычнага тэатра. Дзяліліся думкамі сталыя тэарэтыкі і практыкі мастацтва Г. Ансімаў, Э. Бачарнікава, І. Зак, А. Зісь, А. Ладыгіна, І. Пятроў, Ю. Чурко, Т. Шчарбакова, М. Эльяш, Н. Ястрабава і інш.

Шкада, канечне, што насычаны графік не заўсёды дазваляў далучацца творчай моладзі да дзелавых размоў. Але з самага пачатку на фестывалі вылучылася група найбольш сур'ёзных, удумлівых, творча актыўных артыстаў, якія не марнавалі і вольную часіну, не зводзілі сваю місію да дэманстрацыі ўласных дасягненняў і ацэнкі магчымасцей калег. Калі фестываль увогуле не толькі ўрачыстасць кветак і гарачыня воплескаў, а і праца ў складаных, неспадзяваных умовах, пастаянная настроенасць на ўзаемавыручку, дык для няўрымслівых натур — гэта «мае універсітэты».

УЯВІМ звычайны, тыповы дзень фестывалю. Ранішняй веснавой гадзінай ажываў белы палац на Траецкай гары. Вокны расчынены — разносіўся звонкі фартэпіянны акампанемент, рытмічны голас рэпетытара. Гэта на 5-ым паверсе: там, дзе месціцца частка майстэрань вытворчага камбіната, дзе на калідоры адчуваецца спецыфічны пах сталярнага клею, а з-за дзвярэй часам чуецца пастукванне шавецкага малатка,— там знаходзіцца балетная зала. Штодня тут для жадаючых праводзіла ўрокі па славутай сістэме А. Месэрэра вядомая балерына, заслужаная артыстка РСФСР І. Ціхамірнава. У оперных класах пачыналіся спеўкі, на сцэне праходзіла аркестравая рэпетыцыя чарговага спектакля. Многія вольныя ад спевак і рэпетыцый артысты завітвалі ў залу—як на ўрок. Паболей глядзець і слухаць — цудоўны прафесійны трэнаж! Працягваўся «ўрок» у тэатральнай гасцінай, калі гаварылі пра спектакль мінулага вечара. Гаворка вялася ў прысутнасці не толькі тых салістаў і дырыжораў, каму яна непасрэдна адрасавалася. Бо іншым таксама цікава было, наведаўшы спектакль, назаўтра зверыць свае ўражанні са стороннімі меркаваннямі.

Аднадушна ці ў палеміцы, строга ці паблажліва ацэньваліся работы маладых, заўсёды яны маглі прыняць да ведама дакладную заўвагу, трапную прафесійную параду. З імі і аб іх гаварылі выдатныя спевакі Н. Шпілер, І. Пятроў, дырыжоры Я. Вашчак, Ю. Волгін, І. Зак, музыказнаўцы Т. Карышава, М. Савінаў, М. Чурава, спецыялісты ў харэаграфіі Э. Бачарнікава, М. Кляймёнава, М. Эльяш. Мала таго: калі ў тэатры наставала «мёртвая гадзіна», калі ў паўпрыцемненым фае драмаў сфінкс — на жывапісных эскізах мастака таджыкскага тэатра оперы і балета З. Сабірава да «Аіды»; калі, зайшоўшы ў партэр, можна было слухаць дзівосную, «ватную» цішыню апусцелай залы, — урок працягваўся. У фестывальны расклад былі ўключаны кансультацыі прафесароў Н. Шпілер і І. Пятрова для вакалістаў.

Добрай школай былі, вядома, самі спектаклі: вучоба і на ўласным, і на чужым вопыце. Спектаклі — гэта і эмацыянальная кульмінацыя фестывалю. Не парад імянітай моладзі (а былі тут лаўрэаты, заслужаныя артысты) — выяўленне новых талентаў. Мінулы форум пазнаёміў нас з вядомымі цяпер А. Варашылай, Л. Шамчук. А сёлетні? І ён багаты на цікавыя знаёмствы. Народны артыст СССР І. Пятроў ахвотна гэта пацвердзіў:

— На фестываль я прыехаў з вялікім задавальненнем: тут сустрэліся прадстаўнікі ледзьве не ўсіх тэатраў краіны. У наш час нічога падобнага не праводзілася, а гэта ж вельмі важная форма работы з маладымі: вымушае падцягнуцца, «пачысціць» свае партыі. Прыемнае ўражанне пакінуў спектакль мінчан «Дон Карлас». Парадаваў А. Дзедзік: параўнальна з тым, калі слухаў яго на конкурсе, голас артыста пабагацеў на цёплыя, мяккія фарбы. Спадабаліся даволі моцныя і яркія вакальныя дадзеныя Я. Пятрова, якому я з задавальненнем даў пэўныя прафесійныя парады. Добра выступіла ў партыі каралевы ўладальніца прыгожага голасу Н. Казлова. З іншых спектакляў запомніліся сваім удумлівым стаўленнем да вобраза Анегіна масквіч І. Марозаў, тбіліская спявачка Л. Калмахелідзе, якая экспромтам, нечакана выступіла на мінскай сцэне ў партыі Джыльды; сцэнічнай культурай, адчуваннем моцартаўскага стылю вылучылася ў «Дон Жуане» рыжанка Л. Грэйдане, а яе партнёры днепрапятровец В. Наўроцкі (Жуан) і ленінградзец У. Панкратаў (Лепарэла) уразілі арганічным ансамблем, «зробленасцю» вакальных партый. Спадзяюся на яркую будучыню тбілісца А. Хамерыкі (Вадэмон у «Іяланце»), захапляюся рэдкім прыродным голасам чэбаксарскай артысткі А. Зіннінай (Тоска).

ПРА АДНЫХ гаварылі: «з будучыняй», пра другіх «амаль сфарміраваны майстра». А вось імя Э. Брахмане (Рыга), якая выступіла ў «Травіяце», трапіла ў цэнтр фестывальных размоў. Перад яе Віялетай схілілі голаў усе аўтарытэтныя слухачы. Не спявала, не іграла — яна жыла ў оперы... Нават партнёры па сцэне не маглі схаваць захаплення: мінчанін В. Скарабагатаў (Жэрмон) у дуэце з Элгай здаваўся па-акцёрску шчырэйшым, чым у сольных нумарах, хаця і ўвогуле яго выступленне спецыялісты ацанілі высока. Потым стала вядома, што Э. Брахмане — не толькі музыкант, а яшчэ мае вышэйшую матэматычную адукацыю... Тут успамінаюцца яшчэ два цікавыя лёсы.

Віктар Скарабагатаў і Элга Брахмане ў «Травіяце».

Сцэну з балета «Дон Кіхот» выконваюць Санія Куртасманава і заслужаны артыст РСФСР Анатоль Галавань (г. Варонеж).

Ірына Яцэнка.

Самым маладым удзельнікам фестывалю сярод дырыжораў быў М. Карндорф — студэнт кансерваторыі (Масква). Спектакль «Князь Ігар» стаў яго дзяржаўным экзаменам па спецыяльнасці. І прапанаваць сваю, нетрадыцыйную, але пераканальную трактоўку хрэстаматыйнай партытуры Мікалай, відаць, меў права: раней ён скончыў кансерваторыю як кампазітар і здольны пранікаць у тонкасці нотнага тэксту вокам чалавека, які сам піша музыку. Пра дырыжора А. Лаўранюка, які вёў «Жызэль», коратка можна сказаць: вучыўся на скрыпцы; неблагі піяніст; скончыў харэаграфічнае вучылішча; сёлета завяршае сваё сцэнічнае жыццё як саліст Вялікага тэатра Саюза ССР (ён — заслужаны артыст РСФСР); у ГІТІСе набыў спецыяльнасць балетмайстра-педагога; пачынае выступаць як дырыжор спектакляў (кажуць, гэта трэці выпадак за ўсю гісторыю рускага балета).

Параўнальна з оперными спектаклямі, балета на фестывалі было значна менш. І ўсё ж у сціслай праграме знайшлося нямала прыцягальнага для аматараў і знаўцаў гэтага жанру: цудоўная мініяцюра на музыку С. Рахманінава па матывах «Брыдкага качаняці» ў выкананні лаўрэата Міжнароднага конкурсу М. Лявонькінай, выпускніцы самага маладога ў краіне Варонежскага вучылішча; афарбаваная нацыянальным каларытам харэаграфічная стылістыка балетмайстра А. Папова (Якуцк); свежая, дасціпная «мова» ленінградскага балетмайстра Д. Бранцава; прэм'ера «Адажыета» Г. Малера ў пастаноўцы мінчаніна В. Елізар'ева; выступленні маладых гаспадароў фестывалю І. Душкевіч, І. Моўчана, Т. Яршовай...

Доўга яшчэ ўражанні фестывалю будуць жывіць творчы настрой яго ўдзельнікаў. Яго водгулле будзе жывіць роздум спецыялістаў, выступленні крытыкаў, бо ў вялікіх і складаных фестывальных справах акрэсліўся шэраг арганізацыйных і творчых праблем, над якімі трэба і трэба думаць...

Згадаем дэвіз веснавога музычнага свята: «Мастацтва, праца, народ, маладосць, натхненне!» І скажам: «Да пабачэння, фестываль!».

С. БЕРАСЦЕНЬ.

Рэжысёр Маргарыта Ізворска-Елізар'ева і заслужаны артыст БССР Аляксандр Дзедзік.

Пра гульні ўсур'ёз...

АГУЛЬНАВЯДОМЫ факт, што тэлебачанне адыгрывае велізарную ролю ў фарміраванні асобы дзіцяці. Ад 500 да 1000 гадзін штогод, г. зн. амаль столькі ж часу, колькі школьнікі праводзяць за партай, яны аддаюць тэлевізару. Тэлебачанне — гэта своеасаблівае акно ў свет — стала для іх захапленнем № 1. Аб'ектам захапленняў, а часам і «бяздумнага глядзення» для падлеткаў і юнацтва становяцца часцей за ўсё «дарослыя» тэлеперадачы. А праграмы, спецыяльна для іх прызначаныя, часам праходзяць міма ўвагі юнага гледача. І здараецца так: прайшла перадача, на яе былі затрачаны намаганні мноства людзей — рэдактараў, рэжысёраў, інжынераў, аператараў, працавала складанейшая тэхніка, — а ў рэдакцыі ніводнага водгуку. Чаму? А таму, што кантакту з гледачом не адбылося.

Перадачы дзіцячай рэдакцыі БТ можна падзяліць на 2 групы: «сур'ёзныя» (маюцца на ўвазе такія тэлевізійныя жанры, як дыспут, гутарка, дыскусія — традыцыйныя па форме і змесце) і перадачы-гульні.

У форме гульні-конкурсу пабудаваны цыклы: «Вас выклікае Спартландыя», «Ваша слова, эрудыты», «Чырвоныя гваздзікі». Мы не выпадкова пачалі размову менавіта з гэтых перадач, таму што яны з'яўляюцца гонарам рэдакцыі, своеасаблівым яе стрыжнем.

Абудзіць цікавасць да навукі, дапамагчы развіць інтэлект сучаснага школьніка — мэта турніра старшакласнікаў «Ваша слова, эрудыты» (рэдактар Л. Ротмілеў, рэжысёры Л. Тарасава, А. Варэнік). Задача яго — уцягнуць школьнікаў у сур'ёзныя заняткі навукамі і мастацтвам, дапамагчы набываць веды і навыкі, прымяняць іх у практычнай дзейнасці. Удала знойдзеная форма перадачы — конкурс — вызначае яе поспех. Паток заданняў выводзіць тэлевізійнае дзеянне за межы экрана, выклікае жаданне тварыць, думаць. Тэлебачанне становіцца, такім чынам, каталізатарам творчай актыўнасці тысячнай дзіцячай аўдыторыі і дапаўняе выхаванне, якое вядзецца ў школе і сям'і.

Тэлеконкурс юных спевакоў «Чырвоныя гваздзікі» (рэдактар Ю. Савін, рэжысёр В. Руцкая) таксама адзін з самых папулярных цыклаў. Песня патрыятычная, піянерская, народная далучае школьнікаў да цудоўнага. Перадача афарбавана аўтарскімі адносінамі да яе. Камеры рухомыя, «жывыя», яны «падхопліваюць» нюансы настрою.

Па такім жа прынцыпе захапляючай гульні - конкурсу будуецца і новы цыкл перадач «Адрас сябра» (рэдактар Б. Герстан, рэжысёр В. Руцкая). Тэлевізійныя падарожжы па краіне даюць магчымасць даведвацца аб традыцыях і звычаях, аб радасным дзяцінстве сяброў з розных рэспублік. Аднак жывая, захапляючая форма яе крыху бляднее, калі ў перадачы з'яўляюцца нумары мастацкай самадзейнасці. Хаця яны і арганізаваны сюжэтна, але ўсё ж парушаюць цэласнасць успрымання. Было б, відаць, цікава і гледачам, і ўдзельнікам гульні, каб своеасаблівым конкурсам у конкурсе стала выкананне песень, танцаў самімі яго ўдзельнікамі.

Працягваецца на рэспубліканскім тэлебачанні папулярны тэлеконкурс «Вас выклікае Спартландыя» па дзіцячых рухомых гульнях (рэдактар Н. Шоба, рэжысёр К. Яўлампіеў). 13-ты год існуе гэты цыкл. Поспех яго, як і папярэдніх перадач, у самім прынцыпе арганізацыі. Гэта таксама гульня. «Спартландыя» стала настолькі папулярнай у Беларусі, што нарадзіўся цэлы «спартландскі» рух.

І сама гульня можа мець розную форму. Своеасаблівым конкурсам малюнкаў з персанажам - вядучым можна назваць перадачу «Сем колераў радасці» (рэдактар Ю. Савін, рэжысёр Т. Кіракозава). У ёй праяўляюцца творчыя сілы школьнікаў, іх зацікаўленасць, актыўнасць. Таму з такім задавальненнем яны пішуць у рэдакцыю, дасылаюць свае шматлікія малюнкі.

Своеасаблівая завочная гульня — перадача «Сто тысяч чаму». Усе дзеці малодшага ўзросту — актыўныя «чамучкі». У рэдакцыю яны дасылаюць самыя разнастайныя пытанні. І арганізаваць адказы на іх весела, цікава — задача рэдактара (Т. Сянкевіч) і рэжысёра (Т. Кіракозава), чаго яны і дамагаюцца, калі з юнымі гледачамі па-добраму, шчыра гутарыць дзядуля Цік-Так. Але вось гэтую ж перадачу сталі глядзець старэйшыя школьнікі. Памяняўся адрас і, натуральна, змянілася і форма (рэжысёр В. Разянек). У кадры вядучы У. Бойка са спецыялістамі розных галін ведаў вядзе дыялог са школьнікамі. Мы не будзем гаварыць цяпер пра функцыі вядучага ў гэтай перадачы: гэта прадмет асобнай гаворкі. Хочацца толькі адзначыць, што часам аўтары спалучаюць вельмі разнародныя элементы тэлегутаркі, атрымліваецца нейкі «тэлевінегрэт».

Цікавасць дзяцей да названых перадач заканамерная, таму што, паўтараем, прынцып гульні, які ляжыць у іх аснове, плюс творчая выдумка і аўтарская зацікаўленасць вызначаюць іх поспех.

Так званыя «сур'ёзныя» перадачы таксама становяцца аб'ектам гарачых спрэчак, дыскусій. Вось, да прыкладу, цыкл перадач для старшакласнікаў «У пятніцу пасля ўрокаў».

«...Перадача павучальная, — піша вучаніца 10 класа з Гомеля пра гэты тэлевізійны дыскусійны клуб. — Я не проста яе глядзела, але і разважала, адказвала сама сабе на вашы пытанні, якія прымушаюць задумацца». У перадачы вырашаюцца, у асноўным, задачы маральнага выхавання. Навучыць школьнікаў думаць, абудзіць патрэбу ў ведах, выпрацаваць актыўную жыццёвую пазіцыю — мэта гэтага цыкла. У рабоце тэлеклуба прымаюць удзел педагогі, партыйныя і камсамольскія работнікі, заслужаныя людзі рэспублікі. Тэмы мінулых дыскусій: «Хто ты ў сям'і», «Грамадзянінам быць абавязаны», «Захопленасць і захапленне», «Ці ўмееш ты адпачываць» гавораць пра тое, што ў тэлеклубе вядзецца праблемная, зацікаўленая размова.

Кантакт са сваёй аўдыторыяй наладзілі і стваральнікі цыкла «Юнацтва ў дарозе», які асвятляе ідэйна - палітычнае, працоўнае і маральнае выхаванне школьнікаў. І хаця поспех гэтых цыклаў (шкада, што ў апошні час яны зніклі з тэлеэкрана) — ва ўменні іх стваральнікаў заваяваць свайго гледача, «праграміраваць» яго інтарэсы, але ўсё ж часам гэтыя перадачы дубліруюць адна адну. Быць можа, ёсць сэнс звесці іх у адну праграму? Амаль тое ж самае можна сказаць і пра наступныя два цыклы.

Расказаць, як гісторыя Радзімы праламляецца ў лёсах сучаснікаў, паказаць працавітасць, стойкасць, багаты духоўны свет старэйшага пакалення, — такія задачы стаяць перад аўтарамі цыкла «З аднаго металу льюць медаль за бой, медаль за працу» (рэдактар Н. Шоба). Гэта хвалюючае тэлеапавяданне пра тых, хто інтарэсы грамадства разумее як свае кроўныя, хто ў кожнай справе змог раскрыцца як яркая, непаўторная асоба. Працоўныя і баявыя подзвігі такіх людзей, як сталявар Р. Барашкін, былы камандзір партызанскага атрада «Іскра», цяпер будаўнік І. Нікалаеў, шафёр-выпрабавальнік МАЗа К. Паўлянковіч, піянерважатая В. Кляцко, ткачыха З. Кіжнерава і інш. — яркія прыклады ідэалу савецкага чалавека. Форма апавядання пра такіх людзей розная: гэта і прэс-канферэнцыя, і камсамольскі сход, і ўрачысты збор, дзе школьнікі непасрэдна звяртаюцца з пытаннямі да герояў перадач. Узнікае той неабходны кантакт удзельнікаў сустрэчы, тыя «жывыя» зносіны, якія і робяць цыкл цікавым. Але бывае і інакш, калі расказ будуецца як нарысавая перадача, і каментарый вядзецца за кадрам. І ў гэтым выпадку, думаецца, неабходна знайсці дакладную, ненадакучлівую інтанацыю апавядання. Бывае ж, што матэрыял добра зняты і цікава зманціраваны, а вось мова перадачы невыразная, інтанацыі павучальныя, дыдактычныя. І расказ пра незвычайную чалавечую асобу ператвараецца ў размову аб прафесіі, як, да прыкладу, у нядаўняй перадачы пра ткачыху В. Федуковіч.

Вядома, гэта таксама важна, але ж існуе ў праграме рэспубліканскага тэлебачання для дзяцей цыкл «Ёсць такая прафесія» (рэдактар Л. Ротмілеў, рэжысёры В. Разянек і А. Варэнік), дзе сістэматычна вядзецца расказ пра самыя розныя прафесіі, спецыялісты якіх сёння патрэбны гаспадарцы рэспублікі. І тут вельмі важна не ператварыць гэтую перадачу ў даведачна - інфармацыйнае бюро. Даць жа максімум інфармацыі па прафарыентацыі — гэта паўсправы, важна паказаць шлях чалавека да прафесіі, складанасці, якія сустракаюцца на гэтым шляху. А гэта якраз і робіцца ў папярэднім цыкле. І зноў паўстае тая ж думка пра падабенства, паўгараемасць. Вялікая колькасць рубрык не з'яўляецца гарантыяй высокай якасці тэлеперадач. Хутчэй за ўсё тут сувязь адваротная. Гэта зусім не значыць, што неабходна звужваць, кола тэм, хутчэй наадварот, дыяпазон інтарэсаў у юнага гледача практычна бязмежны, але рабіць гэта трэба разумна, каб не было «сумных», падобных, як семкі ў сланечніку, тэлеперадач.

Вось з'явіўся новы цыкл «Родная школа» — расказ пра лепшыя школы рэспублікі, іх традыцыі. Аднак жа нельга тут абысціся без абмеркавання тых праблем, якія ўзнімаюцца ў тэлечасопісе «Спявайце, горны». І — зноў дубліраванне.

Больш падрабязна хацелася б спыніцца на перадачы «Спявайце, горны» і паспрабаваць вызначыць, у чым крыецца прычына неўспрымання гледачамі матэрыялаў гэтага тэлечасопіса. Аўтараў яго (рэдактар Т. Сяменчанка, рэжысёр А. Варэнік) нельга папракнуць у адсутнасці фантазіі. Яны імкнуцца ператварыць гэтую перадачу на піянерскую тэму у тэлевідовішча, шукаюць новыя тэмы. Вось прайшоў цыкл перадач «Вучыся вучыцца». Вядомыя педагогі рэспублікі на канкрэтных прыкладах дапамагалі юным гледачам асвойваць розныя школьныя дысцыпліны, упарадкоўваць свой рабочы дзень. Пры ўсім тым, што форма гэтага цыкла была самая традыцыйная, актуальнасць тэмы вызначыла яго поспех. Вялікую глядзельную цікавасць выклікала і перадача «Выхоўваць музыкай». Але пры ўсіх станоўчых момантах работа над тэлечасопісам няўдзячная. Не глядзяць яе піянеры. Быць можа, уся справа ў той самай «злашчаснай» форме? Вось жа на Ленінградскім ТБ гэтая піянерская тэма носіць форму не традыцыйнага часопіса, а форму тэлегульні «Адзін за ўсіх, усе за аднаго». І вялікая колькасць пісем пацвярджае дакладнасць і эфектыўнасць знойдзенай формы, а сама перадача заваявала права перайсці з Ленінградскага ТБ на ўсесаюзнае.

Быць можа, і нашай дзіцячай рэдакцыі варта выкарыстаць вопыт сваіх калег і арганізаваць, напрыклад, тэлеконкурс на лепшы піянерскі атрад? Мы ж гаварылі ў пачатку пра эфектыўнасць тых перадач, у якіх не ігнаруецца прынцып гульні. Але, думаецца, нават такі падыход не вырашыць гэтай праблемы поўнасцю. Не сакрэт жа, што сучасных піянераў хутчэй за ўсё цікавяць больш «глабальныя» тэмы, чым традыцыйныя пытанні піянерскай атрыбутыкі.

На жаль, не ўсе перадачы ўлічваюць асаблівасці ўспрымання дзіцячай аўдыторыі. У многіх пераважае апісальнасць. Думаецца, што больш прадуктыўна трэба выкарыстоўваць форму конкурсу. Можна ж наладзіць і конкурс тых жа прафесій, і тады сухі, інфармацыйны стыль расказу зменіцца іншай, ненадакучлівай зацікаўленай інтанацыяй. Ды і форма тэлечасопіса ўжо састарэла, таму што тэхнічныя сродкі тэлебачання даюць сёння большыя магчымасці. Іншая справа, што не заўсёды ўдаецца абысціся без гэтай формы: няспынны паток інфармацыі захліствае, яго трэба хутка арганізаваць, вось і звяртаецца рэдактар да апрабаваных, надзейных спосабаў яе падачы.

Мяне могуць папракнуць у павучальнасці: маўляў, фармуляваць, падказваць — проста, а рэалізаваць гэта кожны раз практычна — не так лёгка. Усё гэта, вядома, правільна. І ніхто не адмаўляе, што рабіць перадачы для дзяцей больш складана, чым для дарослых. Толькі ж не павінна атрымлівацца так, каб захапляючая форма, знойдзеная аднойчы, рабілася шаблонам. Яна павінна быць хутчэй адпраўным пунктам для новых пошукаў і, вядома, знаходак.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

АБМЯРКОЎВАЕМ АРТЫКУЛ «СПЫНІЦЕ МАГІЛЬНАГА!»

АРТЫКУЛ М. ЗАМСКАГА, а затым і выступленні аўтараў у дыскусіі сведчаць аб тым, што ўзнятая тэма вельмі цікавая. Адначасова дыскусія закранае работу шэрагу ўстаноў, і ў першую чаргу музеяў.

Асноўным, думаецца, пытаннем, якое пастаўлена ў газеце, з'яўляецца пытанне аб калекцыяніраванні, аб зборы помнікаў матэрыяльнай культуры. Так, цяпер гэта стала вельмі распаўсюджаным заняткам. Сацыялістычнае грамадства ўсё робіць для таго, каб чалавек мог развівацца ўсебакова, пашыраць свой кругагляд, з цікавасцю і карысцю праводзіць вольны час. Інтарэсы ў людзей, вядома, розныя. Адны любяць нешта майстраваць, займацца вынаходніцтвам, другія — паляваннем і рыбнай лоўляй, трэція — вышыўкай, маляваннем, музыкай, фотасправай, чацвёртыя — збіраюць прадметы народнага мастацтва.

У апошні час прыкметна ўзрасла цікавасць менавіта да гэтых прадметаў. Ганчарныя і драўляныя рэчы, каваныя прадметы з металу, разнастайныя тканыя і вышываныя вырабы, прадметы з саломкі і лазы і г. д. ствараліся ў свой час таму, што яны былі патрэбны ў паўсядзённым жыцці, а не як мастацкія творы. Але адначасова людзі працы ўкладвалі ў гэтыя прадметы свае творчыя імкненні, асаблівае мастацкае спасціжэнне свету. І таму яны з'яўляюцца цудоўным спалучэннем рамяства і мастацтва, мастацтва народнага, якое дае невычарпальную крыніцу прафесіяналізму.

А цяпер пра самое збіральніцтва. Адразу ж скажу — гаворка пойдзе аб прадметах музейнага значэння. На права збору або закупак гістарычных і культурных каштоўнасцей павінен быць дазвол адпаведных органаў, акрамя таго, павінен быць зарэгістраваны ў мясцовых савецкіх органах прыезд экспедыцыі або прадстаўніка ўстановы, упаўнаважанай займацца зборам на тэрыторыі сельсавета, раёна. Акты ж з пералікам закупленых або перададзеных у дар прадметаў складаюцца і завяраюцца ў сельскім Савеце. Калі гэтага не рабіць, то не выключана магчымасць, што частка прадметаў, і можа быць найбольш каштоўных, трапіць не ў дзяржаўную ўстанову, а да якога-небудзь дзялка.

Шмат прадметаў музейнага значэння захоўваецца ў культавых будынках, але не ўсе яны ўзяты пад дзяржаўную ахову, не заўсёды ў райвыканкомах ёсць вопісы царкоўнай маёмасці і г. д.

А МУЗЕЮ Ж ЦЯЖКА...

Згодна з загадам міністра культуры БССР № 308 ад 27.11.78 «Аб мерах па забеспячэнні захаванасці рухомых помнікаў мастацтва, якія знаходзяцца ў культавых будынках», улік або канфіскацыя культурных каштоўнасцей дазваляецца толькі пры наяўнасці спецыяльнага дазволу Міністэрства культуры БССР і ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў БССР. Там жа дадзена ўказанне на працягу 1979—1980 гг. правесці абследаванне ўсіх рухомых помнікаў мастацтва ў культавых будынках, зрабіць іх маркіроўку, а таксама скласці вопісы рухомых помнікаў мастацтва, незалежна ад іх месцазнаходжання і ведамаснай прыналежнасці, каб потым узяць іх пад дзяржаўную ахову.

Усё гэта мае адну мэту — захаваць унікальныя гістарычныя і культурныя каштоўнасці, зрабіць іх здабыткам народа на многія стагоддзі. Натуральна, каштоўнасці з культавых будынкаў могуць перадавацца толькі ў музеі. Тут нават не можа быць гаворкі аб прыватных збіральніках, таму што гэта парушэнне Закону, і яно павінна карацца.

Музеі займаюцца зборам прадметаў ужо не толькі рэдкіх, але і тых, якія хутка такімі стануць, а таксама зборам вырабаў народнай творчасці, характэрнай для сённяшняга дня. Але, натуральна, не ўсе патрэбныя і цікавыя прадметы ўдаецца сабраць, і тады музеі купляюць іх у калекцыянераў. (Думаю, што музей, які закупіў калекцыю ў Магільнага, імкнуўся набыць толькі рэдкія прадметы, але ж бывае, што трэба браць і з «давескам» —з самымі звычайнымі рэчамі, бо інакш не прададуць — у такіх выпадках дыктуюць умовы магільныя!).

Сапраўдныя калекцыянеры звычайна збіраюць свае калекцыі на працягу ўсяго свайго жыцця. Гэта становіцца сапраўды іх дзецішчам. Ці могуць яны расстацца з ёю? Вельмі рэдка. Часцей за ўсё прадаюць усе гэтыя каштоўнасці пасля смерці ўладальніка яго сваякі. У артыкуле ж «Спыніце Магільнага!» гаворыцца проста аб прадпрымальніку. Сама наяўнасць каштоўнасцей яшчэ нічога не гаворыць пра культуру чалавека. Не мяркуем жа аб культуры чалавека толькі па тым факце, што ў яго багатая асабістая бібліятэка!

Далучэнне да мастацтва робіць чалавека чысцейшым, больш культурным. Але паняцце «культурны чалавек» ніяк не стасуецца з нажывай, накапіцельствам, спекуляцыяй. Магільныя збіраюць тое ці іншае не для душы, а для грошай. Гэта проста аказалася выгадным заняткам і, як відаць, не пакаральным. Колькі ён плаціў за той або іншы прадмет? А можа, атрымаў яго ў дар?

Збор помнікаў і захаванне іх для будучых пакаленняў — высакародная задача, але гэта трэба рабіць чыстымі рукамі.

Нярэдка зборам каштоўнасцей займаюцца музеі на грамадскіх пачатках (дарэчы, не заўсёды гэта музеі, проста музейныя куткі), часам прадстаўнікі якіх-небудзь устаноў, навучальных устаноў калгасаў, якія, як яны гавораць, думаюць ствараць музей. Часта зборам тут уся справа і заканчваецца, бо трэба ж ведаць, як збіраць, што, якія дадзеныя неабходна запісаць, як захоўваць і г. д. Таму, перш чым пачаць збор, неабходна ўзгадніць усё гэта з дзяржаўным музеем, атрымаць патрэбную кансультацыю.

Недаравальна, калі унікальныя прадметы трапляюць у піўныя бары, рэстараны і г. д. Доўгага жыцця ім там не будзе. Што датычыць збораў каштоўнасцей дамамі народнай творчасці, то гэта таксама не лепшы варыянт, таму што ў іх няма адпаведных фондаў, за якія яны б неслі адказнасць. Вырабы народнай творчасці тут становяцца простым інвентаром і апрыходваюцца таксама, як сталы, крэслы, графіны для вады і г. д. Карацей кажучы— калі гэта сапраўды каштоўнасці, то ім месца толькі ў музеях, дзе яны павінны не толькі экспанавацца, але і вывучацца музейнымі работнікамі, спецыялістамі іншых устаноў.

У артыкуле Я. Сахуты «Каго спыніць, а каго падштурхнуць?» гаворыцца, што музеі вельмі павольна разгортваюць работу па збору матэрыялаў, многае ж, што захоўваецца, не бачыць наведвальнік, таму што яно знаходзіцца ў запасніках. Так, сапраўды, у фондах знаходзіцца больш прадметаў, чым у экспазіцыі. Таму і трэба адводзіць пад фондавыя памяшканні дзве трэці ўсёй плошчы. А якому музею Беларусі падобнае шчасце выпадала?! 1 мае рацыю аўтар артыкула «Што далей?» С. Сакалоў, калі гаворыць аб вартым жалю Полацкім музеі. Але ж у такіх умовах — большасць музеяў. Так, часам унікальныя калекцыі самі ідуць у рукі музеяў, але, як правіла, узнікае тое ж пытанне: куды гэта дзяваць? Трэба ж не проста прыняць, а захаваць гэтыя каштоўнасці на вякі. А для гэтага патрэбен пэўны рэжым.

Брэсцкі абласны музей упершыню быў адкрыты для наведвальнікаў у 1957 годзе. Тыя экспанаты, якія меліся (іх было крыху больш за 2 тысячы), увайшлі ў экспазіцыю. Мінула амаль 22 гады. У сучасны момант у фондах музея звыш 50 тысяч прадметаў, а фондавая плошча катастрафічна малая— 76 квадратных метраў. Музеем сабраны цікавыя этнаграфічныя матэрыялы, але яны знаходзяцца ў фондах, і толькі зрэдку музей можа паказаць іх на выстаўках (рабіць такія выстаўкі — справа вельмі складаная, таму што ў штатах няма рабочых — усё робяць самі супрацоўнікі, акрамя гэтага, неабходна памяшканне, дзе б была гарантавана захаванасць экспанатаў).

У Брэсце ёсць падыходзячы будынак для такога роду экспазіцыі — архітэктурны помнік XIX стагоддзя (вул. Міцкевіча, 22), але там да гэтага часу знаходзіцца медвыцвярэзнік.

Адно з важных пытанняў у рабоце музеяў — кадры. На жаль, яшчэ нярэдкія выпадкі, калі ў музеях працуюць людзі, якія не маюць ні адпаведнай адукацыі, ні зацікаўленасці. Час хоць бы ў абласных музеях увесці пасаду мастацтвазнаўца, які мог бы кансультаваць раённыя музеі, дзе штат зусім невялікі, і якім вельмі патрэбна кваліфікаваная дапамога, у прыватнасці, у збіральніцкай рабоце прадметаў народнай творчасці.

І яшчэ. Тыя, хто згаджаецца перадаць у музей сваю калекцыю, хочуць натуральна, каб яна экспанавалася, а не знаходзілася ў запасніках. Як жа быць музею? Экспанаваць часцей за ўсё няма дзе, таму што экспазіцыйныя плошчы невялікія. Акрамя таго, экспазіцыі пабудаваны тэматычна, а таму для калекцыі патрэбна нейкая асобная зала. Можна было б змясціць такія калекцыі ў фондах пры ўмове, што недзе разы 3-4 на тыдзень у пэўныя гадзіны адкрываць іх для экскурсій. Думаю, што супраць гэтага дарыцелі б не пратэставалі. Напрыклад, у Брэсце жыве дзіўны чалавек, настаўнік гісторыі, цяпер пенсіянер, які збірае ўсё сваё жыццё гадзіннікі. Якіх толькі няма гадзіннікаў у Паўла Іванавіча Ермачкова. Яму і цяжка з імі (кватэра маленькая), але колькі радасці яны прыносяць яму! І ўсё ж такі ён не супраць перадаць музею сваю унікальную калекцыю, але пры ўмове, што яна будзе экспанавацца, што гадзіннікі таксама ж, як і ў яго, будуць жыць. Тут кола замыкаецца — дзе ўсё гэта выставіць і захоўваць?

Відаць, наспеў час выдзяляць музеям спецыяльныя выставачныя залы, якія знаходзіліся б у іх распараджэнні. Трэба таксама падумаць і аб пашырэнні плошчаў музеяў, асабліва для патрэб фондаў.

Апошняе, пра што хацелася б сказаць, — пра стварэнне таварыства калекцыянераў самага шырокага профілю. А для таго, каб калекцыі сталі вядомы грамадскасці, у тым ліку і прыватныя, неабходна выдаваць невялікія каталогі, пісаць пра каштоўнасці, якія захоўваюцца ў музеях і ў людзей. Шырокая папулярызацыя помнікаў не дасць магчымасці спекуляваць імі.

Т. СЛЕСАРУК,
дырэктар Брэсцкага краязнаўчага музея, заслужаны работнік культуры БССР.

ЗА БРАМАЙ СКАРБАЎ

Сам я калекцыі не збіраю, але ёсць у мяне некалькі памятных рэчаў, з якімі мог бы і разлучыцца, калі б надзейна і ўпэўнена ведаў, што яны не загубяцца ў музейных фондах, дзе на іх не будзе глядзець нават адна пара вачэй. Гэта, думаецца, адна з праблем, калі аматары збіральніцтва ці выпадковыя ўласнікі проста баяцца, што ацалелая рэч знепрыкмеціцца, стлее цяпер ужо не на гарышчы пакінутага хутара, а ў каморках музеяў.

Трэба сцвердзіць аўтарытэт і высокае прызванне музейнага сховішча, зрабіць фонды актыўнымі, рабіць «лятучыя» выстаўкі, ствараць музеі-кавярні...

Увогуле ж, калі пачынаецца сапраўднае асэнсаванне каштоўнасцей народнай матэрыяльнай культуры, увядзенне яе ў званне нашага нацыянальнага здабытку, магільныя сваім паяўленнем сігналізуюць: ці ўсеабдымную, ці глыбокую, ці надзейную ацэнку праводзім скарбам, якімі ўладаем.

Зараз ужо не толькі ў нашай рэспубліцы ведаюць, што ў даверлівых, лагодных людзей Браслаўшчыны, Гродзеншчыны, Палесся можна, што называецца, пажывіцца. Відаць, памянёны М. Замскім дырэктар Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея не прызнаўся, як у свой час нехта з супрацаўнікоў гэтага музея ахвотна перадаў невядомаму чалавеку вялікі збор фотадакументаў пра першую сусветную вайну, знятых на лініі фронту ў Беларусі, толькі таму, што той чалавек назваўся «вучоным з Масквы».

А зараз хочацца звярнуцца і да такой праблемы; хто ж спрыяе магільным у іх нагуле на самапасе? Не будзем чапаць бабульчынага ручніка ці сцёртай вярэнькі, якія бачыў М. Замскі ў той ці іншай майстэрні мастака, а зноў звернемся да згаданага аўтарам Клецка, дзе жыве і працуе ўжо знаёмы нам Д. М. Чорны. Я хачу сказаць менавіта пра тыя рэчы, якія ён са сваімі вучнямі ў свой час не знайшоў і ўжо ніколі не знойдзе. Ёсць у Клецкім раёне вёска Садовая, і ёсць там Садоўская школа. І даўно ўжо няма там драўлянай царквы, пабудаванай у 1626 годзе. У 1879 годзе там быў узведзены залачоны іканастас. На цвінтары царквы ў Блячыне (так раней называлася Садовая) пахаваны бацька «вальнадумца з-пад Нясвіжа» Аляксандра Незабытоўскага. (Пра А. Незабытоўскага, беларуска-польскага пісьменніка і грамадскага дзеяча, напісаў кнігу Сцяпан Александровіч). Прастаяла тая хароміна 362 гады. Дык вось, калі бурылі яе,— начынне, архіўныя дакументы, кнігасховішча разбіралі хто як мог. Адна цётка расказвала, што выхапіла з іканстаса ікону Міколы Цудатворцы. Незвычайна шыкоўна выглядала пазней яна ў сціплай сялянскай хаце: выдатная аправа, чаканка, эмаль... Каштоўнасць яе, канечне, вялікая. Рассеяліся па наваколлі і кнігі. Не так даўно трапіў мне ў рукі пяты том поўнага збору твораў Ф. М. Дастаеўскага (С.-Пецярбург, 1866 г.) «З Блячынскай царквы!» — пахваліўся ўладальнік. Блячынскі кнігазбор быў, канечне, вялікі, бо царква «курыравала» ў свой час царкоўна-прыходскую школу ў Блячыне, чатыры школы пісьменнасці ў суседніх вёсках і земскае народнае вучылішча.

Калі ў Садоўскай школе задумалі заснаваць краязнаўчы музей, па закліку настаўніцы Вольгі Андрэеўны Крыцкай дзеці пачалі прыносіць экспанаты. Але памяшкання для музея не было, і большасць рэчаў месцілася на гарышчы, пакуль школу не наведала пажарная інспекцыя. Тады, як сказала Вольга Андрэеўна Крыцкая, паступіў загад: ачысціць гарышча. Такім чынам, усё было знішчана.

— Пра аднаўленне музея не было чаго і гаварыць,— паведаміла ў гутарцы са мной В. Крыцкая.

Прагледзелі мы тады з В. Крыцкай ацалелыя экспанаты. Падумалася, што тут ужо гаварыць пра медную ступу, украдзеную з бара, ці перапрададзеную адным гандлярчыкам другому патэльню. Я вось пачытаў у Садовай «Метрыкаўскую кнігу». Захавалася толькі 92 лісты за 1874 год гэтага своеасаблівага мясцовага летапісу. Там пазначалася, калі нарадзіўся чалавек, якое атрымаў імя, колькі пражыў і з чаго памёр. Прагледзеў бы такія кнігі навуковы работнік ад медыцыны. Гатовы матэрыял для сацыялагічнага даследавання! Праз такія кнігі можна было б прасачыць рух пакаленняў, выявіць нейкія заканамернасці для дадзенага рэгіёна, зрабіць навуковыя высновы.

І па сёння ляжыць у мяне дома падарунак В. А. Крыцкай — экспанат неадчыненага музея — самаробная салдацкая алюміневая лыжка з выбітым надпісам: «Въ память отечественной войны 1914—15—16 г. Т. П. Камарницкий». Пазначана, што надпіс зроблены 12 лістапада 1916 года. Ляжыць маленечкая сведка гісторыі, перажытай і выпакутаванай народам... Ляжыць «рухомы» помнічак цеплыні чалавечых рук. Дык ёсць яна, гэтая рэч, ці яе яшчэ нема? Як упісаць яе ў метрыку законна ўзноўленага ў сваёй Адзінай Непаўторнасці?

Сяргей ПАНІЗНІК.

ТУДЭМА — СЮДЭМА...

ПАДАРУНАК - СЮРПРЫЗ

Трапілася неяк Мікіту Пятровічу кніга аб тым, як сябе паводзіць. Асабліва зацікавіў яго раздзел пра тое, што і калі трэба дарыць. Даведаўся ён, што падарункі могуць быць самыя розныя: да дня нараджэння, з нагоды якога-небудзь свята ці проста так, падарунак-сюрпрыз. Можна падарыць свайму таварышу якую-небудзь рэч, якая таму вельмі патрэбна або падабаецца.

— Паслухай, Зіна, — звярнуўся Мікіта Пятровіч да жонкі, — а што, калі я зраблю Сцяпану Антонавічу падарунак-сюрпрыз? Куплю яму электрабрытву. А то шкада глядзець на яго парэзаны твар.

Жонка заўпарцілася:

— Глупства вярзеш! Падарунак захацеў зрабіць! Табе многа дарылі?!

Але Мікіта Пятровіч зрабіў па-свойму. Купіў электрабрытву і назаўтра панёс яе на работу.

Сцяпан Антонавіч таксама працаваў у іх аддзеле. Калі Мікіта Пятровіч паднёс яму падарунак, ён падняў вочы ад часопіса з рэбусам і збянтэжыўся. Ніяк не мог ацаніць, для чаго гэта Мікіта Пятровіч робіць яму падарунак: дзень нараджэння ўжо даўно прайшоў, свята таксама няма ніякага. Але рабіць няма чаго, трэба браць, а то ўсе звярнулі ўвагу. Яшчэ падумаюць, што ён грэбуе...

Да канца рабочага дня ён ужо не мог не толькі працаваць, але і рэбусы разгадваць. Увесь час не давалі спакою думкі-пытанні: як зразумець Мікіту Пятровіча? Што яму трэба? Можа, рашыў купіць новы гарнітур, дык хоча, каб жонка мая дапамагла? На базе ж працуе, ёй гэта няцяжка...

Пасля доўгіх спрэчак ён угаварыў жонку «прабіць» для Мікіты Пятровіча арэхавы гарнітур. Праз два дні асабіста даставіў яго таварышу. Той разгубіўся, а жонка яго ад радасці заплясала ў далоні. Гэта ж падумаць — такі дэфіцыт, а тут самі прывезлі на кватэру!..

— Эўрыка! — усклікнула жонка Мікіты Пятровіча. — Бяжы хутчэй у магазін за новай электрабрытвай! Зробім падарунак-сюрпрыз Мікалаю Кузьмічу. Ён «дастане» для мяне норкавае футра.

Мікіта Пятровіч хмыкнуў і паджгаў у магазін.

М. СЛІВА.

ПРЫСВЯЧЭННІ

Міколу АЎРАМЧЫКУ

К яму ідуць, але не ў госці —
Надрукавацца ў «Маладосці».

Эдуарду ВАЛАСЕВІЧУ

Гавораць, нават слуп зарагатаў,
Як Валасевіч байку прачытаў.

Нілу ГІЛЕВІЧУ

Умелец вершы ён пісаць,
Таксама іх перакладаць,
Фальклор старанна сабірае,
Студэнтам лекцыі чытае,
На сходах розных часты госць
І многа-многа дзе ён ёсць.

Даўно ў яго спытаць карціць:
Калі ж, калі ён, бедны, спіць?

ПАЧАТКОЎЦУ

Фядос рашыў паэтам стаць,
Каб менш рукамі працаваць,
Але ў калгас праз дзень прыпёр:
— Я ледзь ад думак не памёр!

Іван МАЛЕЦ.

Мікола ВЯРШЫНІН

ПАРАДА

Нешта ўжо ў апошні час,
Кажуць у народзе,
Аж залішне сярод нас
Кніжкі сталі ў модзе.

Ставяць іх уздоўж сцяны
І бяруць без меры.
Упрыгожваюць яны
Інтэр'ер кватэры.

Часу мала іх любіць
І чытаць іх — мала.
Мусіць, кожны хоча быць
Інтэлектуалам...

Зойдзе сябар ці сусед —
Шчасце гучна зычыць,
Сам жа цэліць неўпрыкмет
Кніжку «запазычыць».

А сароміцца чаго ж?
Простая карціна.
Гэта ж, лічыць, не крадзёж:
Браў не з магазіна.

Вам для кніжак для сваіх —
Гэта проста згуба.
Як пазбавіцца ад іх,
Гэткіх «кнігалюбаў»?

А рабіце ўсё прасцей,
Асцярожней крышку:
Сустракаючы гасцей,
Сцеражыце кніжкі.

З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

На ўроку гісторыі малая Мары, 8 год, падымае руку.
— Што ты хочаш, Мары? — пытаецца настаўніца.
— Мадэмуазель, я не разумею, навошта ў маёй кнізе па гісторыі побач з імем Калумба напісана 1451—1506?

Люсі паднімае руку.
— Ты ведаеш, Люсі? — пытаецца настаўніца.
— Так, мадам.
— Ну, гавары.
— Гэта нумар яго тэлефона.

●

Тадзю ў першы раз пайшоў у школу. Калі ён вярнуўся дадому, маці запытала яго:
— Я спадзяюся, што ты паводзіў сябе добра, не сваволіў, не шумеў?
— Яшчэ б! — адказаў Тадзю. — Што я мог зрабіць, калі ўвесь час стаяў у куце.

Сабраў і пераклаў В. БАБЕЙ.

МІЖ ІНШЫМ...

Словы, як і грошы: іх не хапае тады, калі яны так патрэбны.

●

Эпігон пісаў аб прыродзе. Ды аднойчы бунінская галінка з антонаўкі сцебанула яму проста па вачах.

●

Адна галава добра, дзве лепей. А яшчэ лепш: адна — ды разумная.

●

Не ўсе геніі нават з тых, каго сёння называюць імі.

●

Нават лепшым сябрам не хваліся сваімі недахопамі: яны самі заўважаць іх.

Пра некаторых людзей кажуць: «У такіх розуму не займаць». Сапраўды, у разумнага хапае мужнасці падзяліцца гэтым багаццем з іншымі.

●

Чужая манета яму ніколі не здавалася звонкай.

●

Малы, слухаючы казку:
— Цікава, ці былі ў змея-гарыныча дзеці?

М. МІНЧАНКА.

Анатоль ЗЭКАЎ

ЛІТАРАТУРНАЕ СПАТКАННЕ

Не было і размоў: ні апошняй, ні першай.
А ўсяго толькі гэта: «Ці не пішуцца вершы?»

. . . . . .

І калі за вуглом ты, мільгнуўшы,
схавалася,
Я падумаў: «Без гэтага... ці ж бы пісалася?»

Алесь БАЧЫЛА.

Я не помню нічога, хіба што, нарэшце,
Адно, помню, пытала: «Ці ж пішуцца вершы?»

Не было ў нас ніякіх гарачых прызнанняў,
Гаварылі аб рыфмах на кожным спатканні.

Гаварылі аб вершах, затым — аб паэмах
Закранулі ўсе тэмы, шмат якія праблемы.

Аб усім гаварылі да раніцы самай:
Аб рэцэнзіях, байках, камедыях, драмах.

Гаварылі аб тых, што далёка пайшлі.
Неўпрыкмет і на прозу, глядзіш, перайшлі.

Ледзь адно не кранулі на нашым спатканні —
Найвялікшую самую тэму кахання.

І адчуў я, калі за вуглом ты схавалася:
Хай бы менш гаварылася, болей пісалася!

ДЗІВАК — ЧАЛАВЕК...

Мал. Н. ДОРАШ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 АТ 10291
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-22-04, аддзела мастацкага афармлення і маўнапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Юлія ЧУРКО.